

ГІСТОРЫІ ВАЛАНЦЁРАЎ ЕЎРАПЕЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ 3

ЯК ЗМАГАЦЦА З «НАХАБНАЙ» ПАРКОЎКАЙ МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ЧЭРВЕНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 120 (28987)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід ПАЛЯШЧУК, намеснік дырэктара Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:**

*— У апошнія некалькі гадоў мы значна павялічылі вытворчасць сонечнай энергіі. У асноўным гэты кірунак развіваецца ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Самая буйная фотаэлектрычная станцыя (ФЭС) магутнасцю 56 МВт размешчана ў Рэчыцы і выпрацоўвае амаль трэць сонечнай энергіі. У Чэрыкаўскім раёне вядзецца будаўніцтва ФЭС магутнасцю 100 МВт, яна стане адной з найбуйнейшых не толькі ў краіне, але і ў СНД. Па нашых разліках, адна электрастанцыя магутнасцю 60 МВт з назапашвальнікам электрычнай энергіі дазваляе эканоміць каля 21,3 тысячы тон умоўнага паліва ў год (або $7,85 млн у эквіваленце), а за 25 гадоў эксплуатацыі замяшчэнне імпартаванага прыроднага газу ў грашовым выражэнні складзе прыблізна $196 млн.*

# ЛЕТНЯЕ СУЛАДДЗЕ



Фота БелТА.

На рацэ Чорная Ганча непадалёк ад Гродна.

## КОРАТКА

• **Тэмпературны рэкорд дня быў пабіты ў Беларусі 26 чэрвеня за ўвесь перыяд метэаназіранняў. Самая высокая тэмпература была зарэгістравана на метэастанцыі Высокае (Камянецкі раён Брэсцкай вобласці) — 34,4 градуса.**

• Сістэму, якая дазваляе медыцынскаму работніку праводзіць аддалены маніторынг стану кіроўцаў праз праграмна-апаратны комплекс, распрацавалі ў Брэсцкім навукова-тэхналагічным парку.

• **Еўрасаюз прадоўжыў на паўгода эканамічныя санкцыі супраць Расіі.**

• Рэкорд «Славянскага базару» па пацалунках планующь устанавіць гэтым летам. Месцам для незвычайнай акцыі форуму выбраны Пушкінскі мост, дата — з 11 да 15 ліпеня.

ISSN 1990 - 763X

Без чаргі

## «Мы жывём у свеце кнопак, дзе рух мінімальны. І гэта вялікая праблема»

**Наведвальнікі медыцынскага гарадка ў Гродне атрымалі кансультацыі ад спецыялістаў самага шырокага профілю**



Фота Мікалая ЛАПІНА.

**Тут можна было трапіць на прыём да тэрапеўта, афтальмолага, нейрахірурга, уролага, акушэра-гінеколага, траўматолага, атрымаць навыкі аказання першай дапамогі, зрабіць аналіз крыві, кардыяграму і нават флюараграфію.**

**Таксама можна было ўдакладніць свой рост, вагу і артэрыяльны ціск.**

Выязны прыём у цэнтры горада арганізаваны Гродзенскай бальніцай хуткай дапамогі. Прычым без папярэдняга запісу і бясплатна. Гродзенка Яўгенія Валер'еўна прыйшла ў медыцынскі гарадок, каб «не займаць чаргу ў паліклініцы». Яна здала экспрэс-аналіз на глюкозу і гемаглабін, а таксама прайшла флюараграфію. Лічыць, што варта было б узнавіць перасовачныя пульмасканы, якія раней стаялі каля паліклінік, а таксама звярнуць увагу на даступнасць медыцынскай дапамогі ў горадзе.

СТАР. 2

Ёсць праблема

## КАЛІ СМЯГНЕ ЗЯМЛЯ...

### Як зменшыць залежнасць ад змен клімату

**Паўтаральнасць засух на нашай тэрыторыі вырасла. Калі раней такая праблема турбавала раз у тры-чатыры гады, то цяпер мы «смажымся» ці не кожны год.**

— Пацяпленне клімату ў Беларусі — гэта прызнаны факт. Гадавая тэмпература павялічылася на 1,3 градуса, — заўважае **галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі, акадэмік Уладзімір ЛОГІНАЎ.** — Але галоўнае, у сезонным ходзе адбыліся значныя варыяцыі. Яшчэ 15—20 гадоў таму я запэўніваў, што гэта пацяпленне зімовага тыпу. Сапраўды, у 90-я гады зімы былі вельмі цёплыя, неват у 1989—1990 гадах з сярэдняй тэмпературай каля 0 градусаў. Пасля зімы сталі больш халодныя, але адбылося іншае. Інтэнсіўны рост тэмператур стаў назірацца ў цёплую пару года. Так было ў 30-я гады — тады пацяпленне было ў ліпені, жніўні — кастрычніку. На жаль, на гэта не звяртаюць увагу нават на сусветным узроўні, таму што гэта не падпадае пад тэорыю парніковага пацяплення (паводле якой павышэнне тэмпературы павінна назірацца ў першую чаргу зімой). Значыць, трэба шукаць іншыя падыходы, іншыя фактары, адказныя за пацяпленне. Так, парніковыя газы прыводзяць да росту тэмператур, але ці не перабольшваем мы іх ролю?

І не ўсё залежыць толькі ад чалавека. У гісторыі планеты былі часы і значна цяплейшыя, чым цяпер, і халаднейшыя. Такія цыклічныя змены адбываліся, калі людзей яшчэ не было, альбо антрапагеннае ўздзеянне яшчэ не адчувалася. Нават не ў такія ўжо далёкія часы надвор'е падкідвала то прыемныя «бонусы», то праблемы. Так, у Сярэднія вякі было цяплей, чым сёння. Быў і малы ледніковы перыяд (прыкладна 1645—1815 гадоў)... Чалавецтву пакуль не хапае ведаў пра тыя працэсы, што адбываюцца з кліматам, і, як заўважае акадэмік Логінаў, мы, аб'явіўшы барацьбу, часам не ведаем, з чым змагацца.

СТАР. 4

# АДДАНЫМ СПРАВЕ

**Учора Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды. Урачыстая цырымонія прайшла ў Палацы Незалежнасці.**

«Сёння мы з вамі сустракаемся напярэдадні нашага галоўнага дзяржаўнага свята — Дня Незалежнасці. Я з задавальненнем вітаю вас — таленавітых, працавітых, адданых сваёй справе прафесіяналаў, — звярнуўся да прысутных беларускі лідар. — Людзей, чые поспехі і дасягненні ствараюць нашу гісторыю, аб'ядноўваюць народ у пачуцці гонару за сваіх суайчыннікаў, фарміруюць імідж краіны — моцнай, паспяховай, стваральнай і абавязкова прыгожай».

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў гэтыя дні мы адзначаем знакавую падзею — 75-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Паводле слоў беларускага лідара, успамінаючы вялікі подзвіг народа-пераможца, які падарыў нам будучыню, мы асабліва ўсведамляем адказнасць за тое, якой яна будзе ў нашых дзяцей і ўнукаў. «Кожны наш дзень павінен быць пражыты дзеля важнай мэты — абараніць свет, за які аддавалі жыцці ў гады Вялікай Айчыннай, і захаваць працоўныя традыцыі пасляваеннага пакалення, — сказаў Прэзідэнт. — Гэтыя традыцыі працягваюцца ў нашых поспехах і дасягненнях».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што на ўрачыстай цырымоніі прысутнічаюць прадстаўнікі самых розных прафесій, але ўсіх аб'ядноўвае шчырае імкненне працаваць у імя роднай Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў супрацоўнікам праваахоўных органаў, сілавых ведамстваў, воінам-інтэрнацыяналістам за вернасць абавязку і адданасць Айчыне, за праяўленыя ў службе смеласць і мужнасць. Ён падкрэсліў: іх патрыятызм — найлепшы прыклад для падрастаючага пакалення. «Мы таксама ўшаноўваем работнікаў аграрнай галіны за дасягненні ў мінулым годзе. Няхай і цяперашні, няпросты з пункту гледжання ўмоў надвор'я год будзе вынікові і ўмацуе нашу харчовую бяспеку. Дзякуй за вашу напружаную і важную для краіны працу», — сказаў беларускі лідар.

Сярод узнагароджаных — супрацоўнікі кампаній «Белавія», «Беларуськалій», «Мапід», «Марка» — прадпрыемстваў, якія з'яўляюцца сапраўднымі брэндамі Беларусі, вядомымі далёка за яе межамі. Прэзідэнт адзначыў, што яму прыемна бачыць у зале работнікаў аховы здароўя, навукі і адукацыі — найлепшых спецыялістаў у сваёй галіне.

Высокія ўзнагарод удастоены дзеячы культуры і мастацтва. Звяртаючыся да іх, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сваёй творчасцю яны робяць наша жыццё больш яркім і духоўна багатым, што яны нядаўна прадэманстравалі пры адкрыцці II Еўрапейскіх гульняў.

У зале прысутнічалі спартсмены і трэнеры — на думку кіраўніка дзяржавы, самыя папулярныя сёння ў краіне людзі. Паводле яго слоў, II Еўрапейскія гульні дораць нам нямала яскравых перамог, і ў краіне ганарацца поспехамі нашых суайчыннікаў і чакаюць новых медалёў кожны дзень.

«Дасягненні кожнага з вас, працавітасць і дысцыпліна — галоўныя ўмовы эканамічнага дабрабыту краіны, яе незалежнасці. Дзякуй вам за адданасць справе, адказнасць і высокія вынікі ў прафесійнай дзейнасці», — заявіў беларускі лідар.

## Умовы ёсць — трэба працаваць

Размаўляючы з журналістамі, узнагароджаны ордэнам Пашаны генеральны дырэктар холдынга «Беларуская гарбарна-абутковая кампанія «Марка» Мікалай Мартынаў адзначыў, што сёння яго кампанія — гэта вялікі холдынг, і не толькі па беларускіх мерках. Цяпер тут працуе амаль пяць тысяч чалавек. Гэты год для «Марка» ён назваў цяжкім і цікавым, таму што запланаваны выхад на ўсе вытворчыя магутнасці.

«Вельмі прыемна, што да Дня Незалежнасці ёсць усведамленне — мы датычныя да стварэння нашай краіны, менавіта незалежнай, самастойнай. Напэўна, гэта сімвалічна, бо Беларусь не багатая на прыродныя рэсурсы, а багатая людзьмі, якія могуць рабіць справу», — адзначыў Мікалай Мартынаў.

Наколькі цяжка прарывацца «Марка» на замежныя рынкі? Генеральны дырэктар холдынга адзначыў, што рынак мяняецца, яго трэба старанна адсочваць, бо тэндэнцыі ў модзе вельмі рухомыя. На шчасце, сёння гэта рабіць значна прасцей, бо ёсць інтэрнэт.

У чым сакрэт поспеху прадпрыемства? Мікалай Мартынаў звярнуў увагу, што ў нашай краіне па заканадаўчым узроўні створаны ўсе ўмовы для вядзення і развіцця бізнесу. Акрамя таго, ён адзначыў, што вялікае значэнне маюць кваліфікаваныя рабочыя кадры, якія ўмеюць вучыцца і могуць хутка перабудоўвацца пад новыя трэнды. «А далей — працаваць трэба, думаць трэба», — з усмешкай дадаў ён.

Узнагароджаная ганаровым званнем «Народны артыст Беларусі» Ірына Яромкіна — артыстка балета (салістка) Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета — расказала журналістам, што атрыманае званне — гэта вельмі высокая ўзнагарода. «Калісьці, калі я толькі пачынала танцаваць, я пра гэта нават не марыла», — сказала яна.

Пра атрыманне высокай узнагароды Ірына Яромкіна даведалася на гастролях у Мексіцы: ёй патэлефанаваў дырэктар тэатра і паведаміў, што ўказ падпісаны. Праз розніцу ў часе — у Беларусі быў дзень, там была ноч — балерына спрасонку не паверыла ў гэта, а потым і зусім заснула.

«А раніцай, калі я расплюшчыла вочы, мне здалося, што гэта прыснілася», — сказала балерына.

Яна адзначыла, што сёння беларускі балет гастралюе па свеце — у тым ліку па краінах, дзе такое мастацтва не вельмі вядома. «Мы стараемся пазнаёміць гэтых гледачоў менавіта з балетам, і ў нас з'явіліся гэтыя магчымасці. Раскрываюцца межы — больш шырокія тэрыторыі мы цяпер займаем», — сказала Ірына Яромкіна і прывяла ў прыклад тую ж Мексіку, Кітай, Карэю.

Яна звярнула ўвагу, што балет пастаянна развіваецца — гэта датычыцца і нашай краіны. «Наш беларускі балет ні ў чым не саступае», — сказала балерына.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# «Мы жывём у свеце кнопак, дзе рух мінімальны. І гэта вялікая праблема»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, імправізаваны медыцынскі гарадок не пуставаў ні хвіліны. Найбольшым попытам карысталася лабараторыя. Як адзначыла яе загадчыца Сняжана Юркевіч, за гадзіну «праходзіла» каля 60 чалавек. Па яе словах, служба лабараторнай дыягностыкі бальніцы працуе круглыя суткі і канкурыруе па цэнах і аўтаматызацыі з камерцыйнымі лабараторыямі.

Многія наведвальнікі цікавіліся аказаннем першай дапамогі пры сонечным удары. **Урач-рэаніматолаг Сяргей ВІНАГРАДАЎ** паведаміў, што тут няма нічога складанага, але ёсць важныя нюансы. Напрыклад, ні ў якім разе нельга абліваць чалавека халоднай вадой ці класці ў халодную ванну. У такім выпадку можа здарыцца рэфлекторнае парушэнне рытму сэрца і нават яго спыненне. Ахаладжваць трэба паступова — халаднаватае піццё, мокрае абгортванне. Калі гэта адбылося на вуліцы — спачатку адцягнуць чалавека ў цень, потым правесці працэдуру ахаладжвання, каб аднавіць тэрмарэгуляцыю арганізма. Пры неабходнасці звярнуцца да доктара. Пры гэтым трэба памятаць, што цеплавы ўдар можа зноў паўтарыцца, і ўжо з горшымі наступствамі. Таму не варта рызыкаваць.

І хоць дыягназы на выязным прыёме не ставілі, усе пацыенты маглі атрымаць кампетэнтныя рэкамендацыі, у тым ліку і нейрахірурга. Гэта аддзяленне — адзінае ў вобласці, дзе знаходзіцца толькі ў бальніцы хуткай дапамогі. Вопытны **урач Андрэй ШВЕД** расказаў, што ў год тут праводзяць больш за тысячу аперацый, усе яны бясплатныя, у тым ліку з выкарыстаннем імплантаў беларускай вытворчасці, якія, па словах нейрахірурга, не горшыя за замежныя. Па ўзроўні аперацый, іх складанасці і колькасці гродзенская нейрахірургія знаходзіцца на другім месцы пасля сталічнай. Апошнім часам вельмі шмат аперацый праводзіцца па міжпазваночных грыжах, кажа суразмоўнік. А ўсё ад таго, што вядзём пасіўны лад жыцця — мала рухаемся, няправільна нахіляемся, шмат сядзім, а хаду замяняем яздой.

Гродзенка Тамара прыйшла на выязны прыём з праблемай тазабедранага сустава, ёсць болевыя сімптомы ў вобласці паясніцы. Асабліва гэта адчувальна пры нагрузках. Траўматолаг Віктар Аносаў парэкамендаваў ёй прайсці аналіз на шчыльнасць касцей. А для прафілактыкі займацца фізкультурай, каб скінуць вагу і не давесці арганізм да такой хваробы, як астэапароз, пры якім зніжаецца шчыльнасць касцей, яны робяцца крохкія і ламаюцца ад нязначнай нагрузкі. Асабліва гэта датычыцца тых, хто, як і Тамара, знаходзіцца ў групе рызыкі па ўзросце.

— Гэты аспект статыстычна найбольш актуальны для жанчын ва ўзросце 55—60 гадоў, — падкрэсліў Віктар Аносаў. — Таму важна данесці, у тым ліку праз такія выязныя прыёмы, важнасць абследавання касцей, здаровага ладу жыцця.

Дарэчы, шчыльнасць касцявой тканкі вызначаецца па спецыяльным аналізе крыві. Але не толькі. Ёсць методыкі ўльтрагукавой дыягностыкі, МРТ, рэнтген. У хуткім часе бальніца набудзе найноўшую апаратуру — дэнсітометры, якія ёсць толькі ў сталіцы.

— Такую магчымасць мы атрымалі дзякуючы трансгранічнаму праекту, які выйгралі сумесна з польскімі партнёрамі, — адзначыла **намеснік галоўнага ўрача бальніцы хуткай дапамогі Людміла БУТ-ГУСАІМ.** — Праект накіраваны на раннюю дыягностыку астэапарозу, які рэгіструецца пасля пераломў трубчастых касцей, што ў сталым узросце можа адбыцца нават ад уласнай вагі. З дапамогай найноўшай апаратуры з'явіцца магчымасць дыягнаставаць хваробу, якой яшчэ не бачна. Тады можна нешта карэктаваць.

У далейшым на базе бальніцы, дзе знаходзіцца абласны траўматалагічны цэнтр, будзе створаны і цэнтр дыягностыкі астэапарозу з індывідуальнымі схемамі лячэння. Усяго на гэтую мэту накіравана каля 700 тысяч еўра. Згодна з праектам, на пастаянным кантролі будзе каля дзвюх тысяч чалавек.

Праблема астэапарозу актуальная і для будучых пакаленняў, упэўнены спецыялісты.

— Мы жывём у свеце кнопак, дзе цела амаль не патрэбна, і гэта вялікая праблема, — лічыць траўматолаг Андрэй Швед. — Пры такіх адносінах будучыя пакаленні стануць ахвярамі прагрэсу і тэхналогій, будзе пакутаваць апорна-рухальны апарат. Тыя траўмы, якія дзеці раней лёгка пераражывалі, будуць пераносіцца ўсё цяжэй. Таму трэба самім паклапаціцца пра эластычнасць касцявых тканак.

Спецыяліст прыводзіць прыклад кітайцаў, якія займаюцца гімнастыкай проста на вуліцах, не звяртаючы ні на кога ўвагі. І ў гэтым ёсць сэнс, лічыць траўматолаг. Даследаванні паказалі, што калі чалавек пры фізічных практыкаваннях адчувае сябе ў прасторы, гэта не толькі спрые эластычнасці касцей, але і зніжае рызыку інсультаў і інфарктаў. Увогуле рух павінен стаць такім жа неабходным, як і іншыя гігіенічныя працэдуры, напрыклад чыстка зубоў ці душ.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

## Падзея

# Лейтэнантаў стала болей

### Акадэмія МУС праводзіла сваіх выпускнікоў

**За сцены альма-матар выйшаў 371 малады лейтэнант. 11 атрымалі залатыя медалі, яшчэ 44 — чырвоныя дыпломы. Урачыстая цырымонія выпуску прайшла на плошчы Дзяржаўнага сцяга. Павіншаваць выпускнікоў прыбылі міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ і начальнік Акадэміі МУС Сяргей ДАРОШКА, кіраўнікі Следчага камітэта і КДК, прадстаўнікі Дзяржпагранкамітэта і Міністэрства абароны. У падраздзяленнях гэтых сілавых ведамстваў і будуць праходзіць службу выпускнікі.**

— Першае афіцэрскае званне і дыплом аб вышэйшай адукацыі — вынік добрасумленнай працы на працягу ўсяго перыяду навучання, — зазначыў Юрый Караеў. — Наперадзе вялікае жыццё, поўнае новых планаў і здзяйсненняў, цяжкасцяў і перамог. Доўг, гонар, адвага і мужнасць — гэта крытэрыі вашай работы, але яны павінны спалучацца з высокай культурай, ветлівым і ўважлівым стаўленнем да людзей.

Адзін з тых, хто атрымаў чырвоны дыплом, — Уладзіслаў Кравец, ён адправіцца служыць у Гомель:

— Акадэмія валодае вельмі добрай базай. Таксама ёсць магчымасці паспрабаваць свае сілы абсалютна ў любой сферы. Калектыў у нас вельмі дружны. Ці можна было б уявіць, што хлопцы, з якімі я вучуся, стануць як сапраўдная сям'я? Шкада толькі адно — збірацца здолеем не так часта, як таго хацелася б.

Начальнік Акадэміі МУС Сяргей Дарошка расказаў пра перспектывы ўдасканалення навучальнага працэсу. Мяркуецца, што ва ўстанове з'явіцца больш прадметаў, якія скіраваны на расследаванне злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій. Злачынласць пакрысе перацякае ў лічбавую прастору, і МУС мусіць рэагаваць на выклікі часу.

На заканчэнне ўрачыстай цырымоніі выпускнікі развіталіся са сцягам Акадэміі МУС і прайшлі ўрачыстым маршам.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Традыцыйныя званкі па суботах

**Прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 29 чэрвеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 іх праводзяць:**

старшыня БРЭСЦКАГА аблвыканкама Анатоль Васілевіч ЛІС. Тэл. 8 016 221 31 21; кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ГУРЫНОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю былога намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Ніны Мікалаеўны МАЗАЙ. Пайшла з жыцця ветэран дыпламатычнай службы, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім вядомага дзяржаўнага дзеяча.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю вядомага беларускага палітыка і дыпламата, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР 11-га склікання Ніны Мікалаеўны МАЗАЙ і выказваюць глыбокія спачуванні яе родным і блізкім.**

# «ШЫКОЎНЫ ВОПЫТ ДЛЯ БУДУЧЫНІ»

## Гісторыі валанцёраў, якія робяць Еўрапейскія гульні святам для ўсіх

**Велізарны дэсант добраахвотнікаў для работы на мультыспартыўным турніры арганізатары Гульняў набіралі і навучалі каля двух гадоў. Валанцёрская праграма II Еўрапейскіх гульняў была запушчана яшчэ ў верасні 2017-га. Да красавіка гэтага года было сабрана 24 168 заявак са 106 краін свету, з іх адабралі 8000 найлепшых, гэта значыць, кожнага трэцяга. Усе валанцёры прайшлі навучанне, цяпер яны працуюць па 34 кірунках: хтосьці кантралюе парадак на спартыўных арэнах, нехта дапамагае турыстам на вуліцах, хтосьці забаўляе гасцей у фан-зонах, а хтосьці працуе з прэсай... Як, напрыклад, Настасся ДЫШЛЕВІЧ і Наталля ЗАЛЕЎСКАЯ, якія расказалі свае гісторыі карэспандэнтам «Звязды».**


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Спачатку дзяўчаты працавалі ў прэс-цэнтры на «Палова-Арэне». Калі баскетбольная праграма на Гульнях скончылася, яны адправіліся ў Заслаўе, дзе ўсялякімі намаганнямі спрабавалі палегчыць работу беларускім і замежным прадстаўнікам СМІ.

Настасся вучыцца ў БДУ на філалагічным факультэце і вывучае рускую, беларускую і польскую мовы. «Я займаюся валанцёрствам даўно, — расказвае дзяўчына. — Памятаю, калі быў чэмпіянат свету па хакеі, мне было ўсяго 14 гадоў, разумела, што яшчэ занадта малая для такога вялікага спартыўнага мерапрыемства, а вось цяпер, як толькі ўбачыла, што набіраюць валанцёраў для Еўрапейскіх гульняў, зразумела — гэта мой шанц».

А вось для Наталлі валанцёрскі вопыт першы, яна вывучае ў МДЛУ замежныя мовы — англійскую і іспанскую. «Як толькі з'явілася першая інфармацыя пра Еўрапейскія гульні і пра тое, што яны пройдуць у Мінску, у мяне адразу паўстала жаданне прыняць удзел у іх, але тады яшчэ не было тэхнічнай магчымасці зарэгістравацца, — успамінае Наталля. — Калі пачаўся набор, падала заяўку, бо ведала, што гэта будзе адназначна нешта маштабнае, яркае. Чаму б не стаць часткай такой каманды?»

Дзяўчаты адзначаюць, што яшчэ на этапе кастынгу ў іх узнікла жаданне працаваць менавіта ў прэс-цэнтры. «Для мяне было важна працаваць менавіта на гэтай пазіцыі, таму што ў мяне ўжо быў досвед работы ў прэс-цэнтры на чэмпіянаце свету па баскетболе летась», — адзначае Настасся. А Наталля кажа, што не думала, на якой пазіцыі хацела б працаваць, да таго моманту, пакуль не даведалася, што ёсць магчымасць працаваць з прадстаўнікамі СМІ. «Па вучобе мая спецыялізацыя — піяр, таму захацелася на практыцы паспрабаваць, што гэта такое. Валанцёрства — гэта шыкоўны вопыт для будучыні, магчымасць зразумець, тваё гэта ці не, адчуць, наколькі важна ўзаемадзеянне з прэсай і спартсменамі ў маёй прафесіі, зразумець, як жыва тут і дынамічна».

Дзяўчаты расказваюць, што валанцёры пастаянна мяняюцца пазіцыямі ў рамках свайго кірунку, што дазваляе ім паспрабаваць сябе ў розных спецыялізацыях. Гэта дапамагае з розных бакоў прачуць, як арганізавана маштабнае мерапрыемства. «Збоку здаецца, што гэта так проста, а на самай справе — велізарная праца менеджараў і ўсіх валанцёраў», — адзначае Настасся.

Студэнткі кажуць, што падчас навучання іх увагу звярталі перш за ўсё на тое, што першарадная задача валанцёра — дапамагаць. Не зацыкліваццa на канкрэтнай пазіцыі, а быць валанцёрам з усіх бакоў і заўсёды. «Нават калі ты не ў час сваёй змены ідзеш па вуліцы ў форме і да цябе звяртаюцца, ты павінен адказаць», — заўважае Наталля.

«Таксама ў працэсе навучання мы вельмі шмат часу надавалі ўдасканаленню ведаў англійскай мовы, у нас былі вялізныя тэсты на 400 пытанняў і цяжкія трэнінгі, — дадае Настасся. — Толькі пасля гэтага сапраўды зразумелі, што гатовыя да работы на такім турніры».

Дзяўчаты адзначаюць, што ў асноўным журналісты звяртаюцца да іх з пытаннямі пра тое, як падключыць інтэрнэт або як прайсці на прэс-трыбуну. «Таксама нам абавязкова трэба своечасова прыносіць пратаколы спаборніцтваў, каб журналісты ведалі вынікі матчаў ці заездаў. Мы сочым за фотапазіцыямі і за работай СМІ ў мікст-зоне, дапамагаем арганізаваць інтэрв'ю», — расказвае Насця.

Наталля і Настасся сцвярджаюць, што валанцёрства зацягвае, таму гэты турнір для іх дакладна не стане апошнім. «Магчыма, мы нават захочам паехаць на Алімпіяду ў Токіа», — дзеліцца Наталля. «Бо валанцёрства — выдатны шанц пазнаёміцца з новымі людзьмі, новымі культурамі, паглядзець, як арганізаваны, здавалася б, тыя ж самыя мерапрыемствы, але ў іншых краінах. Гэта дазваляе вучыцца і развівацца далей», — рэзюмуе Настасся.

### Кампетэнтны каментарый

**Міністр адукацыі, кіраўнік падкамітэта па пытаннях арганізацыі работы валанцёраў Аргкамітэта Гульняў Ігар КАРПЕНКА:**

— Пераважная большасць валанцёраў, якія працуюць на Еўрапейскіх гульнях, — гэта студэнты, прытым не толькі з Мінска, але і з рэгіёнаў. Акрамя таго, каля 300 валанцёраў прыцягнута з-за мяжы і прыблізна 500 валанцёраў прадставілі федэрацыі па відах спорту. Яшчэ 700 чалавек — рэзерв, які ў любы момант можа падмяніць дзеючых валанцёраў. Усе яны навучаны.

Сёння ў кожнага з хлопцаў і дзяўчат па-рознаму складваецца работа на Еўрапейскіх гульнях, яны гатовыя выконваць тыя заданні, якія вызначае Дырэкцыя. На маю думку, валанцёры спраўляюцца нядрэнна: у міністэрстве працуе штаб нашага падкамітэта па дзейнасці валанцёраў, і мы адсочваем усе моманты, звязаныя з правядзеннем Гульняў.

Валанцёрства пашырае прафесійны кругагляд будучага спецыяліста. Мы ў гэтым упэўнены, таму Міністэрства адукацыі сумесна з грамадскімі аб'яднаннямі падтрымлівае ўсе гэтыя пачынанні. Мы ўсяляк заахвочваем валанцёраў, у нас праходзяць конкурсы. Па выніках Гульняў мы таксама не забудзем адзначыць найлепшых валанцёраў, такім чынам выказаўшы ім словы ўдзячнасці.

# ПРАЗ 11 ГАДОЎ БЕЛАРУСКІ СПАРТСМЕН АТРЫМАЎ «СЕРАБРО» АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ

## Медаль быў уручаны нашаму спартсмену падчас турніру барцоў на II Еўрапейскіх гульнях



**На Алімпіядзе ў Пекіне ў жніўні 2008 года Мурад Гайдараў стаў бронзавым прызёрам у барацьбе ў катэгорыі да 74 кілаграмаў. Аднак у 2016 годзе пасля пераправеркі допінг-проб вынік сярэбранага прызёра з Узбекістана Саслана Цігіева быў анулявaны, і «серабро» перайшло прадстаўніку Беларусі. Уручыў узнагароду кіраўнік Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў Янез Качыянчыч.**

«Сёння мы сутыкнуліся з неардынарнай сітуацыяй. На нарадзе ў Лазане Томас Бах папрасіў мяне ўручыць медаль. МАК прытрымліваецца чыстага спорту. Калі мы сутыкаемся са станоўчымі допінг-пробамі, мы пераглядаем вынікі. Лічу, вы вартыя сярэбранага медаля Пекіна-2008, і асабліва прыемна ўручаць яго тут, у Беларусі», — адзначыў Янез Качыянчыч.

«Так вырашыў Міжнародны алімпійскі камітэт, з чым было немагчыма не пагадзіцца. Прыемна, што ўручэнне прайшло дома, на радзіме. Яшчэ нядаўна я перамог на чэмпіянаце Беларусі і рыхтаваўся да чэмпіянату Еўропы, але траўмаваў калена. Пасля гэтага давялося ўзяць паўзу. Але я ўжо вярнуўся да трэніровак і выступленняў. Хачу выступіць на хуткім чэмпіянаце ў Казахстане», — адзначыў Мурад Гайдараў.

# Пераўзышлі ўсе спадзяванні

## Весляры дадалі россып медалёў у скарбонку зборнай

**Фіналы ў веславанні на байдарках і каноэ працягнуліся ў Заслаўі ў чацвер. Адразу чатыры залатыя медалі заваявалі беларусы ў гэты дзень на II Еўрапейскіх гульнях.**

Вольга Худзенка заваявала залатую ўзнагароду ў байдарцы на дыстанцыі 500 метраў. Беларусцы ўдалося апярэдзіць алімпійскую чэмпіёнку венгерку Дануту Козак і Эму Ёргенсен з Даніі. *«Калі б вы толькі ведалі, каго я перамагла! Данута Козак вельмі крутая! Яе абыграць раней было нерэальна. Не ведаю, што мне сёння дапамагло. Напэўна, тое, што выступаю ў сябе дома,* — эмацыянальна расказала Вольга. — *Ранейшая перамога надала ўпэўненасці, я зразумела, што канкурэнтаздольная. На трыбунах за мяне балелі мама, браты, шмат жыхароў з майго роднага горада Хойнікі. Дзякуй ім вялікі».*

*«З Вольгай мы працуем апошнія дзесяць гадоў. Ёй даводзілася пераадольваць розныя цяжкасці, але яна ніколі ні адну трэніроўку не працавала напаўсілы, таму і дасягае такіх высокіх вынікаў,* — падкрэсліў **старшы трэнер жаночай зборнай Беларусі па веславанні на байдарках Генадзь ГАЛІЦКІ.** — *Летась на чэмпіянаце свету Вольга мне сказала: я не ведаю, як яе перамагчы, — настолькі моцная была венгерка. Аднак праз час мы гэта зрабілі, і я рады, што атрымалі гэтую перамогу на дамашнім канале II Еўрапейскіх гульняў».*

Нагадаем, у бягучым сезоне на дыстанцыі 500 метраў Вольга Худзенка выступала на этапе Кубка свету ў Познані, дзе заняла другое месца. А ў першы дзень спаборніцтваў яна разам з Марынай Літвінчук заваявала залатую ўзнагароду на дыстанцыі 500 метраў у байдарцы-двойцы.

Чэмпіёнкай Гульняў стала таксама Алена Наздрова ў каноэ-адзіночцы на 200-метровай дыстанцыі. Яна апярэдзіла саперніц з Германіі і Польшчы.

На такой жа дыстанцыі ў каноэ-адзіночцы «золата» выйграў і Арцём Козыр. Амаль палову корпуса ён прывёз бліжэйшаму саперніку. *«Груз адказнасці зваліўся з плячэй. Ішоў да гэтага выніку цэлы год. Нарэшце гэты дзень настаў і скончыўся паспяхова. Вельмі адчувалася падтрымка трыбун, родных і блізкіх. Вялікі ім дзякуй. Дома сцены і праўда дапамагаюць. Заваяваць гэты медаль было цяжка, але падтрымка гледачоў дапамагла справіцца з усім»,* — адзначыў Арцём.

У чацвер Марына Літвінчук другі раз стала чэмпіёнкай II Еўрапейскіх гульняў, выйграўшы «золата» ў гонцы на 5 000 метраў.

Сярэбраны медаль у веславанні на каноэ на 500 метраў заваявала двойка Вольгі Клімавай і Надзеі Макарчанкі. Таксама «серабро» ўзяў жаночы квартэт у складзе Маргарыты Махневай, Надзеі Папок, Вольгі Худзенкі і Марыны Літвінчук у байдарцы-чацвёрцы. Апярэдзіць беларусак на дыстанцыі 500 метраў удалося толькі венгеркам. Трэцім у фінальным заплыве на 200 метраў на байдарцы стаў Дзмітрый Трацякоў. Такім чынам, весляры заваявалі дзесяць медалёў на Еўрапейскіх гульнях у Мінску, пяць з іх — залатыя.

### Іншыя падзеі чацвярга

У сёмы дзень спаборніцтваў II Еўрапейскіх гульняў былі разыграны 24 камплекты медалёў у такіх відах спорту, як стральба з лука, веславанне на байдарках і каноэ, веласіпедны спорт — трэк, стральба кулявая, стральба стэндавая, барацьба вольная, барацьба жаночая. Таксама прайшлі папярэднія спаборніцтвы па бадмінтоне, пляжным футболе, спартыўнай гімнастыцы і настольным тэнісе.

***

Павел Далідовіч завяршыў выступленне ў спаборніцтвах па стральбе з лука. У паядынку за выхад у паўфінал беларус саступіў Стыву Вілеру з Нідэрландаў — 1:7. Такім чынам, беларускія лучнікі завяршылі II Еўрапейскія гульні з адной узнагародай — у жаночым камандным турніры па стральбе з класічнага лука.

***

Беларускія спартсменкі не змаглі прабіцца ў фінал спаборніцтваў па кулявой стральбе. У кваліфікацыйным раўндзе з малакаліберной вінтоўкі з трох пастаў на 50 метраў беларуска Марыя Мартынава набрала 1158 балаў і заняла 15-е месца. Святлана Шчарбацэвіч з вынікам 1144 балы апынулася на 36-й пазіцыі сярод 39 удзельніц спаборніцтваў.

***

У чацвер у рамках II Еўрапейскіх гульняў кваліфікацыйнымі спаборніцтвамі стартаваў турнір па спартыўнай гімнастыцы. Фіналы ў індывідуальным мнагабор'і пройдуць у суботу, а фіналы на снарадах — у нядзелю на Мінск-Арэне. Беларусь на Еўрапейскіх гульнях прадстаўляюць Ягор Шарамкоў, Андрэй Ліхавіцкі і Васіль Міхаліцын у мужчын, а таксама Ганна Мяцеліца і Анастасія Алістратава ў жанчын.

***

На веладроме Мінск-Арэны разыграны чатыры камплекты ўзнагарод: у камандным спрынце ў мужчын і жанчын, а таксама ў скрэтчы і гонцы па ачках.

Беларусь у гэты дзень прадставілі: Паліна Піваварава, Аксана Салаўёва, Іна Савенка і Караліна Савенка (камандная гонка праследавання); Раман Цішкоў, Яўген Ахраменка, Яўген Каралёк і Гардзей Цішчанка (камандная гонка праследавання); Аляксандр Глова, Арцём Зайцаў і Уладзіслаў Новік (камандны спрынт). У гонцы па ачках — Іна Савенка, у скрэтчы — Яўген Каралёк.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# КАЛІ СМЯГНЕ ЗЯМЛЯ...

## Надвор'е замест зброі

Вучоныя ва ўсім свеце б'юць трывогу. Засуха павольна распаўсюджваецца, прыносячы людзям шмат праблем. Па прагнозах ААН, да 2025 года 1,8 мільярда чалавек будуць адчуваць абсалютны дэфіцыт вады і дзве трэці насельніцтва свету будуць жыць ва ўмовах недахопу вады. Да 2045 года каля 135 мільёнаў чалавек пакінуць родныя мясціны ў выніку апустыньвання. Адзін са шляхоў павышэння ўстойлівасці і бяспекі — аднаўленне зямель, якія дэградавалі, пашырэнне маштабаў устойлівага кіравання зямельнымі рэсурсамі.

— Ёсць два фактары, якія «разганяюць» апустыньванне, павялічваюць яго інтэнсіўнасць — пацяпленне клімату, якое назіраецца цяпер, і антрапагенная дзейнасць, — заўважае Уладзімір Логінаў. — У свой час быў падпісаны Кіёцкі пратакол, а ў 2015 годзе — Парыжскае пагадненне па памяншэнні выкідаў парніковых газаў у атмасферу. На жаль, сусветная супольнасць не дасягнула сваіх мэт. На канец дзейнасці Кіёцкага пратакола мы мелі павелічэнне выкідаў парніковых газаў у атмасферу на 50 працэнтаў, а планавалі памяншэнне у сярэднім хоць бы на пяць. Антрапагенная дзейнасць распаўсюджваецца. Ёмістасць біясферы Зямлі груба разлічана на тры мільярды чалавек. Зараз нас у два разы больш, і колькасць насельніцтва працягвае павялічвацца. Значыць, нагрузка становіцца ўсё большай. У 60—70-я гады вучоныя актыўна абмяркоўвалі праблему сахельскіх засух, у выніку якіх пацярпела каля 20 афрыканскіх краін. Менавіта чалавек запусціў гэтыя засухі перавыпасам.

Тыя мінімальныя сродкі, якія выдзяляюцца на барацьбу з апустыньваннем сусветнай супольнасцю, вельмі малыя, упэўнены Уладзімір Фёдаравіч. Ёсць думка, што, калі б чалавецтва адмовілася ад выдаткаў на ўзбраенне і перанакіравала гэтыя грошы на барацьбу з апустыньваннем, іх, напэўна, было б дастаткова. «Вы не ўяўляеце, колькі патрэбна сродкаў, каб спыніць пацяпленне клімату ці хоць бы спагназаваць магчымае павышэнне тэмпературы на 1,5 — максімум 2 градусы. Тымі сродкамі, што выдзяляюцца зараз, мы не спынім пацяпленне, а, значыць, апустыньванне будзе працягвацца», — заўважае акадэмік.

## Беларусь не стане пустыняй!

Вясенняя засуха і чэрвеньская спякота паступова перафарбоўваюць гарадскія газоны ў жоўты колер, ужо пачынае сыпацца лістота з гарадскіх дрэў, і міжволі задумваешся: а ці не пагражае і нам у будучыні апустыньванне? Але, як запэўніваюць беларускія вучоныя, панікаваць не трэба.

Беларусь сёння, як і раней, адносіцца да тэрыторый, на якіх колькасць ападкаў перавышае іх выпарэнне. У канцы 1950-х — 1960-я гады даследаванні паказвалі, што тэрыторыя рэспублікі была на 40 працэнтаў забалочана і пераўвільготнена. Для таго каб ператварыць балотны край ва ўрадлівыя землі, у савецкі час было затрачана больш за 20 мільярдаў долараў. Сёння выказваюцца меркаванні, што з меліярацыяй перастараліся. Але як заўважаюць вучоныя, асушальная мерапрыемствы былі неабходныя і безальтэрнатыўныя.

— Цяпер у краіне меліяравана каля трох мільёнаў гектараў, на якіх мы атрымліваем трэць усёй раслiннай прадукцыі, без іх забеспячэнне харчовай бяспекі краіны немагчымае, — заўважае **намеснік дырэктара па навуцы Інстытута меліярацыі НАН Беларусі Аляксандр АНЖЭНКАЎ.** — Менавіта на меліяраваных землях і палепшаных лугах вырабляецца больш за 60 працэнтаў усіх зялёных кармоў. Да 2020 года мы павінны мець з экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі каля сямі мільярдаў рублёў. Тарфяныя глебы — гэта рэсурс, які трэба рацыянальна выкарыстоўваць.

А вось казаць, што некаторыя з гэтых зямель дэградуюць, на думку вучонага, не варта, паколькі нават пры колькасці арганічнага рэчыва менш за пяць працэнтаў, пры высокай агратэхніцы ўдаецца на іх атрымліваць высокія ўраджаі.

Але вучоныя прызнаюць, што памылкі пры правядзенні меліярацыі ўсё ж былі — нельга было наўпрост скідаць ваду ў сусветны акіян, не пабудавана столькі, як патрабуецца вадасховішчаў. І хоць мясцовае выпарэнне не настолькі «ўплывовае», як, напрыклад, вільгаць, што пераносіцца з акіянаў, засух і замаразкаў сапраўды магло б быць менш.

У нашай краіне пытанні па ахове, рацыянальным выкарыстанні зямельных рэсурсаў знаходзяцца пад пастаянным кантролем. Як паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Андрэй КУЗЬМІЧ,** у краіне рэалізуецца нацыянальны план дзеянняў па прадухіленні дэградацыі зямель на 2016—2020 гады. Летась рэкультывавана 202 кар'еры агульнай плошчай больш за 192 гектары. Для павышэння ўрадлівасці глебаў сельскагаспадарчых зямель унесена больш за 47 мільёнаў тон арганічных угнаенняў. У мэтах падтрымання аптымальных рэжымаў глеб выканана рэканструкцыя і аднаўленне ўчасткаў меліярацыйных сістэм на плошчах звыш 37 тысяч га. Летась у Чэрыкаўскім і Касцюковіцкім раёнах праведзена экалагічная рэабілітацыя тарфянішчаў на агульнай плошчы больш за тысячу гектараў. Сёлета плануецца правесці такія работы на тарфяніўчах у Вілейскім, Гарадоцкім, Шаркаўшчынскім, Мёрскім, Смаргонскім раёнах.

## Дыягназ для глебы

Штогод у свеце каля 50 мільёнаў гектараў сельскагаспадарчых зямель з розных прычын (урбанізацыя, дэградацыя, апустыньванне) выводзіцца з абароту. Але Беларусі, нягледзячы на «свавольствы» надвор'я і частыя засухі, удаецца не толькі зберагаць свае зямельныя рэсурсы, але і павялічваць іх урадлівасць.

За кошт сродкаў дзяржбюджэту ў нашай краіне праводзіцца вапнаванне кіслых глеб, выдзяляюцца вялікія грошы на мінеральныя ўгнаенні. Захоўваецца рэальная сістэма дзяржаўнага кантролю за станам урадлівасці глеб. Буйнамаштабнае аграхімічнае даследаванне глеб праводзіцца бесперапынна з 1970 года.

— Аграхімічны аналіз робіцца раз у чатыры гады, — расказвае **дырэктар Інстытута глебазнаўства і аграхіміі НАН Беларусі, акадэмік Віталь ЛАПА.** Як урач не можа паставіць дыягназ без даследавання, так і без праверак глеб не вызначыць, як зберагчы землі і атрымліваць на іх добры ўраджай. У структуры сельскагаспадарчых зямель у нас у большай ступені пераважаюць дзярнова-падзолістыя глебы, якія ў натуральным стане маюць высокую кіслотнасць і нізкую забяспечанасць элементамі сілкавання. Такія глебы ўразлівыя. Вядома, чым вышэйшы ўзровень урадлівасці глебы, чым вышэйшыя запасы фосфару і калію, тым вышэйшая ўстойлівасць такіх глеб да неспрыяльных умоў надвор'я: засухі ці вясенніх замаразкаў.

Вучоныя назіралі за палямі, дзе былі закладзены ў глебу розныя дозы фосфару і калію. Нават экстрэмальны чэрвень 2000 года даказаў, як важна падсілкоўваць глебу. Калі за адну чэрвеньскую ноч з моцнымі маразамі на многіх палях расліны загінулі, то на падтрыманых карысным элементамі глебах палеткі засталіся зялёныя.

— Гаварыць пра збядненне глеб не даводзіцца, за перыяд з 1995 года адзначаецца станоўчая ўстойлівая дынаміка павышэння запасаў элементаў сілкавання ў глебах. Сёння ўтрыманне фосфару ў ворных глебах складае 188 міліграмаў, калію — 218 (пры ніжняй аптымальнай мяжы ў 200 міліграмаў), — адзначыў Віталь Лапа.

Дзякуючы таму, што ўрадлівасць глеб пастаянна павялічваецца, мы сталі атрымліваць сельскагаспадарчай прадукцыі больш, чым патрабуецца для харчавання нашага насельніцтва, і зарабляць на яе экспарце. Натуральна, неспрыяльныя кліматычныя ўмовы адбіваюцца на ўраджайнасці. І сёння, каб супрацьстаяць такім выклікам прыроды, беларусам, на думку вучоных, найперш трэба клапаціцца пра тэхналогіі. «Дзе вышэйшыя тэхналогіі, там вышэйшыя ўраджаі, і меншая залежнасць ад клімату», — упэўнены Уладзімір Логінаў.

## Парады

Каб паменшыць страты ад засух, трэба ўносіць аптымальныя рэкамендаваныя дозы фосфару і калію да пасеву. На ўзбагачаных глебах карані раслін будуць імкнуцца на глыбіню, і расліна, калі ў спёку перасыхаюць верхнія пласты глебы, не будзе так пакутаваць.

Паклапаціцца пра захаванне глеб трэба і гаспадарам прысядзібных участкаў. Вырошчванне сідэратаў і выкарыстанне гною — гэта добрыя прыёмы, але яны не пазбаўляюць ад неабходнасці ўнясення мінеральных угнаенняў. Віталь Лапа раіць хоць бы раз у пяць гадоў браць узоры глебы і рабіць аграхімічны аналіз, каб гаспадары бачылі, як далей працаваць з глебай. Неабходна сачыць за кіслотнасцю, уносіць даламітавую муку. Важна не перастарацца з дабаўкай элементаў. Напрыклад, зрабіць аптымальнай глебу з кіслай можна за два гады, але калі вы перабралі з угнаеннямі, вярнуць глебу да нармальнага стану куды больш складана — можа спатрэбіцца 15—20 гадоў.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Надвор'е

## ПАСВЯЖЭЕ, ДЫ НЕ НАДОЎГА

**Калі ў суботу будзе 16—23 цяпла, то ў панядзелак ужо да плюс 34 градусаў**

**Вось і дачакаліся мы дажджу, а следам і непрацяглага пахаладання. А ўсё таму, што атмасферныя франты цыклону, які ссоўваецца праз паўночныя раёны краіны, прынеслі навальнічныя дажджы, і да таго ж пачало распаўсюджвацца няўстойлівае больш халоднае паветра з Балтыйскага мора. Пахаладала, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу чакаецца халаднаватае надвор'е. Уначы будзе пераважна без ападкаў, удзень у асобных раёнах краіны магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы. У другой палове сутак месцамі па паўночным усходзе чакаецца парывісты вецер. Уначы будзе досыць холадна (ад 7 да 12 градусаў цяпла), тэмпература ўдзень складзе ад плюс 16 градусаў па паўночным усходзе да 23 градусаў вышэй за нуль па паўднёвым захадзе краіны.

У апошні дзень чэрвеня нас чакае чарговая змена надвор'я. Так, у нядзелю мы зноў трапім пад уплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ў асобных раёнах па паўночным усходзе краіны магчымыя невялікія кароткачасовыя дажджы. Нават уначы чакаецца ад плюс 9 да плюс 16 градусаў, удзень у асноўным плюс 19—26 градусаў, па захадзе краіны паветра прагрэецца да 27—32 цяпла. А вось у панядзелак нас чакае абсалютная гарачыня. Першага ліпеня ўначы будзе пераважна без ападкаў, а ўдзень пад уплывам малаактыўнага атмасфернага фронту месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 цяпла, а ўдзень «расплавімся» — плюс 27—34 градусы. Вось так, лета ў разгары...

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Наркапагроза захоўваецца

**Нягледзячы на тое, што колькасць наркзлачынстваў з кожным годам зніжаецца**

**У Беларусі не менш за 88 тысяч наркаспажыўцоў. Праўда, ў полі зроку медыкаў іх усяго каля 7,8 тысячы. Чаму тыя, хто ўжывае наркотыкі, не звяртаюцца па медыцынскую дапамогу і якія спосабы лячэння і рэабілітацыі з'яўляюцца ў нашай краіне, расказалі спецыялісты.**

Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у 2016 годзе каля 275 мільёнаў чалавек (а гэта 5,6 % насельніцтва планеты) ва ўзросце ад 15 да 64 гадоў хоць бы раз у жыцці ўжывалі наркотыкі. Годам раней у свеце ад іх загінула каля 450 тысяч чалавек. Хтосьці — ад передазіроўкі, а 62 % — ад ускосных прычын, звязаных з ужываннем наркотыкаў: гепатыту С, ВІЧ-інфекцыі і іншых. Як адзначыў **каардынатар праграм па інфекцыйных захворваннях крайнавага офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Вячаслаў ГРАНЬКОЎ,** штогод гэтая арганізацыя распрацоўвае міжнародныя стандарты аказання эфектыўнай медыцынскай дапамогі людзям, якія пакутуюць ад нарказалежнасці. І падкрэсліў, што Міністэрства аховы здароўя ахвотна імкнецца іх укараняць і прытрымлівацца. Але ёсць некаторыя моманты, якія перашкаджаюць атрыманню дапамогі ў поўным аб'ёме.

— Згодна з пастановай Савета міністраў медыцынскія ўстановы павінны паведамляць тэрытарыяльным органам унутраных спраў звесткі аб асобах, якія стаяць на ўліку як наркаспажыўцы. Людзі з залежнасцю апасаюцца трапіць у поле зроку міліцыі і не звяртаюцца да ўрачоў, не атрымліваюць лячэння ад такіх небяспечных інфекцый, як гепатыт С і ВІЧ. За пяць гадоў, з 2012 па 2017, колькасць зваротаў па медыцынскую дапамогу ў сталічны наркадыспансер знізілася ў пяць разоў, у абласны — у шэсць разоў. З кожным годам расце колькасць схаванай наркаманіі. На аднаго нарказалежнага, які стаіць на ўліку, даводзіцца пяцёра чалавек, якія знаходзяцца па-за наглядам медыкаў. Іх спыняе страх пастаноўкі на ўлік, боязь арышту і пазбаўлення волі, — тлумачыць Вячаслаў Гранькоў.

Эксперт заклапочаны жорсткай крыміналізацыяй наркаспажывання і выказаўся аб неабходнасці ўвядзення альтэрнатыўных мер. Ён прывёў прыклад нашых суседзяў: у Эстоніі ўкаранілі практыку, калі затрыманаму наркаспажыўцу прапануюць або лячыцца ў медустанове, або прайсці праз сістэму правасуддзя. А тэрапія на этапе заключэння гарантуе датэрміновае вызваленне.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Генадзь КАЗАКЕВІЧ** пры гэтым адзначыў, што ў Беларусі з яе жорсткім у дачыненні да наркабізнесу заканадаўствам паказчык перадазіровак складае 0,3 на 100 тысяч насельніцтва, у Эстоніі — 10,3, у ЗША — 16,1. У параўнанні з 2014 годам колькасць перадазіровак у Беларусі зменшылася ў чатыры разы, сярод непаўналетніх — у 22. Смяротных выпадкаў ад перадазіровак сярод падлеткаў у краіне не фіксавалася з 2015 года. Штогод колькасць наркзлачынстваў змяншаецца на 9—10 %, больш за палову з іх складае збыт:

— Мы актыўна выяўляем збытавыя ланцужкі. І ўсведамляем, што нарказалежнасць — гэта хвароба, а чалавек мае патрэбу ў лячэнні, таму асноўную ўвагу надаём збытчыкам. Штогод павялічваецца аб'ём канфіскаваных наркотыкаў, з пачатку гэтага года іх ужо больш за паўтоны. Гэта сведчыць пра тое, што наркапагроза ў нашай краіне пакуль, на жаль, захоўваецца.

Генадзь Казакевіч паведаміў, што ў канцы 2019 года на базе РНПЦ псіхічнага здароўя адкрыецца цэнтр доўгай рэабілітацыі. Там будуць пазбаўляць ад нарказалежнасці, пачынаючы ад дэтоксу (ачышчэння арганізма ад таксінаў, з чаго пачынаецца лячэнне) і заканчваючы сацыяльнай рэабілітацыяй — аднаўленнем дакументаў і ўладкаваннем на працу. Працэс лячэння і рэабілітацыі будзе займаць каля шасці месяцаў.

Сёння дзяржаўныя медыцынскія ўстановы прапануюць два спосабы пазбаўлення ад нарказалежнасці: бясплатны з пастаноўкай на ўлік і платны ананімны. Як паведаміла **загадчык сектара наркалогіі РНПЦ псіхічнага здароўя Іна БЕЛАЕЦ,** у краіне 240 ложкаў для рэабілітацыі пацыентаў з нарказалежнасцю, яны ёсць ва ўсіх абласных цэнтрах. У стацыянары пацыент знаходзіцца 21—28 дзён.

**Намеснік галоўнага ўрача Гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера г. Мінска Жанна ІСТОМІНА** падкрэсліла, што за апошнія гады ўдалося ўзяць пад кантроль праблему наркаўжывання сярод падлеткаў.

— У 2014—2015 гадах мы сутыкнуліся з «эпідэміяй» спайсаў, дзе самым слабым звяном былі падлеткі. Нашы ўрачы пайшлі ў школы, на прадпрыемствы, і сітуацыю ўдалося змяніць. Калі ў 2015 годзе на ўліку стаяла 89 падлеткаў, якія мелі нарказалежнасць, то сёння іх усяго 9, — адзначыла спецыяліст.

**Алена КРАВЕЦ.**




## ОДА «КАСМАНАЎТУ»,
### або Пра тое, як дзед Леўка пад небам пабываў

Што было — яно было,
Хоць даўным-даўно сплыло:
Леўка ў чоўне — бы ў ракеце —
«Пагасціў» у лепшым свеце.

...Ён прызнаны быў рыбак:
Ведаў, дзе ляшчоў касяк,
Дзе кучкуюцца язі,
Хоць вазамі іх вазі.
Бабе сома закарціць, —
Што раз плюнуць, што злавіць...
А часцей —
дык для забавы
Па Дняпры дзядуля плаваў.

...Неяк дно там паглыблялі,
Люду, тэхнікі нагналі,
Толу ўклалі.
Усё па плане —
Вось-вось шнур ужо падпаляць...

Бачыў люд: пабег агеньчык,
Каля «бомбы» ужо грабеньчык...
Там жа
раптам,
неспадзеўка —
З-за куста
на чоўне...
Леўка!
Хоць крычы,
хоць не крычы,
Дзеду ўжо не памагчы!

Ірванула дык рванула:
Вёску з лесам скаланула!
Рэчка выйшла з берагоў,
Ледзь не змыўшы «гледачоў»!
А дзе ж човен?!
Леўка дзе?!
Толькі трэскі па вадзе...

Бабы тут хрысціцца сталі,
Дзядзькі — шапкі паздымалі:
Яно ж трэба...
Жах дык жах:
Гэтак згінуць...
На вачах.
Люд знямеў...
Ды праз хвіліну
Нехта зоркі
ўбачыў... спіну:
Дзед?..
Жывы?!
І сам... грабе?!
Ты глядзі: не так сабе!

Усе насустрач:
«Дзе баліць?..»
«Што зламаў?..»
«Ці будзе жыць?»
Хтосьці мацаў:
«Ты ў парадку?»
Кажа:
«Трэскі ў азадку.
Я нажыў такі бяду...» —
«Дык падвезці!?» —
— «Сам дайду».

...З месяц дома
дзедка жыў
Як?
Ды хто там бачыў?
Тое месцейка лячыў,
Але ж не лайдачыў:
Неяк зноў з'явіўся з чоўнам,
Што старому быў не роўным —
Акаваны нос, карма...
Дзед стараўся нездарма.

На пытанне ж, ці жахліва
К богу злётаў у старым,
Той казаў:
«Адно меў дзіва —
Век не... пі́саў дагары,
Хоць на фронце ваяваў».

...Там наш дзед героем стаў.
Гонар мелі мужыкі
Пасядзець з ім ля ракі.
Ды і цяпер
сто грам кульнуць —
Добрым словам памянуць.

**Соф'я Кусянкова,**
*в. Лучын,*
*Рагачоўскі раён.*

## НА ЧУЖЫ КАРАВАЙ...

У канцы мінулага стагоддзя ў нашу вёску прыслалі маладую настаўніцу рускай мовы і літаратуры. Гэта была цікавая дзяўчына. Фігуру мела не горшую, чым у Людмілы Гурчанкі, прычоску — амаль як у Алы Пугачовай. А вось тварык, на жаль, падгуляў: ён быў у вяснушках, якія здаваліся досыць мілымі, калі Тая ўсміхалася, а вось калі злавала (што здаралася куды часцей), выглядалі сапраўдным брыдкім рабаціннем.

Такая вось была неспадзяванка — першая, што кідалася ў вочы, але ж далёка не апошняя.

Другая атрымалася ў дзеўкі з жыллём. Справа ў тым, што пасялілі яе праз дзве хаты ад школы, у цёткі Пелагеі, якая раптам сказала, што грошай за кватэру з новай жылічкі браць не будзе, нават карміць яе згодна як родную дачку, але ж пры ўмове, што Таіса дапаможа ёй па гаспадарцы.

Сэканоміць грошай маладой настаўніцы, вядома ж, хацелася, лішняй работы яна не баялася, з чаго складаецца цётчына гаспадарка, не ведала і таму з ахвотай згадзілася. А далей...

Можа, любоў якая была, можа, цяжка з усім спраўляцца (у гаспадыні апроч вялікай хаты і «валочкі» зямлі былі дзве каровы, двое цялят, трое свіней, куры, гусі, трусы і авечкі), можа, сваёй сям'і захацелася... Факт, што ў хуткім часе і неяк раптам Тая распісалася з нашым участковым і пераехала да яго. Дом быў асобны, прасторны, з усімі выгодамі. Здавалася б, у такім толькі жыць ды дзяцей гадаваць. Але ж і год прайшоў, і два, і чатыры, а іх няма — нават почуту. Затое іншы — ёсць. Спачатку ўсе казалі, што ўчастковы да фельчаркі ездзіць у суседнюю вёску, потым — ён у горадзе раман закруціў...

Што там праўда было, што не, але ж дыму без агню, відаць, не бывае. У сям'і пачаліся сваркі і слёзы. Жонка разводам яшчэ не пагражала, але ж неяк пры мужу ляпнула, што калі ён гуляе, то можа і яна...

Не думаю, што Таіса на гэта пайшла б — не такія былі часы і не той характар, але ж родны муж яе, можна сказаць, «падштурхнуў», сказаў: «Ты?! Вось такая рабая? У люстэрка на сябе паглядзі. Каму ты патрэбна?»

Тая, вядома ж, паглядзела, чарговую ноч адплакаўшы, і нічога такога не ўбачыла: ну, талія ўжо не 70 сантыметраў. І вага не 55 кілаграмаў, але ж усё пры ёй. А тут яшчэ і пуцёўка.

...Карацей, настрой у жанчыны быў вельмі рашучы. Да таго ж у санаторыі і амаль адразу яна выпадкова пачула размову дзвюх пакаёвак, што, маўляў, у 21-ы нумар заехалі такія чыстаплюі... Асабліва яна — палкоўнічыха.

«Значыць, ёсць і палкоўнік?» — падумала Тая, і хутка ўбачыла, які ён — рана пасівелы, стройны, хударлявы, прыгожа адзеты... Мара, а не мужчына! Хоць і трохі разгублены... Ці прыгнечаны? «Усё з-за чыстаплюйкі», — пашкадавала чалавека Таіса. І тут жа вырашыла жонку палкоўніка, знешне падобную на Каробачку з «Мёртвых душ», — у разлік не браць. Тым больш што яна прывезла яго і праз суткі з'ехала.

А вось муж, як выглядала, адзіноты не чакаў — шукаў кампаніі. Не дзіва, што яны пазнаёміліся, сталі разам хадзіць на працэдуры, а па вечарах і ў кіно, пасля чаго Тая (а хай муж ведае!) ужо падумвала запрасіць палкоўніка да сябе...

Як тут і раптам з'явілася Каробачка: пераняўшы Таісу па дарозе ў сталоўку і адвёўшы ўбок, яна вельмі ветліва, як жанчына жанчыну, папрасіла саперніцу «пераключыцца на каго-небудзь іншага»: не дурыць галаву яе хвораму мужу.

Для Таі і гэта сустрэча, і просьба былі настолькі нечаканымі, што яна не прыдумала нічога лепшага, як загаварыць... пра каханне з першага позірку і пра тое, што якраз з ёй гэты сапраўдны мужчына, палкоўнік, можа, стаў бы пасапраўднаму шчаслівы...

Вось тут заклапочанасць жонкі як рукою зняло:

— Паслухайце, маці Тэрэза, — у твар ёй засмяялася Каробачка. — Мой муж усё жыццё працуе на аўтобусе. А палкоўнік у нашай сям'і (прычым палкоўнік юстыцыі) — гэта я. Так што вам, відаць, лепей было б з'ехаць.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1,5 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 40 календарных дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. Тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • сайт: gino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**

**Продавец: Унитарное предприятие «Светотехника» ОО «БелТИЗ», г. Гомель, ул. Советская, 202б. Тел.: 8 (0232) 33-98-11, 8 (044) 544-11-07**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень



**АВЕН.** Калі доўгачаканы адпачынак яшчэ не наступіў, неабходна, насуперак унутраным жаданням, засяродзіцца на рабоце. Залішняя безуважлівасць можа толькі нашкодзіць. Поспех шмат у чым будзе залежаць ад хуткасці рэакцыі на тое, што адбываецца, і вашай камунікабельнасці. У грашовых справах магчыма з'яўленне новай крыніцы даходаў. Не забывайце таксама пра сям'ю і назапашаныя хатнія справы. Пакадана больш часу і ўвагі аддаваць дзецям. У нядзелю не адмаўляйцеся ад запрашэнняў сяброў, вы добра праведзяце час.



**ЦЯЛЕЦ.** Можа з'явіцца дадатковая нагрузка на рабоце. Аднак важна не выпусціць свой шанц на кар'ерны рост і не спалохацца новых для сябе заняткаў. Перасільце сябе, вызваліцеся ад комплексаў, якія перашкаджаюць жыць. У сераду варта прыслухацца да парад сяброў і сваякоў. Больш давярайце інтуіцыі. У пятніцу да канца дня мітусня прыцішне і з'явіцца магчымасць расслабіцца і адпачыць. У суботу правядзіце час з дзецьмі і пажадана на свежым паветры.



**БЛІЗНЯТЫ.** Надыходзіць спрыяльны час, калі ажыццяўляюцца вашы жаданні, асабліва гэта датычыцца асабістага жыцця, планавання сям'і. Будзеце атрымліваць асалоду ад жыцця і кахання, што дазволіць пазбегнуць рэзкіх перападаў настрою. Вы цяпер дакладна ведаеце, што перадолееце ўсе перашкоды і дасягнеце сваёй мэты, бо побач з вамі блізкія людзі, якія падтрымліваюць вас.



**РАК.** Усё складзецца добра. Успрымайце без крыўдаў крытычныя заўвагі на свой адрас. У іх цалкам рэальна знайсці канструктыўныя думкі, а яны могуць спатрэбіцца. У сераду можаце разлічваць на дапамогу сяброў. Дзелавыя сустрэчы ў пятніцу пройдуць удала. Пачуццё такту і шчырасць дазволяць вам віртуозна справіцца з пастаўленымі задачамі. Часцей бывайце ў прыемнай кампаніі, нефармальныя сустрэчы і кантакты могуць быць вельмі карысныя.



**ЛЕЎ.** Тыдзень у цэлым спрыяльны, за выключэннем серады, калі магчымыя канфліктныя сітуацыі на рабоце. Спатрэбяцца такія якасці, як засяроджанасць і ўраўнаважанасць, а вось залішняя эмацыянальнасць толькі нашкодзіць. Можна разлічваць на прыбаўку да зарплаты, але давядзецца ўкласці ў справу нямала сіл і таленту. У канцы тыдня верагодныя праблемы з хатнімі, не стаўцеся да іх легкадумна, яны могуць стаць нашмат больш складанымі, чым вы думаеце.



**ДЗЕВА.** Не дазваляйце карыстацца вашай дабрынёй у карыслівых мэтах, умейце сказаць не, калі гэта неабходна. У сітуацыі, якая склалася, вам вельмі дапамогуць гнуткасць мыслення і ўменне адчуваць суразмоўцу. Не давайце волю пачуццям і эмоцыям пры зносінах са сваякамі, аб рэзкіх словах прыйдзецца потым шкадаваць. Беражыцеся аўторка, у гэты дзень некаторыя вашы тайны могуць раскрыцца. У другой палове тыдня з'явіцца рэальная магчымасць наладзіць асабістае жыццё.



**ШАЛІ.** Неабходна будзе засяродзіцца на галоўным і не марнаваць сілы на рашэнне другарадных праблем. Пажадана, каб рост актыўнасці і прадпрымальнасці не ператвараўся ў імітацыю бурнай дзейнасці. Паспрабуйце не спрачацца з начальствам і не крытыкаваць калег. У сям'і не варта ўвесь час падпарадкоўвацца, з вашай думкай таксама павінны лічыцца.



**СКАРПІЁН.** Добры час для ўмацавання лідарскіх пазіцый на рабоце, ваш аўтарытэт і даходы растуць. Будзьце больш настойлівымі, тады поспех усміхнецца, і вы зможаце рэалізаваць свае даўнія ідэі. Спрыяльна ўсё, што дапамагае вашаму асабістаму развіццю: адукацыя, паездкі, публічныя выступленні. Надыходзіць выдатны перыяд для кахання і прыемных зносін. Вас натхняе рамантыка і прыемны запал.



**СТРАЛЕЦ.** На гэтым тыдні можаце ўплываць на людзей, таму прадумвайце кожны крок, а дапушчаныя памылкі могуць адбіцца не толькі на вас. У панядзелак і сераду выявіце свае таленты і заслужыце пахвалу блізкіх людзей. У чацвер ваша ініцыятыва будзе ацэненая начальствам па заслугах. Паездкі ў гэты дзень будуць удалыя, а сустрэчы і новыя справы дазволяць пашырыць поле дзейнасці. Не нагружайце сваякоў сваімі праблемамі ў выхадныя.



**КАЗЯРОГ.** Давядзецца адкарэктаваць планы. Не варта перанапружвацца на рабоце. Інакш на вас павесяць шмат лішніх заданняў. У пятніцу пэўныя абставіны могуць прымусіць узяцца за нязвыклую справу: не хвалюйцеся, усё атрымаецца. У суботу не гаварыце лішняга і не абмяркоўвайце сяброў і калег за іх спінай.



**ВАДАЛІЎ.** На гэтым тыдні будзеце поўныя энергіі і гатовыя да новых прыгод, але варта памятаць, што ваша свабода заканчваецца на мяжы са свабодай іншага чалавека. Спроба захапіць права дзейнічаць па ўласным жаданні хутка прывядзе вас да сур'ёзнага канфлікту. У сераду будзьце больш асцярожныя ў выказваннях, можаце выбалбатаць свае і чужыя сакрэты. Здрады і падман пагражаюць выкрыццём. У суботу чакайце навін ад далёкіх сваякоў, яны здольныя дапамагчы вам у вырашэнні нейкай важнай праблемы.



**РЫБЫ.** Ваш унутраны свет запатрабуе асцярожных і клапатлівых адносін да сябе. Запавольце працоўны рытм. Адпачніце, паслухайце добрую музыку. Узбагаціцеся новымі ўражаннямі і адчуваннямі. Прыслухайцеся да сваёй інтуіцыі і займайцеся толькі тымі праблемамі, на неабходнасць вырашэння якіх яна пакажа. Паспрабуйце не даводзіць да сварак вашы адносіны з блізкімі.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.40 | 21.45 | 17.05 |
| Віцебск — | 4.21 | 21.44 | 17.23 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.36 | 17.06 |
| Гомель — | 4.36 | 21.23 | 16.47 |
| Гродна — | 4.57 | 21.59 | 17.02 |
| Брэст — | 5.07 | 21.50 | 16.43 |

## Месяц

*Поўня ў 7.53.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

***Пр.*** *Амоса, Іоны, Касьяна, Лазара, Рыгора, Фёдара.*
***К.*** *Вольгі, Раісы, Вінцэнта, Ірынея, Лявона, Паўла.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты / Падзеі / Людзі

### 28 ЧЭРВЕНЯ




**1884** год — нарадзілася Вольга Фёдараўна Нікановіч-Сахарава, беларуская паэтэса, драматург. У 1900-м скончыла Полацкую гімназію. Настаўнічала ў Латвіі і Эстоніі. Удзельнічала ў рабоце культурна-асветнага таварыства беларусаў Латгаліі «Бацькаўшчына». Збірала беларускі фальклор, пісала п'есы, вершы. Аўтар сцэнічных твораў «На Полацкім замчышчы», «Птушка на волі». Большая частка паэтычнай спадчыны засталася неапублікаванай. Рукапіс зборніка вершаў (рыхтаваўся пасмяротна) захоўваецца ў Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы. Памерла ў 1943 годзе.

**1914** год — нарадзіўся Уладзімір Іларыёнавіч Савіцкі, беларускі пісьменнік. Аўтар кнігі апавяданняў «Ноч перад парадам», аповесцяў «Не рабі зла бліжняму», «Улька», зборнікаў дакументальных апавяданняў «Ні хвіліны спакою», «А гады ідуць ...», рамана «І прыйдзе твой дзень». Выдаў паэтычныя зборнікі «Поле бою», «Зарніцы на гарызонце». Памёр у 1989 годзе.

**1914** год — нарадзіўся Яўген Фёдаравіч Філіпскі, адзін з арганізатараў партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944 год). З верасня 1941 года ў партызанах: камандзір групы, атрада, брыгад «За Радзіму», «Полымя», адначасова член Пухавіцкага падпольнага райкама КП(б)Б. Партызаны брыгады пад камандаваннем Філіпскага падчас «рэйкавай вайны» падарвалі больш за 1,5 тысячы рэек, у ліпені 1944-га сумесна з войскамі Чырвонай Арміі вызвалілі горад Мар'іна Горка. Памёр у 1953 годзе.

**1939** год — створаны Акцябрскі раён Гомельскай вобласці.

**1979** год — пастановай Савета Міністраў Беларусі была заснавана Чырвоная кніга Беларусі, афіцыйнае выданне, якое змяшчае спіс рэдкіх відаў і відаў, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення на тэрыторыі Беларусі (і падвідаў), дзікіх жывёл і дзікарослых раслін. Першае выданне выйшла ў 1981-м, у яго ўключана 80 відаў ахоўных жывёл і 85 відаў ахоўных раслін.




**1644** год — акцёр Жан Батыст Паклен упершыню выйшаў на сцэну пад псеўданімам Мальер.

**1859** год — у англійскім горадзе Ньюкасл прайшла першая выстаўка сабак.

**1914** год — у горадзе Сараева членамі сербскай канспіратыўнай групы быў забіты эрцгерцаг Франц Фердынанд. «Сараеўскае забойства» было выкарыстана Аўстра-Венгрыяй і Германіяй як падстава для развязвання Першай сусветнай вайны.

**1919** год — падпісаны Версальскі мірны дагавор з Германіяй, які завяршыў Першую сусветную вайну.



**1949** год — нарадзіўся Аляксандр Васілевіч Панкратаў-Чорны, расійскі акцёр і рэжысёр, народны артыст Расіі (2009 год). Здымаўся ў многіх фільмах, сярод якіх — «Мы з джаза», «Зімовы вечар у Гаграх», «Жорсткі раманс», «Кур'ер». Зняў карціны «Дарослы сын», «Салон прыгажосці» і іншыя.

## УСМІХНЕМСЯ

Амаль тыдзень быў у камандзіроўцы ў Карагандзе, і хоць бы адна сволач патэлефанавала з пытаннем: «Ты дзе?»

**— Скажы, а ты добра на веласіпедзе катаешся?**
**— Як маланка!**
**— А, ведаю — зігзагамі.**
**— Не. Часам у дрэва трапляю...**

Аб'ява:
«Шукаю дзяўчыну з кватэрай для вельмі сур'ёзных адносін, машына ў мяне ўжо ёсць ад папярэдняй жонкі».

**— Як ты мог так напасці?! У яе ж на лбе напісана, што яна дурніца!**
**— Дык у яе ж грыўка...**

Вось чаму ўсе, абсалютна ўсе, калі даведваюцца, што я памаленьку буду дома паравы рухавік, лью алюміній і збіраю фрэзерны станок, раяць мне хутчэй ажаніцца?..



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1999.
Нумар падпісаны ў 19.30 27 чэрвеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

28 чэрвеня 2019 г. № 26 (511)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



МС УВАГА! ПРАПАНУЕМ ПАДПІСАЦЦА

на пятнічны нумар газеты «Звязда» з дадаткам «Мясцовае самакіраванне» (выходзіць штотыднёва).

Для фізічных асоб – 633072

Для юрыдычных асоб – 63307

Аформіць падпіску можна на тэрмін ад аднаго месяца да паўгода.


ТЭМА ТЫДНЯ



# Ад ямачнага рамонту да дарогі з падагрэвам

**У нашых найбліжэйшых суседзяў з Расіі і Украіны ў большасці сваёй склалася меркаванне аб тым, што дарогі ў нашай краіне высокай якасці, а нашы аўтатрасы яны ставяць у прыклад сваім чыноўнікам. Больш сумная сітуацыя — з мясцовымі дарогамі. Тут нават статыстыкі не трэба прыводзіць, дастаткова самастойна выехаць за межы горада або пагаварыць з жыхарамі глыбінкі.**

## У сярэдзіне рэйтынга

За апошнія 20 гадоў працягласць дарог Беларусі павялічылася ў 1,6 раза, а колькасць транспартных сродкаў — у тры. Пры гэтым фінансавыя сродкі, якія выдзяляюцца на рэканструкцыю і будаўніцтва дарог, наадварот, зменшыліся ў 1,5 раза (без уліку крэдытных сродкаў).

Паводле інфармацыі Міністэрства транспарту і камунікацый, на 1 студзеня 2019 года сетка аўтамабільных дарог агульнага карыстання ў краіне склала каля 87 тысяч кіламетраў. Да рэспубліканскіх аўтамабільных дарог адносяць амаль 16 тысяч кіламетраў, да мясцовых — крыху больш за 71 тысячу кіламетраў.

Пры гэтым шчыльнасць загарадных дарог з цвёрдым пакрыццём пакуль даволі нізкая — 337 кіламетраў на 1 тысячу квадратных кіламетраў тэрыторыі. Для параўнання: у заходнееўрапейскіх краінах з развітой сеткай аўтамабільных дарог гэты паказчык роўны ў сярэднім 906 кіламетраў на тысячу «квадратаў». Па даных розных даследаванняў, наша краіна нязменна аказваецца ў сярэдзіне рэйтынга краін па якасці дарог. Пры гэтым наша транспартная сетка лепшая, чым у суседзяў з Расіі і Украіны, што пацвярджаюць не толькі эксперты, але і простыя вандроўнікі. Аднак да лідараў рэйтынга ў ААЭ, Сінгапура, Швейцарыі, Ганконга, Нідэрландаў і нават суседніх Літвы і Польшчы нам пакуль далёка.

— Кожны год мы бачым, як сціскаецца наш дарожны фонд, — адзначае **старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Андрэй РЫБАК.** — Абмяркоўвалі ў Мінтрансе, што трэба пераразмеркаваць бюджэт паміж рэспубліканскімі і мясцовымі дарогамі. Трэба павялічваць дарожны фонд, у тым ліку яго крыніцы.

Цяпер дарожны фонд папаўняецца перш за ўсё з так званага дарожнага падатку, які плаціць аўтаўладальнік разам з праходжаннем тэхагляду. Але з-за адсутнасці жадання яго выплаты многія кіроўцы перасталі праходзіць тэхагляд. Ужо даўно кажуць пра адвязку «дарожнага падатку» ад тэхагляду і аб новых метадах кантролю выплаты, аднак канкрэтыкі ў гэтым пытанні няма і сёння.

стар. 4, 13

НА СЛЫХУ

# У КОШТ ПАЛІВА ЦІ ПА МЕСЯЦАХ?

## Механізм дарожнага збору абмеркавалі ў Палаце прадстаўнікоў

**Верагодна, большасць кіроўцаў нашай краіны цікавіць — як жа вырашыцца пытанне з дарожным зборам? Яго ўключаць у кошт паліва? Ці яго будуць збіраць па месяцах? А можа, ёсць нейкія іншыя варыянты? Некаторыя падрабязнасці работы над гэтай няпростай тэмай раскрыў міністр фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ на нядаўнім пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах.**

Сапраўды, на сустрэчы абмяркоўвалі бюджэт, аднак у канцы мерапрыемства прадстаўнік дэпутацкага корпуса ўзняла пытанне дарожнага збору. Яна прапанавала знізіць стаўку дзяржпошліны за выдачу дазволу на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху, каб павялічыць яе збіральнасць. Максім Ермаловіч у адказ справядліва заўважыў:

«Кошт дарожна-транспартнай інфраструктуры мае сваю цану, — нагадаў ён. — Плаціць прыйдзецца, толькі па якім механізме? Паменшыць стаўку — значыць, знізіць выдаткі на дарожную гаспадарку. Гэта пытанне дыскусійнае».

Акрамя таго, Максім Ермаловіч пракаментаваў два варыянты механізма, якія зараз разглядаюцца: з магчымасцю аплаты дарожнага збору па месяцах або ўключэнне яго ў кошт паліва:

«Мы асцярожна разглядаем абодва варыянты. Яны з пункту гледжання даходаў ідэнтычныя. З пункту гледжання адміністравання збіраць падатак праз паліва значна лягчэй».

Сітуацыя такая, што ў кожнага з падыходаў ёсць і перавагі, і недахопы. Узяць хоць бы збіранне збору праз павелічэнне кошту паліва — калі прымуць такое рашэнне, то яно ўскосна адаб'ецца на цане тавараў і паслуг, паколькі на запраўцы немагчыма падзяліць, хто запраўляецца — дачнік-пенсіянер, бізнесмен, кіроўца камерцыйнага аўтатранспарту.

Дарэчы, міністр фінансаў таксама расказаў пра альтэрнатыўныя варыянты, якія разглядаліся раней, — прывязаць дарожны збор да страхоўкі, а яшчэ, напрыклад, адсочваць аплату праз сістэму відэаманіторынгу дарожнага патоку.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**


## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Пятая з сямнаццаці



Жаночая салідарнасць і падтрымка прадпрымальніц прыгожага полу — аспекты ў рэалізацыі МУР. стар. 2

### Як дзірка ў мосце



Жыхары вёскі Коладна, што на Брэстчыне, даўно чакаюць рамонту дарогі. стар. 13

### Нахабныя машыны



Магіляўчане просяць не рабіць з вуліцы Боткіна паркоўку. стар. 14

### Грошы на ідэі



Як развіваецца сельскі бізнес на Нарачанскай зямлі. стар. 15

# СІГНАЛ ДЛЯ БІЗНЕСУ

## Супрацоўніцтва рэгіёнаў, міжпарламенцкі дыялог і ўдзел у глабальнай ініцыятыве «Адзін пояс, адзін шлях»

**Гэтыя тэмы сталі асноўнымі для абмеркавання на сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча з дэлегацыяй бундэстага ФРГ, якая прайшла на мінулым тыдні.**

На думку спікера верхняй палаты беларускага парламента, у краін склаліся добрыя двухбаковыя адносіны, але патэнцыял значна шырэйшы, чым дасягнуты на сённяшні дзень. У чым крыюцца рэзервы? Як падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч, неабходна па лініі парламентаў даць пазітыўныя сігналы бізнесу, каб прамысловая кааперацыя ў розных сваіх формах развівалася больш актыўна.

— Сёння ў Беларусі працуе каля 300 прадпрыемстваў з германскім капіталам, але буйных кампаній няшмат. Мы з вамі ўжо пачалі абмяркоўваць адзін з праектаў, але іх павінна быць шмат, — звярнуўся спікер верхняй палаты да кіраўніка германа-беларускай парламенцкай групы дружбы, члена камітэта бундэстага па эканоміцы і энергетыцы Марка Хаўптмана.

Той, у сваю чаргу, выказаў салідарнасць, адзначыўшы, што супрацоўніцтва неабходна інтэнсіфікаваць:

— У прыватнасці, гаворка ідзе аб нямецкіх інвестыцыях у Беларусь, я маю на ўвазе і тэхналагічныя, і эканамічныя паркі. Мы таксама зацікаўлены, каб інвестыцыі павялічваліся, але і ў тым ліку з мэтай аблягчэння шляху для беларускіх кампаній у плане экспарту і выхаду на еўрапейскі рынак, — удакладніў ён.

Дарэчы, Германія традыцыйна ўваходзіць у пяцёрку краін — найбольш буйных інвестараў у эканоміку Беларусі. Летась з Германіі прыцягнута інвестыцый на суму 363 мільёны долараў.

Адну з ініцыятыў на сустрэчы абмеркавалі больш дэталёва, гаворка ідзе аб глабальнай ініцыятыве Кітая «Адзін пояс, адзін шлях», па якой бакі маюць падобныя пазіцыі. У праекце задзейнічаны найбуйнейшы ў свеце ўнутраны порт у горадзе Дуйсбургу, якім кіруе нямецкая кампанія Duisburger Hafen, адзін з акцыянераў СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка (кіруючая кампанія Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень»). Нямецкі бок бачыць удзел нашай краіны ў тым, каб таваратокі ў порт ішлі праз Беларусь.

Вялікую цікавасць уяўляе IT-сфера. Кіраўнік дэлегацыі, адказваючы на пытанне карэспандэнта «МС», адзначыў, што ёсць зацікаўленасць у пашырэнні супрацоўніцтва з ПВТ, у тым ліку па прынцыпе аўтсорсінгу і перадачы заказаў, паколькі тут ёсць інфраструктура і падрыхтаваныя спецыялісты.

Яшчэ адзін кірунак, якому, на думку Міхаіла Мясніковіча, неабходна аддаць больш увагі, — міжрэгіянальнае супрацоўніцтва.

— Германія — вялікая краіна, і яе землі маюць дастаткова сур'ёзны патэнцыял. Можна было б актывізаваць супрацоўніцтва на ўзроўні рэгіёнаў Беларусі і зямель Германіі, — перакананы ён. — Ну і, безумоўна, нам трэба актывізаваць міжпарламенцкія кантакты, каб яны сталі рэгулярнымі, і гэта будзе добрым сігналам бізнесу.

### Толькі лічбы

**Германія — адзін з вядучых знешнегандлёвых партнёраў Беларусі. За мінулы год яна заняла 5-е месца па аб'ёме таваразвароту, 4-е месца па аб'ёме беларускага экспарту і 3-е месца па аб'ёме імпарту. Летась таваразварот склаў 3,3 мільярда, экспарт — 1,4 мільярда, імпарт — 1,8 мільярда долараў.**

**Што пастаўляем? У асноўным мінеральныя прадукты, прадукцыю лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці, прадукцыю хімічнай прамысловасці і іншае. Завозім машыны, абсталяванне, прыборы, а таксама інструменты, некаштоўныя металы і вырабы з іх.**

Марк Хаўптман падтрымаў ідэю, звярнуўшы ўвагу на магчымасць супрацоўніцтва рэгіёнаў, у тым ліку і на аснове маладзёжных праектаў. Ён перакананы: у гэтым сэнсе ёсць шмат сфер, дзе бакі маглі б паглыбіць і развіваць адносіны.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ЯКАСНЫЯ ЛЕКІ ПА ДАСТУПНЫХ ЦЭНАХ

## Індыйскі інвестар паспяхова развівае фармбізнес у Беларусі і пазітыўна ацэньвае далейшыя перспектывы

**Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны па супрацоўніцтве з Індыяй Міхаіл Мясніковіч абмеркаваў з генеральным дырэктарам буйной індыйскай кампаніі «Натка Фарма Лімітэд» Раджывам Нанапанэні перспектывы далейшага супрацоўніцтва.**

Як паведамілі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, кампанія з'яўляецца сузаснавальнікам СТАА «Націвіта», якая стварае ў гарпасёлку Бешанковічы Віцебскай вобласці ўнікальную вытворчасць лекавых прэпаратаў для лячэння анкалагічных захворванняў. Гэта новы кірунак у фармацэўтычнай прамысловасці, які адпавядае сусветным трэндам, — біятэхналагічная вытворчасць на аснове монаклanальных антыцел. У праекце ўдзельнічае міжнародны склад заснавальнікаў: кампаніі Беларусі, Індыі, Славакіі, Літвы. У будаўніцтва фармацэўтычнага завода ўжо інвеставана 15 мільёнаў долараў, стадыю рэгістрацыі прайшлі 22 лекавыя прэпараты. Укладанні, між іншым, працягнуцца: у развіццё вытворчасці плануецца дадаткова накіраваць каля 10 мільёнаў долараў.

Як паведаміў падчас сустрэчы старшыня Савета дырэктараў, выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара СААТ «Націвіта» Аляксей Сычоў, агульны аб'ём рэалізацыі прадукцыі летась склаў 17 мільёнаў долараў, у 2019 годзе — чакаецца ў памеры каля 28 мільёнаў. Надалей кампанія плануе штогод засвойваць па поўным цыкле не менш як сем лекавых сродкаў. Гаворка ідзе не толькі аб вытворчасці генерыкаў, але і аб распрацоўцы ўласных арыгінальных прэпаратаў. Для гэтага будзе створаны комплекс сучасных лабараторый для распрацоўкі лекавых сродкаў, а таксама кантролю іх якасці.

Глыбокая лакалізацыя і вытворчасць лекаў па поўным цыкле стварае добрыя магчымасці і для развіцця экспарту. Чакаецца, што ў 2019 годзе на знешнія рынкі завод будзе пастаўляць прадукцыі на 7,7 мільёна долараў.

— Пытанні лекавага забеспячэння з'яўляюцца прыярытэтнымі для эканомікі нашай краіны. Мы зацікаўленыя ў тым, каб сумесна з індыйскімі інвестарамі выраблядь шырокую наменклатуру лекавых прэпаратаў, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Беларусь у гэтым плане добрая пляцоўка і для выхаду на рынак краін Еўразійскага эканамічнага саюза.

У сваю чаргу Раджыў Нанапанэні адзначыў высокі ўзровень рэалізацыі праекта і выказаў упэўненасць у далейшым паспяховым супрацоўніцтве з Беларуссю. Ён падкрэсліў, што «Натка Фарма Лімітэд» з'яўляецца адным з сусветных лідараў па вытворчасці прэпаратаў для лячэння анкалагічных захворванняў і вядучым вытворцам у гэтым сегменце ў Індыі.

— Я ўпэўнены, што мы можам забяспечыць Беларусь прэпаратамі высокай якасці па даступных цэнах. Мы рады развіваць тут свой бізнес і пазітыўна ацэньваем далейшыя перспектывы, — падкрэсліў ён.

Дарэчы, у Беларусі рэалізуюцца тры інвестыцыйныя праекты з індыйскімі фармацэўтычнымі кампаніямі — у Бешанковічах Віцебскай вобласці, Скідзелі Гродзенскай вобласці і Калядзічах Мінскай вобласці.

# ПЯТАЯ З СЯМНАЦЦАЦІ

## Жаночая салідарнасць і падтрымка прадпрымальніц прыгожага полу — аспекты ў рэалізацыі МУР

**Сусветная супольнасць пад эгідай ААН сёння працуе над дасягненнем устойлівага развіцця, якое складаецца з 17 мэт. Наша краіна таксама ўключана ў гэту дзейнасць і распрацоўвае Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця краіны на перыяд да 2035 года. Дзейнасць па рэалізацыі пятай глабальнай мэты (датычыцца пытанняў гендарнага раўнапраўя) абмеркавалі на форуме «Актуальныя напрамкі гендарнай палітыкі ў кантэксце Мэт устойлівага развіцця». Удзел у мерапрыемстве прыняла Мар'яна ШЧОТКІНА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР), кіраўнік грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».**




Падчас размовы з журналістамі віцэ-спікер Савета Рэспублікі адзначыла, што мерапрыемства дае магчымасць для сумеснай работы прадстаўнікам розных супольнасцяў.

«Я разглядаю сённяшнюю пляцоўку больш шырока, таму што і грамадзянская супольнасць, і прадстаўнікі парламента, і дзяржаўнага кіравання — усе сабраліся для таго, каб абмеркаваць тэматыку. Гэта пятая мэта ўстойлівага развіцця — без актыўнага ўдзелу жанчын не можа быць развіцця дзяржавы, — лічыць Мар'яна Шчоткіна. — Сёння мы павінны расставіць акцэнты і паглядзець, якімі шляхамі мы павінны ісці не толькі праз заканапраектную дзейнасць і праз кіраўніцтва рашэнні, але і па гарызантальных сувязях: гэта грамадскія аб'яднанні, грамадзянская супольнасць. Вертыкальныя сувязі, як паказвае вопыт, усё роўна не заўсёды рэфармуюцца, а гарызантальныя сувязі, якія звязваюць людзей на прафесійнай аснове, забяспечваюць чалавечыя адносіны, будуюцца на даверы, яны вельмі моцныя».

Асаблівую ўвагу нацыянальны каардынатар МУР звярнула на абмеркаванне пытання жаночай салідарнасці і ўзаемадапамогі. «Дэ-юрэ ўсе правы ў жанчын ёсць. Яны замацаваны ў заканадаўстве. Але механізмы рэалізацыі гэтых магчымасцяў часам сутыкаюцца з пэўнымі стэрэатыпамі, якія мы разам павінны разбураць. Канешне, у гэтым вялікую падтрымку жанчыны могуць аказаць адна адной. Калі ідзе самарэалізацыя паспяховага чалавека, жанчыны ў тым ліку? Гэта, па-першае, пры ўнутранай матывацыі, рэалізацыі ўнутранага патэнцыялу. Гэта і адукацыя, імкненне да новых ведаў і магчымасць павышаць кваліфікацыю, сумяшчаць прафесіянальныя і сямейныя абавязкі і мужчыну, і жанчыне. І, канешне, гэта падтрымка», — упэўнена яна.

Адзін з прыкладаў такой дапамогі — праект «Жаночая справа» БелБрэнда і Беларускага саюза жанчын, якія пачаўся ў верасні. Падчас яго паспяховыя жанчыны-прадпрымальніцы, удзельніцы БСЖ і Клуба прадпрымальнікаў сталі ментарамі для бізнесвуман-пачаткоўцаў. Усяго ўдзельніцы прадставілі 17 праектаў. «Гэта стартапы розных кірункаў, якія атрымалі магчымасць бясплатнага абучэння, атрымання кансультацый і падказак, як рэалізаваць свой бізнес», — падкрэсліла намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

Сенатар акцэнтавала ўвагу на неабходнасці стварэння ўмовы, каб жанчына не выбірала паміж сям'ёй і кар'ерай. «Трэба дапамагаць, перш за ўсё, праз развіццё сямейных інтарэсаў, умацаванне сям'і, медыяцыю, якая зараз ідзе і падчас судовых разбораў пры разводах. Гэта і дзіцячыя дашкольныя ўстановы рознага фармату і тыпу, ясельныя групы, каб магчыма было аддаць дзіця ў надзейныя рукі ў больш раннім узросце, гэта гібкія рабочыя графікі, магчымасць дыстанцыйнай дзейнасці. Гэта ўсё ў комплексе — прапановы саміх жанчын. І мы павінны ўсё абмеркаваць, прапанаваць, калі патрэбна, унесці змяненні ў нарматыўна-прававыя акты і ўсяляк садзейнічаць таму, каб роля жанчын толькі ўзрастала», — заключыла Мар'яна Шчоткіна.

**Марыя ДАДАЛКА.**

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

**У ліпені ў Санкт-Пецярбургу пройдзе VI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Ён збярэ прадстаўнікоў дзяржорганаў, бізнесу, навукі, адукацыі, грамадскасці, якія абмяркуюць шырокае кола пытанняў саюзнага будаўніцтва. Аб задачах і парадку маючага адбыцца форуму расказаў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч.**

***— Пленарнае пасяджэнне VI Форуму будзе прысвечана культурнаму і гуманітарнаму супрацоўніцтву Беларусі і Расіі. Наколькі гэта тэма важная для паглыблення беларуска-расійскіх адносін?***

— Беларусь і Расію з даўніх часоў звязваюць агульныя духоўныя каштоўнасці і традыцыі. Каля вытокаў агульнай духоўнай прасторы стаялі вядомыя беларускія асветнікі Францыск Скарына, Ефрасіння Полацкая, Сімяон Полацкі. Яны ўнеслі важкі ўклад ва ўмацаванне ўсходнеславянскага культурнага адзінства. Сёння мы абмяркоўваем не толькі, як захаваць нашу агульную гісторыка-культурную спадчыну, але і як далучыць да яе моладзь. Гэта вельмі важны элемент інтэграцыі.

Мы абавязаны цаніць агульнасць нашых культур, традыцый, паважлівае стаўленне грамадзян Беларусі і Расіі адно да аднаго. Гэта тое багацце, якое нельга дэвальваваць, каб дагадзіць чамусьці не да канца, можа, зразумеламу, кідкаму, інвазіўнаму па сутнасці.

Для ўмацавання міжкультурных сувязяў, фарміравання адзінай культурнай прасторы ў рамках Саюзнай дзяржавы многае ўжо зроблена. Вышэйшыя навучальныя ўстановы ў сферы культуры маюць больш за 40 дагавораў і пагадненняў з ВНУ-партнёрамі Расійскай Федэрацыі. Напрыклад, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў супрацоўнічае з Санкт-Пецярбургскім, Маскоўскім, Алтайскім, Казанскім дзяржаўнымі інстытутамі культуры, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі — з Маскоўскай, Санкт-Пецярбургскай, Растоўскай, а таксама Расійскай акадэміяй музыкі імя Гнесіных, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў — з Усерасійскім дзяржаўным інстытутам кінематаграфіі імя С. А. Герасімава, Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным акадэмічным інстытутам жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Я. Рэпіна, Сібірскім дзяржаўным інстытутам мастацтваў імя Д. Хварастоўскага. І гэта далёка не ўсе прыклады.

# Форум рэгіёнаў стаў добрай пляцоўкай для прасоўвання сумесных праектаў Беларусі і Расіі

Ідзе актыўны абмен творчымі калектывамі, праводзяцца сумесныя фестывалі мастацкай творчасці, выстаўкі твораў мастацтва, майстар-класы для адораных дзяцей. Штогод праходзіць каля тысячы культурных мерапрыемстваў, у тым ліку міжнароднага ўзроўню: усім вядомы фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне», свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы», Шагалаўскія дні, музычны фестываль імя І. І. Салярцінскага і іншыя.

Сумесныя праекты рэалізуюць таксама тэатры, музеі, бібліятэкі. Так, Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр супрацоўнічае са Смаленскім, Тульскім, Калужскім, Стаўрапольскім драматычнымі тэатрамі. 2019 год у Расіі абвешчаны Годам тэатра, у сувязі з гэтым у Мінску пройдуць гастролі вядучых расійскіх рэгіянальных тэатраў. Здымаюцца беларуска-расійскія мастацкія і дакументальныя фільмы. Добры інструмент падтрымкі культурных праектаў — сумесныя прэміі ў галіне літаратуры і мастацтва, навукі, сродкаў масавай інфармацыі.

***— Гэтак жа эфектыўна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой навучальныя ўстановы дзвюх краін?***

— Калі гаварыць пра гуманітарнае супрацоўніцтва, то ў гэтай галіне нашы краіны сапраўды зрабілі сур'ёзныя крокі насустрач адна адной. Як вынік, сфарміравана і паспяхова развіваецца адзіная адукацыйная прастора, у якой моладзь Беларусі і Расіі мае роўныя правы па доступе да атрымання якаснай адукацыі. Адпаведная заканадаўчая і прававая база сфарміравана як на нацыянальных, так і на міжведамасных узроўнях.

Сёння беларускія ВНУ маюць каля 1300 дагавораў і пагадненняў аб супрацоўніцтве з установамі вышэйшай адукацыі Расіі. Расіяне вучацца ў беларускіх ВНУ, у тым ліку за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, і атрымліваюць дыпломы, якія прызнаюцца ў Расіі. У беларусаў у Расіі аналагічныя магчымасці. Акрамя таго, працуе сумесны Беларуска-Расійскі ўніверсітэт у Магілёве, дзе студэнты могуць навучацца як па беларускіх, так і па расійскіх адукацыйных стандартах. Ажыццяўляецца абмен студэнтамі, паміж рэгіёнамі дзейнічае мноства партнёрскіх на-



вучальных праграм. Ідзе абмен і педагогамі: толькі за 2018 год каля 800 беларускіх выкладчыкаў наведалі ўніверсітэты Расіі, прыкладна столькі ж расійскіх педагогаў прынялі беларускія ВНУ.

***— Важнай часткай маючага адбыцца саміту стане Маладзёжны форум. Чаму маладзёжнай тэматыцы ўдзяляецца так шмат увагі? Наколькі гэта важна для інтэграцыі?***

— Маладзёжны форум — гэта запатрабаваная і перспектыўная пляцоўка. У маладзёжных кантактах — будучыня нашага супрацоўніцтва. Неабходна паўсюдна падтрымліваць найлепшыя ініцыятывы і прапановы моладзі, каб у далейшым яны перарасталі ў перспектыўныя праекты — у навуцы, адукацыі, бізнесе. Маладзёжная палітыка — найважнейшы прыярытэт Саюзнай дзяржавы. Саюзныя адносіны будуць трывалыя, калі стварыць умовы для раскрыцця і рэалізацыі творчага патэнцыялу маладых людзей, іх прафесійнага і асабістага росту. На гэта нацэлены нашы культурныя, адукацыйныя, навуковыя праекты.

У той жа час патрэбны і новыя формы ўзаемадзеяння. Важна, каб маладыя людзі нашых краін ведалі адно пра аднаго, мелі інфармацыю аб тым, якія мерапрыемствы праводзяцца, калі і як можна сустрэцца, абмяняцца вопытам, і што самае галоўнае — як можна аб'яднацца ў рамках таго ці іншага праекта. Для гэтага неабходна больш эфектыўна выкарыстоўваць сацыяльныя сеткі, тэлеграм-каналы.

Важна таксама развіваць маладзёжны турызм, арганізоўваць абмен школьнікамі, студэнтамі, праводзіць для іх цікавыя мерапрыемствы. Так маладыя людзі атрымліваюць магчымасць не толькі вывучаць славутасці нашых краін, нашу агульную гісторыю, але і лепш спазнаваць адно аднаго, заводзіць новых сяброў. Пакуль карысная інфармацыя аб такіх мерапрыемствах нашай моладзі не хапае.

Хацелася б, каб у цэлым інфармаванне аб сумесных праектах у сродках масавай інфармацыі вялося больш шырока, каб людзі ведалі пра тое, якая работа вядзецца ў Саюзнай дзяржаве, якія вынікі яна дае і чым важная для кожнага з нас.

***— Як вы ацэньваеце эфектыўнасць рэалізацыі саюзных праграм. Ці маюць патрэбу ў пераглядзе падыходы да іх распрацоўкі і ўзгаднення, бо не сакрэт, што гэту тэму ўзнімаюць самі навукоўцы?***

— Вы закранулі вельмі важнае пытанне. Саюзныя праграмы павінны адпавядаць прыярытэтам унутранай і знешняй палітыкі Саюзнай дзяржавы, працаваць на будучыню нашых краін, забяспечваць канкурэнтаздольнасць нацыянальных эканомік, іх інавацыйнае развіццё.

Не заўсёды нашы сумесныя праграмы прымаюцца своечасова. Працэс узгаднення часцяком зацягваецца, залішні бюракратызм прыводзіць да таго, што праекты пачынаюць страчваць актуальнасць. Ёсць пытанні і па эфектыўнасці расходавання сродкаў. Саюзны бюджэт выконваецца з прафіцытам, добрых праектаў не хапае. Узнікае пытанне: чаму? Дзе тут недапрацоўваем? Ідэй у навукоўцаў хапае. Тады з якой прычыны не заўсёды могуць іх дастойна прадставіць, дакладна прапрацаваць праграму, каб прыцягнуць фінансаванне? Або патрабаванні занадта завышаныя?

Доля выдаткаў на фінансаванне сумесных праграм у бюджэце Саюзнай дзяржавы апошнія гады зніжаецца. Калі ў 2015 годзе яна складала 65,4 %, у 2016 годзе — 61,3 %, у 2017-м — толькі 56,6 %. У 2018 годзе сітуацыя прынцыпова не змянілася: доля праграм — 56,7 %. Калі ў 2016 годзе аб'ём неразмеркаваных сродкаў бюджэту Саюзнай дзяржавы склаў 244,4 мільёна рублёў, то ў 2017-м — ужо 749,3 мільёна рублёў, або кожны шосты рубель ад запланаваных выдаткаў. І гэта на фоне адносна высокіх працэнтных ставак па крэдытах, якія прадпрыемствы рэальнага сектара эканомікі пазычаюць у банкаўскай сістэмы для мадэрнізацыі і рашэння мэтавых задач развіцця.

Дадзеныя пытанні будзем падрабязна абмяркоўваць падчас маючага адбыцца форуму з удзелам зацікаўленых дзяржорганаў і ведамстваў. У гэтым плане пляцоўка форуму — добрая магчымасць пачуць усе бакі, знайсці аптымальныя варыянты рашэнняў. Умовы для паспяховай рэалізацыі сумесных праграм у нас ёсць: Вышэйшым дзяржсаветам Саюзнай дзяржавы вызначаны прыярытэты навуковай дзейнасці, у цесным кантакце працуюць нашы навуковыя калектывы, якія маюць багаты досвед і неабходную кампетэнцыю, актыўна генерыруе ідэі моладзь.

***— Якім кірункам супрацоўніцтва, па-вашаму, нашым краінам неабходна ўдзяляць больш увагі?***

— Гэта прамысловая кааперацыя, стварэнне сумесных кампаній і вытворчасцяў, арыентаваных на выпуск канкурэнтаздольнай інавацыйнай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, якая запатрабавана на ўнутраным і знешніх рынках. Нам трэба больш актыўна пераходзіць ад простага гандлю да інвестыцыйнага супрацоўніцтва, у якасці партнёраў пры неабходнасці прыцягваць і трэція краіны.

Сумесныя вытворчасці — гэта новыя тэхналогіі, новыя рабочыя месцы, усё гэта ў канчатковым выніку працуе на павышэнне якасці жыцця людзей. Пры гэтым павінны забяспечвацца роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання, без выключэнняў і абмежаванняў. Пакуль бар'еры ў гандлі застаюцца. Гэтыя важныя для нашых краін пытанні стануць прадметам абмеркавання нацыянальных саветаў Беларусі і Расіі па дзелавым супрацоўніцтве на форуме.

Мяркую, што нашым краінам трэба больш увагі ўдзяляць пытанням супрацоўніцтва ў сферы лічбавізацыі, укаранення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. У Расіі зацверджана нацыянальная праграма да 2025 года, якая прадугледжвае стварэнне неабходных умоў для развіцця лічбавай эканомікі і яе інтэграцыі з лічбавымі эканомікамі краін-партнёраў па Еўразійскім эканамічным саюзе. Дакумент накіраваны на стварэнне высокатэхналагічных прадпрыемстваў і вытворчасцяў, развіццё «разумных гарадоў», укараненне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у прамысловасці, адукацыі, медыцыне, жыллёва-камунальнай гаспадарцы і іншых сферах.

У Беларусі прыняты Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 8, створаны беспрэцэдэнтныя ўмовы для росту IT-індустрыі. У нас ёсць кваліфікаваныя кадры і неабходная кампетэнцыя. Ёсць чым падзяліцца з расійскімі калегамі і што пераняць. Гэта датычыцца як падрыхтоўкі кадраў, так і пытанняў укаранення IT-тэхналогій у розных галінах эканомікі. Мяркую, нашы краіны маглі б аб'яднаць намаганні, магчыма, у рамках новай саюзнай праграмы па лічбавізацыі.

> Сумесныя вытворчасці — гэта новыя тэхналогіі, новыя рабочыя месцы, усё гэта ў канчатковым выніку працуе на павышэнне якасці жыцця людзей. Пры гэтым павінны забяспечвацца роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання, без выключэнняў і абмежаванняў.

Трэці кірунак — гэта ўзаемадзеянне Беларусі і Расіі ў рамках глабальнай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях». Нашы краіны з'яўляюцца важнымі звёнамі Вялікага шаўковага шляху і па напрамку не толькі Усход — Захад, але і Поўнач — Поўдзень. Асаблівая ўвага аддаецца развіццю чыгуначных кантэйнерных перавозак. У красавіку 2017 года чыгункі Кітая, Расіі, Беларусі, Казахстана, Германіі, Польшчы і Манголіі падпісалі пагадненне аб паглыбленні супрацоўніцтва ў арганізацыі кантэйнерных цягнікоў па маршруце Кітай — Еўропа. Бакі дамовіліся аб сумесным павелічэнні аб'ёмаў перавозак, стварэнні аб'ектаў лагістычнай інфраструктуры. Беларусь зацікаўлена ў супрацоўніцтве з расійскім бокам у рамках гэтай міжнароднай ініцыятывы і гатова абмяркоўваць канкрэтныя праекты, у тым ліку з удзелам Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

***— Як вядома, да форуму рыхтуецца вялікі партфель дакументаў: дагаворы, кантракты, пагадненні. У колькі ацэньваеце іх агульную суму?***

— Гаварыць пра дакладныя лічбы пакуль рана, работа працягваецца. Але большасць рэгіёнаў Беларусі прыбаўляюць да леташніх аб'ёмаў.

У цэлым з кожным годам колькасць падпісаных на форуме камерцыйных кантрактаў і пагадненняў расце: калі на II Форуме ў Сочы было заключана такіх дакументаў на суму 230 мільёнаў долараў ЗША, то на V Форуме ў Магілёве — амаль на 540 мільёнаў долараў ЗША. Гэта сведчыць аб запатрабаванасці пляцоўкі нашага саміту і высокай зацікаўленасці прадстаўнікоў бізнесу ў супрацоўніцтве.

Рост — гэта добра. Але мы павінны больш гаварыць не пра колькасць, а пра якасць. Я вяду гаворку пра ўзаемны гандаль высокатэхналагічнымі таварамі і паслугамі, каб гэтыя кантракты матывавалі павышэнне канкурэнтаздольнасці нашых эканомік, пашырэнне прамысловай кааперацыі.

***— Якія пагадненні рыхтуюцца ў галіне рэгіянальнага супрацоўніцтва?***

— У рабоце знаходзіцца больш за 50 дакументаў аб супрацоўніцтве. У іх ліку — міжурадавыя пагадненні са Смаленскай, Саратаўскай, Наўгародскай, Ліпецкай, Магаданскай абласцямі, Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругай, Рэспублікай Інгушэція, Рэспублікай Комі, Рэспублікай Адыгея і іншымі. Рыхтуюцца таксама да заключэння дакументы аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі, мясцовымі органамі ўлады, а таксама канкрэтнымі арганізацыямі і ўстановамі Беларусі і Расіі.

***— Міхаіл Уладзіміравіч, ці не здаецца вам мэтазгодным у арэале форуму стварыць пляцоўку для экспертнага абмеркавання пытанняў беларуска-расійскага супрацоўніцтва, у якім бы прынялі ўдзел вядомыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы з абодвух бакоў? Больш за тое, яны маглі б павесці канструктыўны дыялог з моладдзю. Як лічыце?***

— Такая пляцоўка будзе працаваць. Да дыскусій у рамках форуму шырока падключацца эксперты. Гэта будзе своеасаблівая сесія экспертаў-аналітыкаў па пытаннях развіцця Саюзнай дзяржавы, еўразійскай інтэграцыі, супрацоўніцтва Беларусі і Расіі з трэцімі краінамі. Безумоўна, да абмеркавання будзе прыцягваецца і моладзь, у тым ліку прадстаўнікі Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі.

Пры ўсёй павазе да аксакалаў, іх вопыту і ведам, мы абавязаны чуць моладзь. Гэта для яе фарміруецца нарматыўная прававая база беларуска-расійскага супрацоўніцтва, гэта для яе ствараюцца высокаінтэлектуальныя, навукаёмістыя вытворчасці і тэхналогіі, выбудоўваюцца сучасныя камунікацыі, у тым ліку ў IT-індустрыі. Пра гэта і не толькі будзем гаварыць і прымаць рашэнні на VI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

## Дзеля развіцця транспартнага патэнцыялу

**На гэтым тыдні пад кіраўніцтвам старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра Папкова адбылася нарада па пытаннях арганізацыі і правядзення навукова-практычнай канферэнцыі на тэму «Аб развіцці транспартнага патэнцыялу і мадэрнізацыі транспартнай інфраструктуры Саюзнай дзяржавы».**

Як паведамляе сайт верхняй палаты беларускага парламента, мерапрыемства запланавана ў рамках падрыхтоўкі да пасяджэння Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве, якое пройдзе ў ліпені 2019 года ў Санкт-Пецярбургу падчас VI Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Удзельнікі нарады разгледзелі перспектыўныя кірункі развіцця і эфектыўнага функцыянавання транспартнага комплексу Беларусі і Расіі.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Гусакоў, міністр транспарту і камунікацый Аляксей Аўраменка, начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір Марозаў, члены Бюро Прэзідыума і кіраўнікі шэрагу навуковых устаноў і інстытутаў НАН Беларусі, работнікі міністэрстваў і іншыя.

# Ад ямачнага рамонту

### Адзін да пяці

У нашай краіне скарэктавана Дзяржаўная праграма па развіцці і ўтрыманні аўтамабільных дарог на 2017—2020 гады. Адпаведную пастанову падпісаў Савет Міністраў.

Мэтай Дзяржаўнай праграмы з'яўляецца паляпшэнне якасных паказчыкаў аўтамабільных дарог агульнага карыстання. Згодна з дакументам, праграма складаецца з двух раздзелаў, дзе падзелена фінансаванне рэспубліканскіх і мясцовых аўтамабільных дарог. Усяго на дарожную гаспадарку краіны плануюць выдзеліць пяць мільярдаў 411 мільёнаў рублёў.

На развіццё і ўтрыманне рэспубліканскіх аўтамабільных дарог пойдзе чатыры мільярды рублёў. Не менш за 10 % сродкаў будзе накіравана на ўтрыманне мастоў і пуцеправодаў. Праграмай прадугледжаны рэканструкцыя і ўзвядзенне 415,9 кіламетра рэспубліканскіх аўтамабільных дарог, у тым ліку 276,2 кіламетра дарог па параметрах I катэгорыі з давядзеннем іх да міжнародных стандартаў. Прадугледжваецца павялічыць хуткасны рэжым на працягу не менш як 1617 кіламетраў рэспубліканскіх аўтамабільных дарог.

Акрамя таго, Дзяржаўнай праграмай прадугледжана пашырэнне сеткі платных аўтамабільных дарог. Будзе ўведзена плата за праезд транспартных сродкаў на ўсім працягу дарогі М6/Е28 Мінск—Гродна—мяжа Польшчы (Брузгі) пасля яе рэканструкцыі і на ўчастку дарогі Р28 Мінск—Маладзечна—Нарач. Да 2021 года працягласць платных аўтамабільных дарог складзе 1786 кіламетраў.

На рэканструкцыю, рамонт і ўтрыманне мясцовых аўтамабільных дарог плануюць выдзеліць 1,4 мільярда рублёў. Гэтыя сродкі пойдуць у тым ліку на рамонт і рэканструкцыю не менш як сем тысяч кіламетраў мясцовых аўтамабільных дарог. Запланавана правесці бягучы рамонт 6 тысяч 384 км дарог, капітальны рамонт — 581,3 кіламетра дарог, рэканструкцыю і будаўніцтва — 34 кіламетраў дарог.

Таксама будуць адрамантаваныя 1 тысяча 589 пагонных метраў мастоў і пуцеправодаў, праведзены капрамонт 627,6 пагоннага метра мастоў і пуцеправодаў, прадугледжваецца рэканструяваць і ўзвесці 718,3 пагоннага метра мастоў і пуцеправодаў.

### Амаль чатыры мільёны — на раён

Усяго плануецца выдзеліць сёлета на рамонт

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

## НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

## Грамадскія саветы вызначаць прыярытэты

**Якім чынам ажыццяўляецца мясцовае кіраванне і самакіраванне ў Рэспубліцы Беларусь — не на паперы, а ў рэальным жыцці? Члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце выехалі ў Светлагорскі раён, што на Гомельшчыне, і пацікавіліся практыкай прымянення профільнага Закона. Дарэчы, ён быў прыняты ў 2010 годзе і цяпер, кажа старшыня камісіі Леанід ЦУПРЫК, размова ідзе аб удасканальванні заканадаўчага акта.**

— У законе выразна падзелены паўнамоцтвы галін улады, але жыццё працягваецца.

У наш час мы рыхтуем змены ў закон, і важна пабачыць і пачуць тое, чым жывуць людзі ў глыбінцы. Наколькі мясцовыя сельвыканкамы аказваюць садзейнічанне сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёна? Мы бачым, што нават ва ўмовах даволі абмежаваных рэсурсаў сёння шмат робіцца для таго, каб грамадзяне жылі камфортна. Між тым мы мала карыстаемся магчымасцю аб'яднання ў асацыяцыі для вырашэння агульных мэт. Можа, нам трэба было б у населеных пунктах абіраць, акрамя старасты, яшчэ і грамадскія саветы? У іх увайшлі б людзі найбольш паважаныя, здольныя аналітычна думаць. Перад імі стаяла б задача — вызначыць прыярытэты развіцця канкрэтнага населенага пункта. Напрыклад: будаваць дарогу, гарадок для дзяцей ці гандлёвы пункт? Дарэчы, старшыні саветаў маглі б аб'ядначца ў рэгіянальны савет. Гэта адзін з варыянтаў эфектыўнай работы на месцах, які мы прапрацоўваем.

Леанід Цупрык агучыў яшчэ адзін кірунак развіцця на вёсцы, які б мог пасадзейнічаць замацаванню людзей там, дзе яны нарадзіліся. Ён лічыць, што людзям важна даць магчымасць зарабляць грошы па месцы пражывання, а ўладам спрыяць таму, каб яны мелі нейкія малыя сродкі вытворчасці:

— Каб, напрыклад, сям'я ці некалькі сем'яў аб'ядналіся і перапрацоўвалі разам бульбу ці гародніну — на сертыфікаваным абсталяванні, што дазволіла б накіроўваць гэту прадукцыю ў гандлёвыя сеткі. У спадчыну падрастаючаму пакаленню даставаліся б не толькі дом і зямля, але і сродкі вытворчасці, уласнасць, якая стварае прыбытак. Гэта б умацоўвала сямейныя адносіны і жаданне жыць і працаваць на сваёй зямлі.

І яшчэ адну праблему Леанід Аляксандравіч агучыў як поле для абмеркавання. Размова пра ўзгадненне нормаў, звязаных з добраўпарадкаваннем і прывядзеннем у належны санітарны стан не толькі тых земляў, якія знаходзяцца ў валоданні ўласнікаў ці адведзены прадпрыемствам і арганізацыям, але і прылеглых тэрыторый:

— Гаворка ідзе аб утрыманні ў прыдатным становішчы прылеглых зямельных участкаў за кошт прадпрыемстваў, арганізацый і грамадзян. Ці трэба нам такую норму замацоўваць у законе? Як гэта будзе адбывацца? Якая можа быць рэакцыя насельніцтва? Тут узнікае шмат спрэчных пытанняў па ўдзеле ў гэтым працэсе шараговых жыхароў — уладальнікаў уласных дамоў, дачных таварыстваў, кааператываў і калектываў індывідуальных забудоўшчыкаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ГАСПАДАРСКІ ПАДЫХОД

**Праз пасёлак Парычы ў Светлагорскім раёне праходзіць рэспубліканская траса Р82. Менавіта на ёй цяпер адбываюцца рамонтныя работы. У гэты ж час мясцовыя дарогі толькі нядаўна набылі гаспадара.**

**Старшыня Парыцкага сельскага Савета дэпутатаў Аляксандр ЦАЛКО** расказвае, што летась пасля звароту грамадзян і з дапамогай мясцовых улад агульнымі намаганнямі зрабілі добраўпарадкаванне Майскай плошчы — у цэнтры Парычаў. Там да юбілею пасёлка часткова паклалі асфальт. На гэтыя мэты былі выкарыстаны і сродкі, зароблены падчас суботніка. Між тым грошай, каб адрамантаваць плошчу цалкам, не хапіла.

— Цяпер дарогі мясцовага значэння будуць рамантаваць спецыялісты, — радуецца Аляксандр Фёдаравіч. — А дарогі нашага гарадскога пасёлка знаходзяцца на абслугоўванні камунальных службаў. Мы з імі цесна супрацоўнічаем і імкнёмся папярэдзіць скаргі. Вядуцца паступова рамонтныя работы. Канешне, складана з новым пакрыццём асфальтам, але ж робіць ямачны рамонт, а грунтавыя дарогі грэйдзіруюцца мінімум раз у квартал, а бывае і часцей.

У суседнім Чыркавіцкім сельсавеце таксама задаволены, што сёлета ўсе дарогі перададзены на баланс мясцоваму ДРБУ-207 — філіялу КПРБУП «Гомельаблдарбуд».

— Добра, што хоць гаспадар вызначыўся, — адзначае **старшыня Чыркавіцкага сельсавета Уладзімір ЛАХАРДАЎ.** — Але пакуль фінансаванне не выдзелена, яшчэ будзем пакутаваць. Да гэтага года некаторыя дарогі ўвогуле ні на чыім балансе не знаходзіліся. Ніхто не хацеў ні рамантаваць, ні грэйдзіраваць, ні чысціць. Звычайна рабіць усё гэта дапамагала мясцовая гаспадарка.

Між тым у невялікім і кампактным Светлагорскім раёне каля 700 кіламетраў дарог мясцовага значэння. Па сутнасці, гэта вуліцы ў населеных пунктах. Цяпер яны перайшлі ў абласную ўласнасць. Таму імі будуць займацца раённыя структуры камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельаблдарбуд».



**Жыхары ў Парычах з вецярком перамяшчаюцца на жалезных конях.**

— Бягучы рамонт ужо ажыццяўляецца — праводзіцца грэйдзіраванне ці ямачны рамонт, — растлумачвае **намеснік старшыні Светлагорскага райвыканкама Дзмітрый ШАБЕТНІК.** — А больш сур'ёзныя пытанні — у адпаведнасці з іх планамі. Прэм'ер-міністр Сяргей Румас, які быў нядаўна ў Светлагорску, даў даручэнне Гомельскаму аблвыканкаму сёлета зрабіць капітальны рамонт на трох сур'ёзных артэрыях горада — вуліцах Свярдлова, Авіяцыйнай і Шашэйнай... Але фінансавання на гэта пакуль няма. Няма і сур'ёзнай праграмы, якая дазволіла б бачыць перспектывы развіцця дарожнай сеткі на некалькі гадоў. У любым выпадку пастаўленую задачу трэба выконваць. Скаргі, якія ўзнікаюць па стане дарог, канешне, мы здымаем — рэагуем на самыя вострыя праблемы. Але ж капітальна сёлета адрамантавалі толькі адну дарогу — да аграгарадка Дуброва ў Мікалаеўскім сельсавеце. Глабальна праблему можна вырашыць толькі выдзяленнем нейкіх сур'ёзных сродкаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

## РАШЭННІ

# «МАГІСТРАЛЬНЫЯ» ПРАЕКТЫ

### Дзе мясцовыя ўлады знаходзяць сродкі для рамонту дарог

**У сітуацыі, калі бюджэтных сродкаў недастаткова, улады Гродзенскага раёна шукаюць іншыя шляхі. Аказалася, што перспектывы ёсць. Вось ужо некалькі гадоў, як раён плённа супрацоўнічае з польскімі партнёрамі па добраўпарадкаванні памежных тэрыторый. Два «дарожныя» праекты завяршыліся некалькі гадоў таму, цяпер на чарзе яшчэ чатыры.**

Гродзенскі рэгіён мае выгаднае геаграфічнае становішча і шырокую сетку памежных пунктаў пропуску, што спрыяе наладжванню сувязяў з польскімі партнёрамі. Найбольшы рух, вядома, на аўтамагістралях. Таму папулярнымі становяцца праекты, якія дапамагаюць развіваць транспартную інфраструктуру.

У рамках праграмы «Польшча — Беларусь — Украіна» ўжо рэалізавана два праекты на суму 2,4 мільёна рублёў. За гэтыя сродкі адрамантавана 18 кіламетраў дарожнага палатна. Гэта два ўчасткі дарог, адзін з якіх вядзе непасрэдна да польскай мяжы, другі — да Аўгустоўскага канала. Таксама ўстаноўлены павільёны на прыпынках, добраўпарадкаваны адхоны і з'езды. На прадпрыемстве «Гродна-аблдарбуд» расказалі, што траса стала шырэйшая, поўнасцю перакладзена асфальтабетонная пакрыццё.

Сельскія ўлады сочаць за парадкам на прыдарожных палосах. Работнікі па азеляненні вядуць санітарную ачыстку, назіраюць, каб не былі пашкоджаны шыльды і знакі.

Сёлета Гродзенскі раён працягвае «дарожную» тэму. На чарговы этап праграмы было заяўлена ажно восем праектаў. І хоць канкурэнцыя атрымалася даволі вялікая, гродзенцы са сваімі польскімі партнёрамі змаглі «абараніць» чатыры праекты.

Як адзначыў **старшыня Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў Ігар ЛЯБЕЦКІ,** усе яны датычацца паляпшэння ўчасткаў дарог, што вядуць на Аўгустоўскі канал ці знаходзяцца паблізу. Агульная працягласць — каля 30 кіламетраў.

Новы турыстычны брэнд гродзенцаў, Аўгустоўскі канал, прывабны для замежнікаў, у першую чаргу польскіх турыстаў. Садзейнічае пашырэнню сувязяў і бязвізавая зона канала. Таму важна, каб дарогі тут былі ў добрым стане.

Агульны бюджэт беларускага боку — амаль чатыры мільёны еўра. Па ўсіх праектах атрыманы першыя траншы, якія ўжо засвоены. Як растлумачыў Ігар Лябецкі, сродкі пайшлі на будаўніцтва дарог, набыццё новай тэхнікі, інфармацыйных знакаў. У наваколлі людзі купляюць участкі, ствараюць аграсядзібы. Добрыя дарогі даюць штуршок развіццю ініцыятыў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 91

Легендарны гросмайстар, чатырохразовы чэмпіён свету Анатоль Гантварг стаў пераможцам традыцыйнага, 22-га па ліку, міжнароднага турніру па шашках-100 у Салоу (Іспанія), у якім бралі ўдзел 123 шашысты. Прадстаўнік Беларусі здолеў апярэдзіць шматразовых чэмпіёнаў свету расіян Аляксандра Шварцмана і Аляксандра Георгіева, а таксама шэраг іншых гросмайстраў.

У заліку сярод жанчын прадстаўніца нашай краіны міжнародны гросмайстар Ірына Пашкевіч стала другой (14-е месца ў агульным заліку).

Паглядзіце цікавыя фрагменты гульні спаборніцтваў.

**№ 47** Д. Марыненка — А. Гантварг.

**Белыя простыя шашкі:** 16, 26, 27, 28, 33, 35, 38, 43, 50 (9)

**Чорныя простыя шашкі:** 1, 9, 13, 17, 18, 19, 24, 29, 34 (9)

Гросмайстар, які гуляў чорнымі, правёў камбінацыю і атрымаў выйграную пазіцыю 4х4. Пакажыце ўдар.

У наступным выпуску мы плануем пачаць конкурс на найлепшае рашэнне шашачных кампазіцый, у якім чытачы змогуць пазмагацца за прызы і выканаць спартыўныя разрады па шашках. А сёння для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі нашага чытача з Мінска Аляксандра Рэмізава.

**№ 48**




**Белыя простыя шашкі:** g3, b4, h4, e5

Белыя дамкі: e1(5)

**Чорныя простыя шашкі:** d2, c3, e3, a5, c7, g7 (6)

**№ 49**

**Белыя простыя шашкі:** b4, c5, g5

Белыя дамкі: g1 (4)

**Чорныя простыя шашкі:** d2, c3, g3, a5, e5, e7 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Анонс:** XXXII міжнародны турнір па шашках-100 «Мінск-2019» адбудзецца з 1 да 7 ліпеня.

## Праверце свае рашэнні

**выпуск № 90 ад 07.06.2019.**

№ 45 8.9.32.37.1.25.5+

№ 46 fe7.d2.d8.e1(b6A) d4.d8A(f2)d6+

Дакладныя адказы даслалі:

В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна);

Ф. Карпей (Мядзел);

У. Статкевіч (п. Зялены Бор Івацэвіцкага раёна);

У. Панько (Камянец);

І. Ананіч (Гродна);

А. Шурпін (Івянец);

В. Ваўчкоў (Маладзечна);

П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў, А. Рэмізаў (усе Мінск);

В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён);

В. Бандарык (Мінскі раён);

С. Рашэцін (Ашмяны).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, e-mail: info@zviazda.by, або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**






## Тэлесеткі

# ДУША НАРОСХРЫСТ

**Святочны канцэрт, прымеркаваны да Дня Незалежнасці, — мерапрыемства, можна сказаць, традыцыйнае. Але ў дырэкцыі спецпраектаў тэлеканала АНТ прыдумалі, як зрабіць імпрэзу яркай і небанальнай: за аснову ўзялі найвядомейшыя шлягеры ансамбля «Беларускія песняры», а месцам дзеі выбралі... адкрытую пляцоўку на ўзроўні пяціпавярховага дома ў сэрцы сталіцы — недалёка ад стэлы «Мінск — горад-герой».**



Вядучымі музычнай праграмы «Душа Беларусі» стануць вопытны гулец айчыннай тэлепрасторы Дзяніс Кур'ян і прадстаўніца маладога творчага пакалення, спявачка і блогер Лера Яскевіч, чые музычныя відэаролікі збіраюць на YouTube дзясяткі тысяч праглядаў і лайкаў. Не выключэннем стане і гэты вечар — Лера Яскевіч выканае адну са знакавых лірычных кампазіцый «Беларускіх песняроў».



Акрамя таго, на незвычайным «канцэрце на даху» свае версіі вядомых хітоў прадставяць спецыяльныя госці — пераможца расійскага шоу «Бітва талентаў» мінчанін Мікіта Баляько і гурт Naviband. І, безумоўна, сам ансамбль «Беларускія песняры», у выкананні якога прагучыць «песняроўская» спадчына розных гадоў: «Молодость моя — Белоруссия», «Вологда», «Не люби нелюбимого», «Рэкрут», «Чарнявая, бялявая», «Скажи про любовь» і яшчэ добры дзясятак кампазіцый. Паслухаць выступленне жывым пашанцуе абмежаванаму колу гледачоў — на пляцоўцы змесціцца ўсяго 60—70 чалавек, — а вось паглядзець эфір 3 ліпеня запрашаюцца ўсе ахвотныя.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# І ўсё ж, дзе ў яго кнопка?..

Геніяльны вучоны стварае высокатэхналагічнага робата Электроніка — з выгляду адзін у адзін звычайнага хлопчыка, які валодае неверагодным наборам здольнасцяў: можа падняць самы цяжкі груз і выканаць песню голасам любога артыста, рашыць складаную задачу па матэматыцы і прафесійна намаляваць карціну. Не дзіва, што прататып робата, школьнік Сяргей Сыраежкін, вырашае на пэўны час падмяніць сябе кіберхлопчыкам. І ўсё магло б атрымацца, але андроід патрэбны злачынцам, каб здзейсніць крадзеж стагоддзя... 40 гадоў таму рэжысёр Канстанцін Бромберг і пісьменнік Яўген Вялцістаў падарылі мільёнам савецкіх дзяцей музычны фільм «Прыгоды Электроніка», які з моманту прэм'еры і дагэтуль уваходзіць у Расіі ў сотню самых папулярных фільмаў усіх часоў.

Насамрэч першая аповесць пра хлопчыка-робата Электроніка з'явілася яшчэ раней, у 1964-м, калі тэма робататэхнікі была асабліва моднай. На час экранізацыі выйшла ўжо тры аповесці, але яны сталі толькі асновай кінастужкі.

Фільм здымалі ў Адэсе і Вільнюсе, хоць па сюжэце падзеі разгортваюцца ў Маскве. Спачатку планавалася, што абедзве галоўныя ролі будзе выконваць адзін хлопчык, але рэжысёр задумаў знайсці блізнят. Адэская кінастудыя абвясціла кастынг, і, нягледзячы на жорсткія патрабаванні: трэба было ўмець спяваць, іграць на гітары, танцаваць, кіраваць мапедам, адгукнуліся сотні пар братоў-блізнят з усяго Савецкага Саюза. А знайшлі герояў у звычайнай маскоўскай школе. Што цікава, 12-гадовых Юру і Валодзю Тарсуевых на пробы адправіў завуч. Самі ж хлопцы ў акцёры не рваліся і вельмі пакутавалі з-за таго, што дзеля здымак іх пафарбавалі ў белы колер — і прайшло нямала часу, перш чым іх кпіны аднакласнікаў перайшлі ў захапленне і нават зайздрасць. Затое пасля прэм'еры фільма браты атрымлівалі лісты ад прыхільнікаў літаральна мяхамі — некалькі дзясяткаў у дзень прыходзіла на кінастудыю, столькі ж — у рэдакцыю «Піянерскай праўды». Каб пазбавіцца ад гэтай славы, бацькам Тарсуевых давялося нават некалькі разоў мяняць нумар дамашняга тэлефона, а хлопцам — састрыгчы бландзіністыя кучары, без якіх іх сталі пазнаваць значна радзей. І мала хто з прыхільнікаў тады і цяпер ведаў, што ўпадабаныя песні ў «Прыгодах Электроніка» за хлопцаў спявалі... дзяўчаты, і нават агучвалі іх акрысы-жанчыны, паколькі ў падлеткаў якраз пачаў ламацца голас.



Рыжага хулігана Гусева памочнік рэжысёра амаль выпадкова знайшла ў адэскім інтэрнаце — і Вася Скромны аказаўся такім таленавітым, што потым скончыў тэатральнае вучылішча і сыграў у некалькіх фільмах, але ў рэшце рэшт спраўдзіў мару пайсці на флот.

Доўга не маглі вызначыцца і з кандыдатурай стваральніка робата — прафесара Громава. Сыграць яго прапанавалі Расціславу Пляту, але той «не трапіў у вобраз», Леанід Бранявы пасварыўся з аператарам, Бруна Фрэйндліх сур'ёзна захварэў, Уладзімір Этуш перацягваў увагу на сябе... Роля дасталася Мікалаю Грынько, які толькі што зняўся ў «Сталкеры» і скептычна ставіўся да дзіцячай карціны — а ў выніку па ёй многім і запомніўся.

Асобнай увагі заслугоўвае хвастаты акцёр — эрдэльтэр'ер Чынгіз, які сыграў робата-сабаку Рэсі, вернага сябра і памочніка электроннага хлопчыка. Сабака быў настолькі дружалюбны, кемлівы і працаздольны, што стаў улюбёнцам усёй здымачнай групы. Адзінай складанасцю стала тое, што поўсць у Чынгіза хутка адрастала, і яе не заўжды паспявалі пастрыгчы — гэтыя адрозненні бачныя ў розных серыях.

Матацыкл для Уры — Мікалая Карачанцава — узялі ў арэнду ў аднаго майстра-ўмельца з Прыбалтыкі, які браў вялікія грошы, бо ў перароблены ім крутой машыне нельга было апазнаць «Яву».

«Прыгоды Электроніка» ў год прэм'еры паказвалі па тэлебачанні ажно чатыры разы, а далей традыцыйна паўтаралі ў дні школьных канікул, у ліпені і студзені. Успомніць фільм нанова можна разам з каналам «Культура» — 1—4 ліпеня.

## Свежыя навіны ад «Звязды»!



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на ІІІ квартал або ІІ паўгоддзе 2019 г., запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 ліпеня 2019 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 17 ліпеня 2019 года будуць разыграны сем умывальнікаў «Акватэкс» і суперпрыз — душавая кабіна «Акварэль». Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 ліпеня.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 30 верасня пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на ІІІ квартал або ІІ паўгоддзе 2019 г. і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Свежыя навіны ад «Звязды»!» чытайце ў нумары 99 газеты «Звязда» ад 30.05.2019 г.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**

**Тэрмін правядзення гульні — з 01.06.2019 да 30.09.2019.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3563 ад 28.05.2019 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на ІІІ квартал або ІІ паўгоддзе 2019 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________

(аддзяленне сувязі)

на ІІІ квартал або ІІ паўгоддзе 2019 года

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ________ (індэкс) ________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

6.20 Слова мітрапаліта Паўла на свята Раства Іаана Прадцечы.
**6.30 Меладрама «Анёл у сэрцы» (12+).**
8.20 Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
**9.45 Серыял «Сваты-6» (12+).**
10.50 «На вылет!» (12+)
11.35 «Незабыты подзвіг». Дак. фільм (12+).
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Маршрут пабудаваны (12+).
**13.15 Меладрама «Інтрыганкі» (12+).**
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.15 «Жанчыны і спорт». Дак. фільм.
**16.50 Меладрама «Пакахай мяне такой...» (12+)**
20.40 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Мая любімая свякроў. Маскоўскія канікулы» (16+).**

## Беларусь 2

**7.00 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты». Заключная серыі (12+).**
**8.45, 20.00** Тэлебарометр.
8.50 М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
9.50 «Свет вывараты. Японія» (16+).
10.40 «ЖаннаПажані» (16+).
**11.40 Баявік «Лара Крофт. Расхрадальніца грабніц» (12+).**
**13.15 Фантастыка «Трансформеры: апошні рыцар» (12+).**
15.40 «Тата папаў» (16+).
18.00 «Арол і рэшка. Рай і пекла» (16+).
19.05 «Вясельны памер» (16+).
20.30 «Абмен жонкамі» (16+).
22.00 Спартлато 5 з 36, КЕНО.
22.05 «Трэці лішні» (16+) [СЦ].
23.00 «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).
23.35 «Калі мы дома». Скетчкам (16+).

## Беларусь 3

7.35 М/ф (0+).
**8.00, 14.05, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 14.25, 20.35** Гэты дзень.
**8.25 «Дом, у якім я жыву». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.30 «Беларуская кухня». Пірог з трусяцінай.
11.00 «Нацыянальны хіт-парад».
**11.55 «У небе «Начныя ведзьмы». Драма (12+) [СЦ].**
13.15 «Майстры і куміры». Акцёр Аляксандр Ждановіч.
14.30 «Дзесяць фатаграфій». Ангеліна Воўк (12+).
**15.05 «Здаецца кватэра з дзіцем». Камедыя (6+) [СЦ].**
**16.25 «Шпіён». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
19.35 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
20.00 «Архітэктура Беларусі».
20.40 «Калыханка» (0+).
**21.05 «Тры працэнты рызыкі». Драма (12+) [СЦ].**
22.10 «Запіскі на палях». Янка Купала: адзіная Паўлінка.
**22.35 «Паўлінка». Камедыя (12+).**

## Беларусь 5

7.00 Футбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Матч за 3-е месца.
8.55 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
10.45 Спорт-мікс.
10.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Віцебск» — «Дынама» (Брэст).
12.55 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/2 фіналу.
14.40 Аўтаспорт. Дрыфтынг. Пары-матч — чэмпіянат Беларусі. Трэці этап. Магілёў.
15.50 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Іслач» (Мінскі р-н) — «Славія» (Мазыр).
17.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. Фінал. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
20.05 Піт-стоп.
20.35 Вынікі тыдня.
21.20 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
23.30 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
7.10 М/с «Маша і Мядзведзь» (0+).
7.45 «Жыццё іншых» (12+).
8.40 «Метэагід».
9.10 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.25 Камедыя «Верныя сябры» (0+).**
11.20 «Муслім Магамаеў. «Ты мая мелодия...» (16+)
14.05 Камедыя «Брыльянтавая рука» (6+).
16.20 «Сямейныя тайны» (16+).
17.55 «Дзень сям'і, кахання і вернасці». Святочны канцэрт (12+).
20.00 Контуры.
21.05 Гала-канцэрт «Зроблена ў Беларусі» рэспубліканскага свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») (6+).
23.25 «Спартклуб» (16+).
23.45 «Што? Дзе? Калі?» Летняя серыя гульняў. Фінал (16+).

## СТБ

6.05 «Ежа багоў» (16+).
**7.45, 22.05** Дакументальны спецпраект (16+).
9.25 «Мінтранс» (16+).
10.00 «Скардзіцца дазваляецца».
10.30 «Вялікі горад».
**11.00, 13.40, 16.40, 20.35 «Знішчальнікі». Серыял (12+).**
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
19.30 «Тыдзень».
**0.25 «Востраў непатрэбных людзей». Серыял (16+).**
1.55 «Соль: легенды сусветнай музыкі». «Linkin Park — Road to Revolution: Live at Milton Keynes» (16+).

## МІР

**6.00, 6.25** М/ф (0+).
6.15 «Мільён пытанняў пра прыроду» (6+).
6.40 «Беларусь сёння» (12+).
7.10 «Паляванне на працу» (12+).
7.45 «Культ/Турызм» (16+).
8.20 «Яшчэ танней» (12+).
8.50 «Сусветныя гульні розуму» (0+).
9.25 «Наша кіно. Гісторыя вялікага кахання» (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15, 16.15, 19.30, 1.00 Серыял «Дрэнная кроў» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**3.20 Маст. фільм «Неба майго дзяцінства» (6+).**
**5.00 Серыял «Здрада» (16+).**

## РТР—Беларусь

7.00 «Па сакрэце ўсяму свету».
**7.50 Драма «Брэсцкая крэпасць» (12+).**
10.30 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна» (16+).
11.00 Весткі.
11.20 «Сто да аднаго» (12+).
12.15 «Ранішняя пошта» (16+).
13.00 «Калі ўсе дома» (12+).
14.00 «Смяяцца дазваляецца» (16+).
**14.45, 21.45 Серыял «Залатая клетка» (12+).**
20.00 Весткі тыдня.
23.00 Масква. Крэмль. Пуцін.
23.40 «Нядзельны вечар».
1.15 «Дзеючыя асобы» (12+).

## НТБ—Беларусь

6.10 «Астрапрагноз».
6.20 Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.50, 23.15** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
7.20 «Падарожніца ўсе» (16+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
8.20 Спецыяльны рэпартаж (12+).
8.40 «Вуснамі дзіцяці» (0+).
9.15 «Хто ў доме гаспадар?» (16+)
10.25 «Першая перадача» (16+).
11.00 «Цуд тэхнікі» (12+).
11.55 «Дачны адказ» (0+).
13.00 «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.05 Драма «Брат» (16+).**
16.25 «Следства вялі...» (16+)
**19.35 Маст. фільм «Адстаўнік-2» (16+).**
**21.05 Драма «Брат-2» (16+).**
23.50 «Таямнічая Расія» (16+).

## 8 канал

**7.00, 15.45, 18.25, 21.05, 0.15** «Надвор'е».
7.05 М/ф «Баранчык Шон».
7.15 Дак. фільм «Дзіцяняты ў дзікай прыродзе».
7.45 М/ф «Іван Царэвіч і Шэры Воўк».
9.10 «Утрамдзія».
9.15 «Сустрэча Луўра з забароненым горадам» (0+).
10.00 «Вячэрні квартал-95» (18+).
**11.15 Камедыя «8 новых спатканняў» (12+).**
**12.40 Камедыя «Восем найлепшых спатканняў» (12+).**
**14.15 Серыял «Застаца ў жывых» (16+).**
15.50 «Глядзім усёй сям'ёй». Фільм — дзецям «Дзяўчынка шукае бацьку».
17.20 «Сябры дзядулі Марка».
**17.40 Серыял «Касл» (12+).**
**18.30 Фантастыка «Гадзіла» (12+).**
20.50 «Вечарніца».
**21.10 Драма «Першы чалавек» (12+).**
**23.25 Серыял «Сарвігалава» (12+).**



## ВТБ

6.05 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Наш рамонт» (16+).
7.45 «Пары на Канары» (16+).
8.40 М/ф «Тры каты» (0+).
9.05 М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**9.35, 4.20** Серыял «Анжаліка» (16+).
**10.40, 17.30** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**12.05, 5.10** Серыял «Пакуль цвіце папараць» (16+).
**13.10, 1.15** Серыял «Вароніны» (12+).
**14.45, 3.45** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
15.30 Камедыя «50 першых пацалункаў» (12+).
**19.00, 0.15** «Уральскія пельмені» (16+).
20.00 Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
22.00 Баявік «Грашовы цягнік» (16+).
2.30 Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.15** Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...» Масква талстоўская.
7.05 «Продкі нашых продкаў». Дак. серыял [СЦ].
7.50 «Легенды сусветнага кіно». Сяргей Марцінсон.
8.25 «Да каго заляцеў пеўчы кенар». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Больш, чым каханне». Кацярына Максімава і Рыхард Зорге [СЦ].
11.00 «Сіта і Рама». Серыял.
12.35 «Лінія жыцця». Ягор Канчалоўскі.
13.30 «Хакасія. Па слядах сляды наскальных». Дак. фільм [СЦ].
14.15 «Успомніць усё. Галаграма памяці». Дак. фільм.
15.10 Тэатр на экране. Спектакль Тэатра імя У. Маякоўскага «Таленты і прыхільнікі». Запіс 2012 года.
**18.15, 1.25** Камерная музыка. Юджа Ванг і Гаўтье Капюсон. Канцэрт на фестывалі ў Сен-Прэ.
19.45 «Прыгоды Электроніка». Маст. фільм. 1-я серыя (0+).
20.55 «Добрай ночы, малыя!»
21.10 «Больш, чым каханне». Таццяна Шмыга [СЦ].
21.50 Прыступкі цывілізацыі. «Вялікая тайна матэматыкі». Дак. фільм [СЦ].
22.45 Да 95-годдзя з дня нараджэння Наталлі Бехцеравай. «Магія мозга». Фільм 1-ы [СЦ].
23.35 «Адчайныя раманты». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі (18+).
2.40 «Pro memoria». «Азы і Вузы».

## Настальгія

**6.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
7.00 Маст. фільм «Неспакойная гаспадарка» (12+).
**8.20, 11.25, 13.25, 18.45, 20.10, 21.45, 23.00, 1.00, 2.35, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
8.50 М/ф «Бач ты, масленіца!» (12+)
9.00 «Быў час». 2009 год (16+).
10.00 Тэлеспектакль. Оскар Уайльд, «Як важна быць сур'ёзным». 1976 год (16+).
12.00 «Вакол смеху» з Аляксандрам Іванковым. 1986 год (12+).
13.50 Фільм-канцэрт «Сустрэчы з Алай Пугачовай». 1984 год (12+).
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
15.45 Тэлеспектакль «Салярыс». 1968 год (16+).
18.10 «... Да 16 і старэйшым» ад 13 чэрвеня 1991 года (12+).
19.00 Тэлеспектакль «У адным мікраёне». 1-я серыя. 1976 год (16+).
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1987-ы. 1-я частка. 2010 год (12+).
1.30 Тэлеспектакль «Залатая рыбка». 1985 год (12+).
4.00 «Колба часу» (16+).

## EuroSport 1

**0.00, 3.30, 10.00, 21.00** Ралі. ERC.
**0.30, 5.30, 11.30** Снукер. Кубак свету. Фінал.
**1.30, 4.00, 13.00, 18.00** Веласпорт. Нацыянальныя чэмпіянат.
**2.30, 7.30, 10.30, 16.30** Вяслярны слалам. Кубак свету.
8.30 Веласпорт. «Тур дэ Франс» — 2018.
**9.30, 20.30** Аўтагонкі. Суперкубак Porsche.
17.30 Веласпорт. Хале — Інгойгем.
19.00 Watts.
20.00 Конны спорт. Global Champions League.
21.35 Алімпійскія гульні. «Першае пакаленне».
23.30 Алімпійскія гульні. «Сіла асобы».

## Кінакамедыя

1.00 Падарожжа Гектара ў пошуках шчасця (12+).
3.00 Бум (12+).
5.00 Бум-2 (16+).
7.00 Памятаю — не памятаю (12+).
8.20 Завадатары (16+).
10.10 Шалёныя суседзі (16+).
11.55 Сексу шмат не бывае (18+).
14.00 Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
15.40 Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы (16+).
17.20 Хот-дог (18+).
19.30 Мужчыны супраць жанчын (16+).
21.40 Жанчыны супраць мужчын (16+).
23.35 Кухня ў Парыжы (16+).

## ТБ3

6.00 М/ф (6+).
8.20 «M&S» (12+).
8.50 Калекцыя Беларусьфільма. «У чэрвені 41-га». Маст. фільм (16+).
10.40 «Перыскоп» (16+).
**11.00, 4.15** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
12.40 «Асцярожна, махляры!» (16+)
13.15 «Без падману» (16+).
14.10 «Рэстаўратар». Маст. фільм (12+).
**16.00, 23.10** «Нераскрытыя тайны» (12+).
16.40 «Мой герой» (12+).
17.30 «Развітанне» (16+).
18.30 «Тайныя дзеці зорак». Дак. фільм (16+).
**19.25, 2.40** «Анатомія забойства». Серыял (12+).
21.20 «Менталіст». Серыял (16+).
0.10 «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
0.55 «Мы — Мілеры». Камедыя (16+).
5.05 «Часова даступны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 17.55** Аперацыя «Арго» (16+).
8.30 Прывід оперы (12+).
11.10 Легенда Зора (16+).
13.40 Трыстан і Ізольда (12+).
16.00 Сямейка Крудс (6+).
20.15 Дзетсадаўскі паліцэйскі (12+).
22.25 Лізавета (16+).
0.45 Вярнуць адпраўніку (18+).
2.25 Магія месяцавага святла (18+).
4.20 Шопа-кап (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Фота на памяць (16+).
7.45 Любоў-моркоў-3 (12+).
9.40 Дуэль. Пушкін — Лермантаў (12+).
**12.20, 4.25** Дзядуля (12+).
14.25 Гуляй, Вася! (16+)
16.15 Галоўны (6+).
18.20 Герой нашага часу. 1—2-я серыі (12+).
20.20 Нававодні тата (12+).
22.15 Здрада (16+).
0.35 Рабінавы вальс (12+).
2.35 Любоў-марқоў (12+).

## National Geographic

6.00 Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.40, 14.25** Неверагодныя машыны (16+).
**7.25, 13.40, 17.25** Інстынкт выжывання (16+).
8.10 Дзікі тунец (16+).
**9.45, 18.15** Па іх уласных словах (16+).
10.35 Цяжкае золата Аляскі (16+).
**11.20, 21.25** Аўта-SOS (16+).
12.50 Закінутыя скарбы Майя (16+).
15.10 Супербудаванні (16+).
**15.55, 22.10, 5.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**19.00, 22.55, 3.35** Апалон: Месяцавая місія (16+).
**20.35, 0.30** Місія: да Плутона і далей (16+).
1.15 Ліхтугі за мяжой (16+).
2.05 Гарачыя межы (16+).
5.10 Гульні розуму (16+).
5.35 Займальная навука (16+).

## Discovery

**8.00, 11.10, 13.55, 15.45, 21.15** Як гэта ўстроена? (12+).
**8.25, 18.30, 0.00** Амерыканскі чопер (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 4.35** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05, 23.05** Паляўнічыя на склады (16+).
**13.00, 3.40** Аперацыя «Выратаванне дома» (16+).
14.50 Як гэта зроблена? (12+).
**19.25, 7.10** Металаломшчыкі (12+).
**20.20, 5.30** Бітвы за кантэйнеры (12+).
**0.55, 6.20** Выжыць разам (16+).
1.50 Самагоншчыкі (18+).
2.45 Голыя і напалоханыя (16+).

## серада, 3 ліпеня — ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

### Беларусь 1

**6.10, 11.00, 13.00, 16.00 Серыял «Камісарка» (16+).**
**8.00** Добрай раніцы, Беларусь!
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Інфармацыйны канал «Дзень Незалежнасці».
**10.00** Патрыятычнае шэсце «Беларусь памятае!»
**21.00** Ваенны парад, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**22.30 Драма «Не гульня» (12+).**
**0.15 Меладрама «У апошні раз развітваюся» (16+).**

### Беларусь 2

**6.55, 10.15, 14.20, 15.10, 21.55** 75 гадоў вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**7.05 Маст. фільм «Вайна пад стрэхамі» (12+).**
**8.40 Драма «Сыны ідуць у бой» (12+).**
**10.20 Драма «Брэсцкая крэпасць» (12+).**
**12.35** «Вайна. Застацца чалавекам» (16+).
**14.25, 23.15** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**15.15, 22.05 Дэтэктыў «Смерць шпіёнам!» (12+)**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.00** Час моцных (12+).

### Беларусь 3

**7.20, 20.15** Навіны культуры.
**7.35, 20.35** Гэты дзень.
**7.45 «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Драма (12+) [СЦ].**
**9.25** «Жывая культура». Традыцыйная рэгіянальная кухня аграгарадка Адэльск (Гродзенскі раён).
**9.50 «Белыя росы». Камедыя (12+) [СЦ].**
**11.15** «Зорны карагод». Юбілейная канцэртная праграма Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца Беларусі.
**13.05 «У жніўні 44-га...» Драма (12+) [СЦ].**
**15.00** «Жывая культура». Пабытавы танец «Полька спораўская» вёскі Спорава Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці.
**15.30** «Каб памяць зберагчы...» Песні беларускіх аўтараў у канцэрце да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**17.10 «Глыбокая плынь». Драма (12+) [СЦ].**
**18.45** Урачысты сход і канцэрт майстроў мастацтваў «Вызваленне», прысвечаныя Дню Незалежнасці і 75-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Дняпроўскі рубеж». Драма (16+) [СЦ].**
**23.15** Фестываль армейскай песні «Звязда».

### Беларусь 5

**7.00, 13.30, 0.20** Тэніс. Уімблдон.
**8.35** Спорт-кадр.
**9.05** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Плэй-оф.
**10.45** Жанчыны і спорт. Алена Бялова.
**11.20, 21.50** Футбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 1/2 фіналу.
**13.10** Козел пра футбол.
**23.50** Слэм-данк.

### АНТ

**7.00, 0.00** «Партызаны Беларусі».
**8.00** «Наша раніца».
**9.45, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.00** (з субцітрамі) Нашы навіны.
**10.00** Патрыятычнае шэсце «Беларусь памятае!»
**11.00, 13.35, 16.35 Серыял «Лета ваўкоў» (16+).**
**18.35** Канцэрт «Душа Беларусі» (6+).
**21.00** Ваенны парад, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**22.30** Гала-канцэрт «Нашы песні — наша жыццё», прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

### СТБ

**6.00** «Раніца. Студыя добрага настрою». Святочны выпуск (6+).
**8.25, 11.00, 23.10 «У жніўні 44-га». Драма (12+).**
**9.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**10.00** Патрыятычнае шэсце «Беларусь памятае!»
**11.50, 0.55 «Белыя росы». Камедыя (12+).**
**13.20, 13.50 «Белыя росы. Вяртанне». Меладрама (12+).**
**15.30** «Гаворыць нямая памяць». Дак. фільм.
**16.55, 20.15 «Знішчальнікі». Серыял (12+).**
**21.00** Ваенны парад, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

### МІР

**6.00, 4.10 Серыял «Сужэнцы» (16+).**
**6.50, 10.10, 20.40 Серыял «Пляж» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Такому мама не навучыць» (12+).
**17.15, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**0.10** Ваенны парад і святочнае шэсце, прысвечанае Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (12+).
**1.20** Гала-канцэрт, прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (12+).
**3.45** «Трымайся, шоубіз!» (16+)

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** Патрыятычнае шэсце «Беларусь памятае!»
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** Дак. фільм «Усе колеры ліпеня» (12+).
**12.10** Дак. фільм «Бацька» (12+).
**12.45, 14.25 Маст. фільм «Бацька» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.30** «60 хвілін». Ток-шоу.
**17.25** Святочны канцэрт «Беларусь памятае. Дарога памяці».
**21.00** Ваенны парад, прысвечаны 75-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**22.30, 23.45 Серыял «Пастка для каралевы» (12+).**
**0.35** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** «Справа жыцця» (12+).
**6.30** «Беларусы» (6+).
**7.10** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**7.25** «Служыць закону». Дак. фільм (12+).
**8.05 Маст. фільм «Дзяўчынка шукае бацьку» (0+).**
**9.40** «Нашы» (6+).
**10.20 Серыял «Адвакат» (16+).**
**11.15 Маст. фільм «Мой дом — мая крэпасць» (16+).**
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Дзіцячая новая хваля — 2019» (0+).
**15.45, 16.30 Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**
**19.45 Драма «Сем пар нячыстых» (16+).**
**21.20 Баявік «Дванаццаць гадзін» (16+).**
**23.05** «Алтар Перамогі» (0+).

### 8 канал

**7.00, 15.55, 19.10, 21.05, 0.30** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** М/с «Прынцэса Алена».
**7.25, 16.00** «Гумарынка».
**7.30 Прыгоды «Бэль і Себасцьян. Сябры навек» (0+).**
**9.00** М/ф.
**9.45, 19.15 Серыял «Попел» (16+).**
**10.30** «Сустрэча Луўра з забароненым горадам» (0+).
**11.15 Драма «Ізгой» (12+).**
**13.40, 20.05 Серыял «Падман» (16+).**
**14.30 Серыял «Застацца ў жывых» (16+).**
**16.25** Дак. серыял «Дзіцяняты ў дзікай прыродзе» (0+).
**16.55 Драма «Яго батальён» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Палонніцы» (16+).**
**23.40 Серыял «Сарвігалава» (12+).**

## пятніца, 5 ліпеня — ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

### ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.20** «Ералаш» (6+).
**8.40** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.05** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**9.35, 4.20** Серыял «Анжаліка» (16+).
**10.40, 17.30** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**12.05, 5.10** Серыял «Пакуль цвіце папараць» (16+).
**13.10** «Наш рамонт» (16+).
**13.55** «Галерэя прыгажосці-2» (16+).
**14.50, 3.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.25** Камедыя «Раства з няўдачнікамі» (12+).
**19.00, 23.00** «Уральскія пельмені» (16+).
**20.00** «Шоу выхаднога дня» (16+).
**21.00** Фантастыка «Людзі ў чорным» (12+).
**0.00** Жахі «Чорная вада» (16+).
**2.15** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

### Культура

**6.30, 7.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.00** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква клубная.
**7.05, 13.35** «Сакрэты Месяца». Дак. фільм [СЦ].
**8.00** «Легенды сусветнага кіно». Марчэла Мастраяні.
**8.25** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**8.40** «Справа за табой!» Маст. фільм.
**10.15** «Больш, чым каханне». Ілья Рэпін і Наталля Нордман [СЦ].
**11.00** «Сіта і Рама». Серыял.
**12.35** «Паліглот». Англійская з нуля за 16 гадзін! № 4 [СЦ].
**13.20** Адкрытае пісьмо. «Партрэты эпохі. Фотапаштоўка».
**14.30** «Наталля Бехцерава. Магія мозга» [СЦ].
**15.10** Тэатр на экране. Спектакль тэатра «Ленкам» «Жаніцьба». Запіс 2009 года.
**17.15** «Блізкае кола Марка Захарава».
**18.10** Камерная музыка. Аляксандр Бузлоў, Юрый Башмет і Камерны ансамбль «Салісты Масквы».
**19.00** Смеханастальгія.
**19.45, 1.55** «Шукальнікі». «Скарбы Радзівілаў».
**20.35** «Квартэт Гварнеры». Маст. фільм (6+) [СЦ].
**23.20** «Прыватная ўрачыстасць». Маст. фільм.
**0.55** «Take 6» у Маскве.
**2.40** «Рыцарскі раман». М/ф для дарослых.

### Настальгія

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**7.00, 13.10, 19.15, 1.20** Тэлеспектакль «У адным мікрараёне». 1976 год (16+).
**8.00, 9.45, 11.00, 12.50, 14.20, 15.45, 17.00, 19.00, 21.45, 23.00, 1.00, 2.20, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**8.35** Маст. фільм «Тры рублі» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў». Язаў Дзмітрый. 2007 год (12+).
**14.35** «Спецыяльна па вашым заказе». 1990 год (12+).
**17.25** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год (16+).
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1987-ы. 2-я частка. 2010 год (16+).
**20.45** Фільм-канцэрт «Спявае Івіца Шэрфезі». 1970 год (12+).
**22.00** «Колба часу» (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Закон аб СМІ». 2006 год (16+).

### EuroSport 1

**0.20** Веласпорт. «Джыра-д'Італія».
**1.15, 6.00, 11.00** Watts.
**2.00** Ралі. ERC. All Access.
**2.30** Веласпорт. Хале — Інгойгем.
**4.00, 12.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Прэзентацыя каманд.
**5.00, 13.00, 16.00, 19.00, 21.00, 23.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс» — 2018.
**6.30** Веласпорт. Мілан — Сан-Рэма.
**8.00** Веласпорт. «Тур Фландрыі».
**9.30** Веласпорт. Парыж — Рубэ.
**10.00** Веласпорт. Льеж — Бастонь — Льеж.

### Кінакамедыя

**0.30** Афіцыйнае бязмежжа (18+).
**2.10** Красуні (16+).
**3.45** Кухня ў Парыжы (16+).
**5.35** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**7.45** Эвалюцыя (12+).
**9.45** Скарбы В. К. (12+).
**11.45** Ад сям'і не ўцячэш (16+).
**14.00** Паедзем да чортавай бабулі (12+).
**15.45** Выдатніца лёгкіх паводзін (16+).
**17.25** Хот-дог (18+).
**19.30** Без пачуццяў (16+).
**21.20** Хлапечнік па-ірландску (16+).
**23.10** Не саступіць Штэйнам (16+).

### ТБ3

**6.00** Дакументальная калекцыя Беларусьфільма (12+).
**6.40** М/ф (6+).
**8.15** «M&S» (12+).
**8.45** «Сезон пасадак». Серыял (12+).
**10.25, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.00, 16.40** «Варажбітка» (12+).
**13.35** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.40** «Суд ідзе» (16+).
**15.45** «Мой герой» (12+).
**17.55, 2.40** «Мой шлях. Ігар Круты». Дак. фільм (16+).
**19.30** «Копы ў спадніцах». Камедыя (16+).
**21.45** «Ахоўнік». Трылер (16+).
**23.55, 5.30** «Вокладка» (16+).
**0.30** «90-я» (16+).
**1.15** «Лінія абароны» (16+).
**1.45** «Уся праўда» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 17.45** Дзетсадаўскі паліцэйскі (12+).
**8.45** Афера па-амерыканску (16+).
**11.35** Бетховен (12+).
**13.30** Фантастычнае каханне і дзе яго знайсці (16+).
**15.20** Лізавета (16+).
**20.05** 1+1 (16+).
**22.15** Код да Вінчы (16+).
**1.05** Скнара (16+).
**2.45** Без заганы (12+).
**4.40** Агент Джоні Інгліш (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Дачны раманс (16+).
**8.50** Выратаваць Пушкіна (6+).
**10.25** Здрада (16+).
**12.40, 4.25** Два плюс два (12+).
**14.30** Навагодні тата (12+).
**16.25** Скарб (6+).
**18.20** Рабінавы вальс (12+).
**20.20** Рубеж (12+).
**22.15** Усё ці нічога (16+).
**0.00** Паддубны (6+).
**2.25** Кухня ў Парыжы (12+).

### National Geographic

**6.00** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.25, 15.05, 1.10** Асушыць акіян (12+).
**7.15, 13.35, 17.25** Інстынкт выжывання (16+).
**8.00** Дзікі тунец (16+).
**9.45** Будаўніцтва тунеля (16+).
**10.30** Расплаўленыя грошы (16+).
**11.15, 21.20, 4.20** Аўта-SOS (16+).
**12.50** Кітай з вышыні птушынага палёту (16+).
**14.20** Космас: прастора і час (16+).
**15.55, 22.05, 3.35** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**18.15** Даследчык 2.0 (16+).
**19.00, 22.50** Варожая планета (16+).
**20.30, 2.45** Гарачыя межы (16+).
**0.20** Марс (16+).
**2.00** Ліхтугі за мяжой (16+).
**5.10** Гульні розуму (16+).
**5.35** Займальная навука (16+).

### Discovery

**8.00, 11.10, 15.45, 21.15** Як гэта ўстроена? (12+)
**8.25, 18.30** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 4.35** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05, 23.05** Паляўнічыя на склады (16+).
**13.00** Голыя і напалоханыя (16+).
**13.55** Умельцы супраць апакаліпсіса (12+).
**14.50, 0.00** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**19.25, 7.10** Металаломшчыкі (12+).
**20.20, 5.30** Бітвы за кантэйнеры (16+).
**0.00** Аперацыя «Выратаванне дома» (12+).
**0.55, 6.20** Выжыць разам (16+).
**1.50** Самагоншчыкі (18+).
**2.45** Экстрэмальныя фургоны (12+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.00** «Зона Х» (16+).
**9.10 Баявік «Сляды на вадзе» (16+).**
**10.55, 12.10, 18.35, 19.29 Меладрама «Сорак ружовых кустоў». 1-я і 2-я серыя (16+).**
**13.05** Дзіцячы доктар.
**13.35** Дзень у вялікім горадзе.
**14.35, 15.25 Меладрама «У апошні раз развітваюся» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.50** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**22.10 Серыял «След» (16+).**
**23.40** Сфера інтарэсаў.
**0.40** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.00** Тэлебарометр.
**9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.00, 22.05** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 18.05 Дэтэктыў «Смерць шпіёнам!» (12+)**
**12.55, 23.00 Серыял «Жаночы доктар-2» (16+).**
**13.50** М/с «Чып і Дэйл спяшаюцца на дапамогу» (0+).
**14.40** «ЖаннаПажані» (16+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45, 23.50** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.30 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты» (12+).**
**17.25** «Калі мы дома». Скетчкам (16+)
**21.05** «Абмен жонкамі» (16+).
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня». Крапанікі.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** Гэты дзень.
**8.30, 17.30 «Жэня, Жэнечка і «Кацюша». Трагікамедыя (12+).**
**9.50 «Чакай мяне». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**11.20, 21.05** «Апошні дзень». Фрунзік Мкртчан (12+).
**12.55** «Жывая культура». Ганчарныя вырабы майстроў Бабруйскага раёна (Магілёўская вобласць).
**13.20, 18.55** «Берлін. Май 1945». Дак. фільм (12+).
**14.00 «Белыя росы». Камедыя (12+) [СЦ].**
**15.30** «Артэфакты». Касцяны крыж часоў Лівонскай вайны [СЦ].
**15.55** Юбілейны канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа».
**19.30** «Камертон». Паэт, перакладчык, публіцыст Анатоль Аўруцін.
**20.00** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.40 «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Драма (12+) [СЦ].**
**23.20** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)

## Беларусь 5

**7.00, 13.30, 23.10** Тэніс. Уімблдон.
**9.05** Слэм-данк.
**9.35** Спорт-мікс.
**9.45** Футбол. Чэмпіянат свету. Жанчыны. 1/2 фіналу.
**11.40** Козел пра футбол.
**12.00** II Еўрапейскія гульні. Мінск-2019. Нашы перамогі.
**21.20** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. 1/4 фіналу. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**9.50** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «Участак» (12+).**
**12.20, 13.10 Серыял «Вер мне» (16+).**
**14.40** «Давай пажэнімся!» (16+).
**15.35, 16.20, 0.00** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**16.55, 23.00** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.05** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 Серыял «25-я гадзіна» (16+).**

## СТБ

**5.35, 22.05** «Глядзець усім!»
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.05** «Анфас».
**9.25, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Белыя ваўкі-2». Серыял (16+).**
**12.30** «У апошні момант» (16+).
**12.40, 21.20, 23.50** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.45** «Як устроены свет» (16+).
**15.45, 16.50 «Знішчальнікі». Серыял (12+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічнпя падрабязнасці».
**0.25** Дакументальны праект (16+).
**1.10** «Сакрэты старажытных прыгажунь» (16+).

## МІР

**6.00, 3.05 Серыял «Сужэнцы» (16+).**
**7.50, 10.10, 20.40, 0.20 Серыял «Пляж» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 2.20** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 1.55** «Такому мама не навучыць» (12+).
**17.15, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**0.10** «У гасцях у лічбы» (12+).

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35, 14.25 Маст. фільм «Чаклун і Румба» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**15.35** «Лёс чалавека» (12+).
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Пастка для каралевы» (12+).**
**22.30, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**0.30** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**6.30** «Рэальны свет» (12+).
**7.10** «Мальцава» (12+).
**7.50, 8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.45, 10.20 Серыял «Адвакат» (16+).**
**9.40** «Нашы» (6+).
**11.10, 23.05 Серыял «Банды» (16+).**
**12.05** «Суд прысяжных» (16+).
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00, 16.25 Серыял «Марскія д'яблы» (16+).**
**17.10** «ДНК» (16+).
**18.10** «НЗ. Расследаванне» (16+).
**18.45, 19.50 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**19.35** Сёння. Галоўнае.
**22.40** «НЗ.by».

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.10, 21.00, 0.30** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** М/с «Прынцэса Алена».
**7.25** «Гумарынка».
**7.30 Баявік «Залатое вока» (12+).**
**9.40, 19.15 Серыял «Попел» (16+).**
**10.30** Дак. фільм.
**11.00 Драма «Палонніцы» (16+).**
**13.40, 20.05 Серыял «Падман» (16+).**
**14.30 Серыял «Застацца ў жывых» (16+).**
**16.30 Прыгоды «Капітан Крук» (6+).**
**18.55** «Фэшн is my прафэшн».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Фантастыка «Марсіянін» (16+).**
**23.35 Серыял «Сарвігалава» (12+).**

чацвер, 4 ліпеня ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.20** «Ералаш» (6+).
**8.40** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.05** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**9.35, 4.20** Серыял «Анжаліка» (16+).
**10.40, 17.30** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**12.05, 5.10** Серыял «Пакуль цвіце папараць» (16+).
**13.10, 1.05** Серыял «Вароніны» (12+).
**14.45, 3.35** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**15.45** Камедыя «Краіна цудаў» (16+).
**19.00, 0.05** «Уральскія пельмені» (16+).
**20.00** Серыял «Атэль «Элеон» (16+).
**22.00** Камедыя «Раство з няўдачнікамі» (12+).



**2.20** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 10.00, 15.00, 19.30, 23.15** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква золатагаловая.
**7.05, 13.35, 21.50** «Сакрэты Месяца». Дак. фільм [СЦ].
**8.00** «Легенды сусветнага кіно». Валянціна Сярова.
**8.30** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**8.50** «Прыгоды Электроніка». Маст. фільм (0+).
**10.15** «Больш, чым каханне». Юрый і Ларыса Гуляевы [СЦ].
**11.00** «Сіта і Рама». Серыял.
**12.35** «Паліглот». Англійская з нуля за 16 гадзін! № 3 [СЦ].
**13.20** Адкрытае пісьмо. «Свет дзяцінства у паштоўках Сярэбранага стагоддзя».
**14.30, 22.45** «Наталля Бехцерава. Магія мозга» [СЦ].
**15.10** 80 гадоў Адольфу Шапіру. Тэатр на экране. Спектакль Тэатра-студыі пад кіраўніцтвам А. Табакова «На дне». Запіс 2003 года.
**17.50** «Блізкае кола Адольфа Шапіры».
**18.50, 1.10** Камерная музыка.
**19.45** «Ну, пачакай!» М/ф.
**20.55** «Добрай ночы, малыя!»
**21.10** «Больш, чым каханне». Юрый і Ларыса Гуляевы [СЦ].
**23.35** «Нядзеля за горадам». Маст. фільм.
**2.05** «Канструктывісты. Доследы для будучыні. Радчанка». Дак. фільм.

## Настальгія

**6.10** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Закон аб СМІ». 2006 год (16+).
**7.10, 8.30, 9.45, 11.00, 14.00, 15.45, 17.00, 18.50, 20.20, 21.45, 23.00, 0.35, 2.10, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30, 13.00, 19.10, 1.00** Тэлеспектакль «У адным мікрараёне». 1976 год (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год (12+).
**14.35** Маст. фільм «Тры рублі» (16+).
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Язэп Дзмітрый. 2007 год (12+).
**20.35** «Спецыяльна па вашым заказе». 1990 год (12+).
**23.25** «Рок-н-рол ТБ». 1992 год (16+).
**0.00** «...Да 16 і старэйшым» ад 13 чэрвеня 1991 года (12+).

## EuroSport 1

**0.00, 3.00, 11.00, 14.00** Веласпорт. «Крытэрыум Дафінэ».
**4.00, 18.30, 23.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс» — 2018.
**5.00, 15.00, 21.00** Watts.
**6.00, 10.30, 16.00, 21.45** Ралі. ERC. All Access.
**6.30, 9.00, 17.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**16.30** Веласпорт. Хале — Інгойгем.
**19.30, 22.15** Веласпорт. «Тур дэ Франс». Прэзентацыя каманд.

## Кінакамедыя

**0.50** Шалёныя суседзі (16+).
**2.30** Два дні (16+).
**4.15** Дзень выбараў па-французску (16+).
**5.55** Хот-дог (18+).
**8.05** Гэты нямёкі момант (16+).
**10.05** Я ніколі не буду тваёй (16+).
**12.00** Кузены (16+).
**14.00** Выдатніца лёгкіх паводзін (16+).
**15.40** Клік: з пультам па жыцці (12+).
**17.40** Як я стаў рускім (16+).
**19.30** Незадаволенае сексуальнае напружанне (18+).
**21.15** Маё вялікае грэчаскае лета (16+).



**23.00** Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы (16+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.15** «Школа доктара Камароўскага» (6+).
**7.45** «Доктар І...» (16+)
**8.10** «Белыя росы. Вяртанне». Меладрама (12+).
**10.00, 23.40** «Улегцы» (12+).
**10.30, 5.05** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10, 17.55** «Варажбіткa» (12+).
**13.45, 16.50** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.50** «Суд ідзе» (16+).
**15.55** «Натуральны адбор» (12+).
**19.10, 3.00** «Сезон паляванняў». Серыял (12+).
**21.00** «Менталіст». Серыял (16+).
**22.50** «Знак якасці» (16+).
**0.10** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.55** «Атэль «Мэрыголд». Камедыя (12+).
**4.35** «Нераскрытыя тайны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 17.50** Легенда Зора (16+).
**8.40** Даспехі Бога: у пошуках скарбаў (12+).
**10.40** Злаві таўстуху, калі зможаш (16+).
**12.45** Сацыяльная сетка (16+).
**15.10** Прывід оперы (12+).
**20.20** Бетховен (12+).
**22.00** Афера па-амерыканску (16+).
**0.40** Джэкі (18+).
**2.25** Вярнуць адпраўніку (18+).
**4.10** Лізавета (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**8.35** Глухар у кіно (16+).
**10.25** Кіно пра Аляксеева (12+).
**12.25, 4.25** Два плюс два. 1—2-я серыі (12+).
**14.10** Любоў-маркоў-3 (12+).
**16.00** Пасля цябе (16+).
**18.20** Герой нашага часу (12+).
**20.20** Выратаваць Пушкіна (6+).
**22.00** Цар (16+).
**0.25** Разбудзі мяне (18+).
**2.20** Здрада (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.25, 15.05, 0.25** Асушыць акіян (16+).
**7.20, 13.35, 17.25** Інстынкт выжывання (16+).
**8.05** Дзікі тунец (16+).
**9.45** Міграцыя (16+).
**11.20, 20.30** Аўта-SOS (16+).
**12.50** Кітай з вышыні птушынага палёту (16+).
**14.20** Космас: прастора і час (16+).
**15.55, 21.15, 3.35** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**18.15** Унутры неверагоднай механікі (16+).
**19.00, 22.00, 1.10, 4.25** Будаўніцтва тунеля (16+).
**19.45** Фідэль Кастра: страчаныя плёнкі (16+).
**22.50, 2.00** Ліхтугі за мяжой (16+).
**23.35** Марс (16+).
**2.45** Гарачыя межы (16+).
**5.10** Гульні розуму (16+).
**5.35** Займальная навука (16+).

## Discovery

**8.00, 11.10, 15.45, 21.15** Як гэта ўстроена? (12+)
**8.25, 18.30** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 4.35** Хуткія і гучныя (12+).
**12.05, 23.05** Паляўнічыя на склады (16+).
**13.00** Што магло пайсці не так? (16+)
**19.25, 7.10** Металаломшчыкі (12+).
**20.20, 5.30** Бітвы за кантэйнеры (12+).
**0.00** Залатыя шлях Паркера Шнабеля (16+).
**0.55, 6.20** Выжыць разам (16+).
**1.50** Самагоншчыкі (18+).
**2.45** Браты Дызель (12+).
**3.40** НАСА: невытлумачальныя матэрыялы (12+).

# да дарогі з падагрэвам

і ўтрыманне мясцовых дарог і вуліц у Баранавіцкім раёне 3,9 мільёна рублёў. З іх 2,3 мільёна рублёў выдзеляць на рамонт дарог, 1,1 мільёна рублёў на іх утрыманне (ямачны рамонт, падсыпка, грэйдзіраванне), а 422,3 тысячы рублёў на ўтрыманне і рамонт вуліц у сельскіх населеных пунктах.

Працягласць сеткі мясцовых аўтамабільных дарог у Баранавіцкім раёне складае 675 кіламетраў, з іх 449 кіламетраў — асфальтабетонныя.

Плануецца заасфальтаваць гравійны ўчастак дарогі ў 0,5 кіламетра па вёсцы Альсевічы і пад'езд да вёскі Гінцавічы працягласцю ў адзін кіламетр. Новае пакрыццё пакладуць на шасці ўчастках асфальтабетонных дарог агульнай працягласцю 13,7 кіламетра. Акрамя гэтага, абновяць дзве дарогі з гравійным пакрыццём, якія злучаюць аграгарадок Арабаўшчына з вёскай Станкевічы, а таксама паміж населенымі пунктамі Лясная, Гута і Уцёс. Дадаткова ў 2019 годзе плануецца пакласці асфальт на ўчастках вуліц Садовая і Сонечная ў вёсцы Русіно.

## У Мінску створаць «цёплую» дарогу

Дарожнае пакрыццё з падагрэвам на плошчы Перамогі плануюць зрабіць мінскія дарожнікі. Пра гэта паведаміў **дырэктар «Гаррамаўтадара» Мінгарвыканкама Дзяніс ГЛІНСКІ.**

Да 75-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне (да 9 мая 2020 года) аднайменную плошчу чакае сур'ёзны рамонт. Сярод планаў дарожнікаў — зрабіць на плошчы падагрэў дарожнага пакрыцця. Як менавіта будзе ажыццёўлены гэты праект, дырэктар «Гаррамаўтадара» пакуль не змог адказаць, толькі дадаў, што ў найбліжэйшы час праекціроўшчыкі зоймуцца распрацоўкай пытання, «можа быць, падагрэў ад Вечнага агню неяк прыдумаюць». Сёлета спецыялісты павінны прыступіць да распрацоўкі праекта, а ў наступным годзе пачнецца яго рэалізацыя.

## Дакрычацца да «нябёсаў»

Аўтамабілісты збіраюць подпісы супраць пасыпання дарог шчэбенем у якасці рамонту. Яны просяць спыніць пасыпаць дарогі друзам замест іх паўнавартаснага рамонту ў петыцыі, якая нядаўна з'явілася ў сецІве. У тых, хто падпісаўся, ёсць свае аргументы. Пасыпанне шчэбенем вядзе да пашкоджання транспартных сродкаў, бо камяні нават пры невялікай хуткасці руху транспартнага сродку рыкашэцяць, псуюць кузаў з-за сколаў, увагнутасцяў, драпін на фарбе, таксама трапляюць у лабавое шкло, што прыводзіць да расколін і неабходнасці іх замены.

«Таксама немалаважным лічым, што камяні, якія вылятаюць з-пад колаў, трапляюць на абочыну і могуць траўмаваць там пешаходаў і веласіпедыстаў, — гаворыцца ў звароце. — На гэтыя дзеянні па «рамонце дарог» вылучаюцца немалыя сродкі, у тым ліку і з дарожнага збору, які выплачваюць усе ўладальнікі транспартных сродкаў, пры гэтым паляпшэння якасці дарожнага пакрыцця не адбываецца».

## А як у іх?

Цікавы вопыт фінаў. У іх няма ямачнага рамонту. Яны не латаюць участкі, а перакладаюць асфальт цалкам. І яшчэ адзін моцны бок — пашпартызацыя дарог. У Фінляндыі дакладна ведаюць, якая канструкцыя той ці іншай дарожнай «вопраткі», яе пругкасць і трываласць. Уся гэтая інфармацыя захоўваецца ў дзяржаўнай камп'ютарнай базе. Спецыялісты, якія складаюць планы работ, могуць у гэтай базе даведацца, калі быў пабудаваны дарожны ўчастак, у якім годзе ён апошні раз рамантаваўся і які яго знос. Нам бы таксама такі сур'ёзны падыход не перашкодзіў бы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА

# Як дзірка ў мосце

## Жыхары вёскі Коладна даўно чакаюць рамонту дарогі

Коладна хоць і знаходзіцца за сорак кіламетраў ад Брэста, але ўсе выгоды цывілізацыі неяк яшчэ з савецкіх часоў вёску паступова абыходзяць. Напрыклад, для мяне было здзіўленнем, што ў населеным пункце ніколі не было праваднога радыё. А цяпер вось няма інтэрнэту. «І не будзе» — катэгарычна сказалі ў раённым тэлекаме, нібы гэта сяло ў нечым правінілася перад нацыянальным аператарам электрасувязі... Сюды не ходзіць ніякі транспарт нават раз на тыдзень. Ад бліжэйшага прыпынку на шашы — тры кіламетры. Праўда, ёсць крама, якую шмат разоў спрабавалі закрыць, але пакуль што старшыня сельскага Савета адстаяў. З гэтым усім жыхары, большасць з якіх пенсіянеры, змірыліся. А вось з дарогай, з дзіркамі ў мосце мірыцца не хочуць.

Ад дарогі Высокае — Воўчын да Коладна вядзе не гравійка, не асфальтавая, а ў нечым асаблівая нітка дарогі, якую тутэйшыя жыхары завуць «армянскі асфальт». Нібыта некалі, гадоў 30—40 таму, брыгада шабашнікаў з былой савецкай рэспублікі паклала крыху падобнае на асфальт пакрыццё, якое ўжо даўно сябе вычарпала. Яміны ў дарозе час ад часу падсыпаюць, і яна сяк-так служыць. А вось мост — агульная бяда. Яго таксама часам падлатваюць работнікі ДРБУ-137, а потым зноў разбіваюць машыны. Зразумела, грузавыя машыны, трактары ходзяць пастаянна. Да магазіна некалькі разоў на тыдзень ідзе аўтамабіль з прадуктамі, па графіку заходзіць смеццявоз, дадайце прыватны транспарт. Адным словам, мост цераз Пульву не прастойвае. А вось рамантаваць яго не спяшаюцца.

— Пра нас, мусіць, даўно забыліся, — гаворыць жыхарка вёскі Лідзія Асіпук. — Хоць не так нас і мала тут: пастаянна пражывае 60 чалавек, летам, калі прыязджаюць дзеці, унукі, падцягваюцца дачнікі, насельніцтва, лічы, падвойваецца.

— Калі шэсць гадоў таму набывала тут дом, было спадзяванне, што нешта палепшыцца ў інфраструктуры, побач жа абласны цэнтр, — дадае дачніца Наталля Ліпская. — Але за гэты час нічога не памянялася, хіба толькі дзіркі ў мосце сталі большыя.

Анастасія Бас да пенсіі адпрацавала калгасным жывёлаводам. Цяпер трымае ўласную гаспадарку, жыве з сям'ёй сына. На лета да бабулі часта прыязджаюць і гарадскія ўнукі. Анастасія Уладзіміраўна спадзяецца, што дарога ў іх усё ж будзе лепшая: «Ва ўсіх жа свае машыны, шкада, псуюцца яна па гэтай дарозе».

**Старшыня Агародніцкага сельскага Савета Барыс ДАНІЛЮК** гаворыць, што пастаянна трымае пытанне на кантролі, перыядычна звязваецца з майстрам ДРБУ-137, які адказвае за гэты ўчастак.

— Абяцаюць, чакаем. Варта сказаць, што апошнім часам шмат зроблена па паляпшэнні дарог на тэрыторыі сельсавета, — працягвае Барыс Аляксандравіч. — З напрамку Плянты да Агароднікаў вядзецца рамонт, у самых Агародніках прыведзены ў парадак многія ўчасткі, у нас працуе ДЭУ-21. І каля суседняга Воўчына вядзецца рамонт дарогі. Людзі з Коладна бачаць гэта і адчуваюць сябе пакрыўджанымі, што да іх чарга не даходзіць.

**Начальнік Высокаўскага ДРБУ-137 КУП «Брэстаблдарбуд» Юрый МУРАЎСКІ** сказаў карэспандэнту «МС» (26 чэрвеня. — **Аўт.**), што згаданы ўчастак дарогі разам з мостам не ўваходзіць у праграму развіцця мясцовых дарог на бягучы перыяд. Паводле слоў Юрыя Уладзіміравіча, хутка будзе вярстацца падобная праграма на будучую пяцігодку, можа, тады дарога будзе ўключана. А пакуль кіраўнік дарожнай арганізацыі паабяцаў у найбліжэйшы час ямы на мосце падсыпаць. Будзем спадзявацца, бо людзі чакаюць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*

***P.S.*** *Калі матэрыял быў гатовы да друку, з вёскі паведамілі, што дарожнікі прыступілі да падсыпкі ўчастка дарогі на мосце. Значыць, дачакаліся?*



ТЭХНАЛОГІІ

# ТРАСА Ў ЛІЧБАВЫМ ФАРМАЦЕ

## У аўтамагістралі М6 Гродна — Мінск з'явілася першая ў Беларусі мабільная турыстычная праграма

**Траса М6 цалкам адкрыта пасля рэканструкцыі. Тут дзейнічае чатырохпалосны рух, і, як аказалася, прывабная не толькі сама траса, але і яе наваколле. Сарыентавацца ў гэтым асяроддзі часткова дапамогуць інфармацыйныя знакі — турыстычныя, сэрвісныя, гасцінічныя... На магістралі іх налічваецца больш за 50. Але час патрабуе больш істотнага падыходу. І вось напрыканцы рамонту дарогі ўзнікла ідэя стварыць інфармацыйную платформу, якая б дапамагала ўсім інтэрнэт-карыстальнікам. Так на свет з'явілася мабільная праграма М6.**




Фота Мікалая ЛАПІНА.

Праект падрыхтаваны беларускімі праграмістамі да II Еўрапейскіх гульняў. Але гэта толькі пачатак укаранення новай мабільнай сістэмы. Галоўная задача — дапамагчы турыстам арыентавацца на трасе М6. Праграма якраз і дапамога ўбачыць найбліжэйшыя аб'екты, якія цікавяць кожнага падарожніка і неабходны яму.

Дырэктар IT-кампаніі Фёдар Громак адзначыў, што турыстычны «Аўтагід па дарогах Гродзенскай вобласці» даступны для карыстальнікаў Android і iOS у праграмах Google Play і AppStore з усіх пунктаў свету. Спампаваць гэты прадукт можна аўтаматычна па QR-кодзе ці ўручную, набраўшы ў пошукавіку «M6 Grodno».

— Усё робіцца для зручнасці турыстаў. Мы разлічваем, што з развіццем мабільнай праграмы турыстаў у рэгіёне стане яшчэ больш, — падкрэсліў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар ЛІСКОВІЧ.** — Гэта, у сваю чаргу, дае імпульс для развіцця інфраструктуры. Спадзёмся, што ў хуткім часе ўся Гродзенская вобласць стане для групавых турыстаў бязвізавай. Стварэнне мабільнай праграмы — магчымасць яшчэ раз прадэманстраваць гасцям турыстычны патэнцыял і спрасціць іх вандраванне па рэгіёне.

Як дзейнічае сістэма? Пасля таго як праграма ўсталявана, карыстальнік трапляе на галоўную старонку, дзе бачыць карту Гродзенскай вобласці, на якую выводзіцца стан надвор'я ў адпаведнасці з яго геалакацыяй. У меню прадстаўлены каталог аб'ектаў — аўтазапраўкі, гасцініцы, банкаматы, аб'екты харчавання і іншыя. Яны разбітыя па катэгорыях, усяго іх больш за 200, але сістэматызацыя дазваляе ўсё хутка знайсці. Да таго ж яны адфільтраваныя, згодна з месцам знаходжання абанента. Пры выбары аб'екта можна ўбачыць фотаздымак, кароткую інфармацыю, рэйтынг. Яшчэ адзін важны пункт — зваротная сувязь, дзе карыстальнік можа пакінуць свой водгук аб тым, дзе пабываў. У будучым уваход можна здзейсніць праз сацыяльныя сеткі. Таксама карыстальнік зможа сам прапанаваць дабавіць аб'ект, якога няма ў спісе.

Цяпер праграма распрацавана для дзвюх моў — рускай і беларускай. Але ў рэгіён едзе большасць турыстаў-суседзяў — з Літвы і Польшчы. Таму неабходна пашырыць моўны кантэнт. Па словах распрацоўшчыкаў, гэтыя моманты будуць улічаны. Было адзначана, што праграма стане добрым арыенцірам для перавозчыкаў і павысіць якасць абслугоўвання пасажыраў.

У будучым усе аўтадарогі Гродзенскай вобласці будуць уключаны ў гэты электронны прадукт. Аналагічны аўтагід рыхтуецца ў магістратуры ГрДзУ для зручнай вандроўкі па Аўгустоўскім канале.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# УСЕ ДАРОГІ ВАЖНЫЯ

У Віцебскай вобласці працягласць мясцовых аўтадарог — больш за 15 тысяч кіламетраў

**З іх 78,3 % — з цвёрдым пакрыццём (даўжынёй — каля 11,7 тысячы км). Адпаведна астатнія — грунтавыя дарогі. І ўсе яны на балансе КУП «Віцебскаблдарбуд».**

Для параўнання, працягласць рэспубліканскіх аўтамабільных дарог — каля трох тысяч кіламетраў. За іх адказвае РУП «Віцебскаўтадар».

Між іншым, на аўтадарогах знаходзіцца 1229 маставых збудаванняў працягласцю 33,8 тысячы пагонных метраў і шэраг іншых прыстасаванняў і збудаванняў. Згодна з дзяржпраграмай па развіцці і ўтрыманні аўтамабільных дарог на 2017—2020 гады, зацверджанай пастановай Савета Міністраў ад 18 верасня 2017 года № 699, вызначаны ўчасткі мясцовых дарог для правядзення першачарговых рамонтных работ.

Паводле інфармацыі аблвыканкама, плануецца адрамантаваць і рэканструяваць не менш за 879,8 км. У тым ліку капітальна — 16 км. Плюс — каля дваццаці пагонных метраў мастоў.

Да наступнага года плануецца завяршыць рамонт аўтадарог вобласці, якія забяспечваюць пад'езды ад раённых цэнтраў да аграгарадкоў.

**Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** пастаянна нагадвае калегам з рэгіёнаў, што і дарогі павінны быць у цэнтры ўвагі. Гэта — адна з задач дзейнасці мясцовай прадстаўнічай улады. І нельга самаўхіляцца ў гэтым пытанні, перакладваючы адказнасць на выканкамы. Па дарогах у далёкія вёскі прыязджаюць аўталаўкі, бытоўкі на колах, «хуткая», пажарныя аўто і гэтак далей. Такім чынам, гэтыя «артэрыі» спрыяюць у падтрыманні сацыяльных стандартаў.

Цікава, як бачыцца дарожнае пытанне ў глыбінцы? Уладзімір Цярэнцьеў лічыць, што Дубровенскі раён — добры прыклад таго, як трэба развівацца. У прыватнасці, пасля «Дажынак», якія прайшлі тут два гады таму, многае робіцца для добраўпарадкавання, стварэння добрых умоў для тутэйшых жыхароў.

**Старшыня Дубровенскага райсавета дэпутатаў Алена ЦІХАНАВА** канстатавала, што працягласць трасы М1 на тэрыторыі раёна каля 29 км. Стараюцца на добрым узроўні падтрымліваць стан іншых дарог. Напрыклад, ёсць так званая старая Смаленская дарога — былы Кацярынінскі тракт. Яе працягласць у раёне прыкладна 30 км.

Старшыня адзначыла, што кіраўнік мясцовай дарожнай арганізацыі — ДРБУ № 108, філіяла КУП «Віцебскаблдарбуд» Уладзімір Чантарыцкі — дэпутат райсавета. Таму адчувае двайную адказнасць, каб раён быў прэзентабельны і ўтульны для пражывання.

Шмат увагі Дубровеншчыне ўдзяляе і кіраўнік РУП «Віцебскаўтадар» Уладзімір Мацвееў.

Мясцовыя дарогі, між іншым, абслугоўвае і камунальнае ўнітарнае прадпрыемства, якое два гады таму стварылі пры Малабахаўскім сельсавеце. Сярод тэхнікі КУП ёсць два трактары, навесы для расчысткі снегу. Могуць падчысціць дарогу, падсыпаць, абкасіць вуліцы населеных пунктаў і гэтак далей. Дапамагаюць добраўпарадкоўваць і падтрымліваць дарогі ў добрым стане і на тэрыторыі іншых сельсаветаў.

Праблема недастатковай аператыўнасці ў навядзенні парадку на дарогах і каля іх і каардынацыі дзеянняў палягае ў тым, што вуліцы ў глыбінцы знаходзяцца на балансе розных арганізацый. За цэнтральныя адказвае ДРБУ (фінансаванне з абласнога бюджэту), а за суседнія, паміж дварамі, — ЖКГ (за кошт грошай сельсаветаў). Гэта праблема, якая быццам бы і не вельмі грунтоўная, але часам мясцовым жыхарам не зусім зразумела: чаму адну вуліцу прыбралі, падсыпалі, вычысцілі там снег, а побач — не спяшаюцца.

У раёне, як падкрэслівае старшыня, аўралу ў дарожным пытанні няма. Праблемы вырашаюцца планава і мэтанакіравана.

Галоўнае, на што не раз звяртаў увагу Прэзідэнт, зрабіць усе дарогі ў краіне, якая знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, годнымі ў сэнсе якасці, бяспекі і прыдарожнага сэрвісу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

ПРАБЛЕМА

# МАШЫНЫ СТАНОВЯЦЦА БОЛЬШ НАХАБНЫЯ

## Магіляўчане просяць не рабіць з вуліцы Боткіна паркоўку



Адзін з варыянтаў вырашэння праблемы — «карусельная» паркоўка.

**Гістарычны цэнтр Магілёва — гэта вузкія вуліцы, блізка размешчаныя да дарогі дамы. У гадзіну пік амаль не раз'ехацца. Вуліца Боткіна якраз у ліку такіх. Яна праходзіць паміж гарадской бальніцай хуткай медыцынскай дапамогі і крутым абрывам. Гэтай прасторы ледзь хапіла на двухпалосную дарогу і невялікія тратуары з двух бакоў. Але і без таго гэты вузкі калідор памяншаецца з-за стыхійных стаянак. Гэта перашкаджае руху грамадскага транспарту і стварае небяспеку для грамадзян, звяртае ўвагу старшыня вулічнага камітэта мікразоны Падгорная — Падміколле Аляксандр ПІКУЛЯ. Ён прыйшоў у карпункт «Звязды» па дапамогу.**

Каб зразумець, наколькі востра тут стаіць праблема, дастаткова аднойчы пабываць на гэтым месцы. Частка тратуара выкарыстоўваецца пад паркоўку, днём тут няма амаль ніводнага вольнага месца. Ну а той, каму яго не хапіла, паркуецца як прыйдзецца. Кідае машыну на ўскрайку дарогі і ідзе па сваіх справах. Каб аб'ехаць гэтыя перашкоды, кіроўцам даводзіцца лавіраваць, амаль праціскаючыся паміж машынамі. Тут жа пралягае маршрут аўтобуса № 39. І трэба вялікае майстэрства, каб гэтай вялікай машыне вырашыла. Машыны працягваюць стаяць на праезнай частцы.

— ДАІ дае справаздачы, колькі чалавек аштрафаваныя за паркоўку ў неналежным месцы, але гэта істотна не ўплывае на сітуацыю. Аднойчы мы прыгразілі, што ідзём на прыём да губернатара, і ў той дзень дарога была чыстая. Значыць, на сітуацыю ўсё ж такі можна ўплываць. Было б жаданне, — абураецца суразмоўнік.

Цікава, што знакаў, якія забараняюць паркоўку, на невялікім адрэзку вуліцы болей чым дастаткова, прычым па абодва бакі. Але іх нахабна ігнаруюць. Стаяць нават на аўтобусным прыпынку. З-за недахопу месца ён проста абазначаны таблічкай з раскладам руху. Калі яе не заўважыць, можна нават і не здагадацца, што там прыпынак.

— Вось я ўчора ехаў на аўтобусе ў 15.04, а на месцы прыпынку аўтобуса стаялі чатыры машыны, — канстатуе старшыня вулічкама. — Як яму разгрузіцца? Летась толькі на маёй памяці каля гарбальніцы было чатыры аварыі. І адна з іх меневіта на гэтым прыпынку. Кіроўца аўтобуса зачапіў легкавую машыну, якая стаяла ў яго на дарозе. Віны ў гэтым яго няма, ён стараўся бліжэй пад'ехаць да прыпынку, каб забраць інвалідаў. У выніку пацярпеў і ён, і людзі, бо рэйс не



праехаць нікога не зачапіўшы. Тутэйшыя жыхары кажуць, што аўтобус з-за вялікай колькасці прыпаркаваных машын не заўсёды можа праціснуцца да прыпынку, і бывае, што адчыняе дзверы для пасажыраў ледзь не пасярод вуліцы. Людзям гэта не падабаецца, бо рызыкуюць усе. Ведаючы, які прабіўны ў іх старшыня вулічкама, жыхары перш-наперш ідуць да яго. А ён разам з найбольш актыўнымі прадстаўнікамі мікразоны штурмуе кабінеты адказных чыноўнікаў.

— Упершыню мы разам з прадстаўніком нашага вулічкама Юрыем Дарашэнкам звярнуліся ў гарвыканкам у красавіку мінулага года. Нас прымаў намеснік старшыні, які адказвае за бяспеку пасажырскіх перавозак, — расказвае Аляксандр Пікуля. — Час прайшоў, але ніякіх перамен не адбылося. Тады мы паспрабавалі вырашыць праблему з дэпутатамі — схадзілі на прыём да старшыні аблсавета. Праслухалі, што сітуацыя крытычная. Стаянка ўздоўж дарогі разлічана дзесьці на 35 машын, а дзе паркавацца іншым? Сёлета быў вялікі скандал на праезнай частцы. Аўтобус не ўступіў дарогу мікрааўтобусу, кіроўцы пачалі высвятляць адносіны, да канфлікту далучыліся пасажыры — крыку было шмат.

Пасля таго як сёлета Аляксандр Пікуля з Юрыем Дарашэнкам звярнуліся да губернатара вобласці Леаніда Зайца, на праблемным участку з'явілася яшчэ некалькі дадатковых парковачных месцаў. Але гэта, на погляд актывістаў, справу не адбыўся, трэба было разбірацца з ДТЗ. А знаёмая расказвала, як яе аўто зачапіла люстэркам іншую машыну. Ці ж нармальна гэта, калі людзі павінны так рызыкаваць?

Аляксандр Пікуля лічыць, што ў гэтай сітуацыі трэба быць прынцыповым. Разам са сваім памочнікам распрацавалі цэлы комплекс прапаноў, як палепшыць становішча. На іх погляд, нармалізаваць праезд па вуліцы Боткіна дапаможа стварэнне вялікіх платных і бясплатных парковак. Варыянты канкрэтных месцаў прыкладаюцца. Ёсць прапанова знесці агароджу і пашырыць дарогу за кошт бальнічнай тэрыторыі. Плюс пашырыць аўтастаянку ў раёне плошчы Арджанікідзэ да АЗС «Беларуснафты», якая знаходзіцца непадалёк ад бальніцы. Прапануецца таксама адрамантаваць існуючую аўтастаянку ўздоўж вуліцы Боткіна і абазначыць парковачныя месцы лініямі. А яшчэ дадаць дарожных знакаў аб забароне стаянкі і размясціць пабольш таблічак аб прымусовай эвакуацыі. Актывісты таксама лічаць, што было б справядліва зрабіць стаянку аўтамабіляў супрацоўнікаў бальніцы на яе ж тэрыторыі. Маўляў, так было раней.

— Мы адправілі гэтыя прапановы мясцовым уладам, хай вырашаюць нешта, — кажа Юрый Дарашэнка. — Трэба наводзіць парадак. Нават тое, што няма адпаведнай разметкі, дэзарганізуе — машыны паркуюць хаатычна.

**Начальнік аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Яўген ЖЫЛІНСКІ** згодны з тым, што ўчастак дарогі па вуліцы Боткіна цяжкі. Але ж, на яго погляд, там і так зроблена ўсё, што неабходна для бяспекі: пастаўлены папераджальныя знакі, праведзена жоўтая лінія, якая паказвае, што паркавацца нельга.

— Але людзі парушаюць правілы, — кажа ён. — Перыядычна дарожныя інспектары ажыццяўляюць кантроль на гэтым участку і караюць парушальнікаў. І такі праблемны ўчастак у горадзе не адзіны. Але ж мы не будуем паркоўкі, мы толькі ажыццяўляем кантроль за рухам аўтатранспарту. Са свайго боку мы неаднаразова паведамлялі ў гарвыканкам, што парковачных месцаў у горадзе не хапае. І гэта трэба неяк выпраўляць.

**Галоўны архітэктар Магілёва Уладзімір СКАЧАК** лічыць, што абстаноўку на вуліцы Боткіна з выкарыстаннем нейкага там архітэктурнага рашэння выправіць нельга.

— На жаль, пашырыць прастору немагчыма, — кажа ён. — Вельмі шчыльная забудова.

— На мінулым тыдні мы пабудавалі пяць парковачных месцаў за кошт тых пляцовак, дзе павінны былі быць дрэвы, — паведаміў **генеральны дырэктар Магілёўскага гарадскога ўпраўлення камунальных прадпрыемстваў, дэпутат гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй КІБЛОЎ**. — І гэта ўсё, што мы можам зрабіць у рамках сваіх паўнамоцтваў.

— Праблема гэта сапраўды складаная, — згодны і **старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК**. — Не зробіш жа там пастаянны пост ДАІ. Але трэба неяк выходзіць з гэтай сітуацыі. Або штрафаваць пастаянна, каб людзі разумелі. Праблема перш за ўсё ў тым, што грамадзяне парушаюць правілы дарожнага руху і паркуюць свае аўто там, дзе ім падабаецца. У кожным горадзе ёсць падобныя складанасці. Часта яны выкліканыя тымі архітэктурнымі асаблівасцямі, якія там існуюць. Раней столькі транспарту не было і ўсё функцыянавала як трэба. Для людзей няма праблемы дабрацца да бальніцы на грамадскім транспарце або паставіць аўто дзесьці крыху далей і прайсціся. Але некаторыя кіроўцы не думаюць пра іншых. Ім важна толькі, каб машына стаяла ледзь не каля дзвярэй. Гарвыканкаму трэба шукаць шляхі вырашэння падобных пытанняў. Магчыма, перанакіраваць транспартныя патокі і гэтак разгрузіць вуліцы.

Дарэчы, адзін з варыянтаў вырашэння праблемы — гэта «карусельная» паркоўка або, як яна правільна называецца, — аўтамабільная аўтаматычная паркоўка. Такія сёння з поспехам робіць «Магілёўліфтмаш». І ў іншых буйных гарадах на іх ужо ёсць попыт. Летась такую паркоўку набыў Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт. Там існавала аналагічная праблема.

— Можам паставіць паркоўку нават у жылым двары, было б жаданне, — запэўнілі на прадпрыемстве. — На пляцоўцы для дзвюх машын вертыкальная размяшчаюцца ўсе 12. На сённяшні дзень гэта самы просты і бюджэтны варыянт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота аўтара і з архіва прадпрыемства «Магілёўліфтмаш».**

СВАЯ СПРАВА

# ГРОШЫ НА ІДЭІ

## Як развіваецца сельскі бізнес на Нарачанскай зямлі, высвятляла карэспандэнт «МС»

**У вёсцы Камарова ўжо каля двух гадоў існуе бізнес-інкубатар. Ён дапамагае жыхарам Астравецкага, Мядзельскага, Пастаўскага і Смаргонскага раёнаў атрымаць веды і фінансавую падтрымку для адкрыцця ўласнай справы. У 2017—2018 гадах для рэалізацыі гэтай задачы працавала «Школа сельскага бізнесу», навучанне ў якой прайшло больш за 60 чалавек. Самыя цікавыя і важныя ініцыятывы атрымалі гранты на суму ад 2 да 10 тысяч еўра ад еўрапейскіх партнёраў. Падчас прэс-тура журналісты даведаліся, якім чынам вядуць бізнес удзельнікі праекта з Мядзельшчыны.**

### Дом, які пабудаваў «Нарс»

Падарожжа па маляўнічым Нарачанскім краі пачалося з райцэнтра — Мядзела. У прамысловай зоне горада размясціўся адзін з вытворчых аб'ектаў будаўнічай кампаніі «Нарс» **Дзмітрыя СТРАЛЬЦА**. Прадпрыемства, дзе працуюць 35 чалавек, па сваёй кваліфікацыі можа будаваць жылыя дамы да чатырох паверхаў пад ключ. Дзмітрый сустракае гасцей і паказвае адну са «славутасцяў» сваёй фірмы — бетонны міні-завод, які набыў за грантавыя грошы.

«Ён на выгляд здаецца невялікі, але гэта вельмі сучаснае абсталяванне. Яго магутнасць і прадукцыйнасць — 15 кубоў у гадзіну. Пры такіх памерах — гэта вельмі шмат», — апісвае канструкцыю прадпрымальнік.

«У краіне ёсць прадпрыемствы, якія выкарыстоўваюць такое абсталяванне», — адказвае дырэктар на пытанне пра канкурэнтаў, але іх ён не баіцца: — Гэта вельмі лакальная рэч — бетон не павязеш за 100 кіламетраў. А ў суседніх раёнах аналагаў няма».

Ды і працэс экалагічны. «Пры вытворчасці ў грушавідным змешвальніку адбываецца выкід і развейванне цэменту па тэрыторыі. У нашым выпадку ўсё герметычна закрываецца і толькі тады размешваецца», — тлумачыць кіраўнік будаўнічай кампаніі.

Летась, па словах гаспадара, фірма выканала праектаў на два мільёны долараў. «Нарс» рыхтавала горад да абласных «Дажынак» — рэканструявала Дом культуры, фасад Дома быту і іншыя будынкі не толькі свайго раёна.

Новы бетонны вузел дапамажа кампаніі пашырыць кірункі дзейнасці і займацца маналітным домабудаўніцтвам. «Гэта перспектыўная галіна сёння ўжо працуе ў Мінску, абласных цэнтрах, але да рэгіёнаў яшчэ не дайшла. Хочам прасунуць і ў Нарачанскім рэгіёне маналітнае домабудаўніцтва», — кажа Дзмітрый Стралец.

Аб'ектаў у родным Мядзеле для кампаніі няшмат, таму фірма працуе ў суседніх Астравецкім, Пастаўскім раёнах, плануе прасунуць свае паслугі на Смаргоншчыну і Браслаўшчыну. Сёння работнікі «Нарса» рыхтуюць да юбілею знакаміты дзіцячы цэнтр «Зубраня», добраўпарадкоўваюць катэджны пасёлак Васёлкавы.

Па словах Дзмітрыя Стральца, на фірме ў яго працуюць муляры, тынкоўшчыкі, цесляры, маляры, плітачнікі, бетоншчыкі — самыя лепшыя ў раёне.

### Не толькі каштоўны мех...

Далей рухаемся ў вёску Рудашаны. Яна за 25 кіламетраў ад горада. Дарога да яе часткова вядзе ўздоўж берага маляўнічай Нарачы. У Рудашанах знаходзіцца фермерская гаспадарка яшчэ аднаго вясковага бізнесмена **Аляксандра ГАТОЎКІ**.

Некалькі гадоў ён вырошчвае трусоў. Для пашырэння гаспадаркі Аляксандр набыў лінію для вытворчасці ўласнага камбікорму. Абсталяванне выраблена на беларускім прадпрыемстве па спецзаказе.

«А ствараць свой корм насамрэч выгадней, чым купляць?» — цікавіліся ў гаспадара.

Аляксандр кажа, што цяжка знайсці корм выдатнай якасці, а тут ён сам можа кантраляваць яго састаў.

«Калі браць зерне, то гэты гранулятар на матрыцы «шасцёрцы» дзесьці 220—250 кілаграмаў вырабляе. Калі браць складана гранулюемую сыравіну (напрыклад, сянную муку, вотруб'е), — гэта 140—150 кілаграмаў у гадзіну, — расказвае аб прадукцыйнасці абсталявання прадпрымальнік. — У сярэднім спажыванне трусамі корму ў раёне 100—150 грамаў на аднаго ў суткі. Адзін дзень раблю корм, тыдзень кармлю».

Сваю жывёлагадоўчую прадукцыю Аляксандр Гатоўка плануе прадаваць праз магазіны здаровага харчавання, рэстараны і індывідуальным пакупнікам.

### І дырэктар, і рабочы

Наступны пункт падарожжа — станцыя тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў у вёсцы Камарова. Гэта СТА адзіная на чатыры раёны. Заснавалі яе аўтаслесар па адукацыі **Яўген ЛАКУЦІЕЎСКІ**. Яго кампаньён і галоўны памочнік — **Яўген ЯРМАКОВІЧ**.



«Калі ляжаць на канапе, нічога не атрымаецца. Трэба працаваць».

Сваю справу хлопцы зладзілі са снежня. Раней адзін працаваў кіроўцам, а другі быў дзяржаўным служачым.

«Звычайна СТА размяшчаюцца ў гарадах, на буйных аўтатрасах...» — разважаюць карэспандэнты.

«А ў нас так і ёсць. Блізка аўтатраса міжнароднага значэння — Вільнюс — Полацк», — запэўніваюць прадпрымальнікі, ды і найбліжэйшыя аўтамайстэрні за 30—50 кіламетраў — у Смаргоні, Нарачы.

У пацвярджэнне іх слоў — амаль поўнасцю загружаны аўтамабілямі рамонтны павільён. Працуюць майстры па 12 гадзін у суткі, і нават у выхадныя — на рабоце. А пакуль яны размаўляюць з журналістамі, на СТА прыехаў яшчэ адзін кліент. Выконваюць спецыялісты амаль усе работы. Цяпер робяць яму для развалу-сыходжання і рыхтуюць абсталяванне для фарбавання машын.

«Сёння на этапе станаўлення ўсё ў адной асобе: і дырэктар, і падначалены. І дакументамі займаемся, і круцім гайкі, і самі дзяўбём яму. Наняць людзей магчыма, але... Гэта праблема многіх бізнесаў: людзі думаюць, што адразу ўсё пойдзе, набіраюць шмат работнікаў, а прыбытку няма і заробкі няма чым плаціць», — тлумачыць Яўген Ярмаковіч.

Майстры задумваюцца і аб дадатковых рабочых: некаторыя памочнікі ўжо прыходзяць час ад часу, яшчэ шукаюць спецыяліста па кузаўных работах.

Памяшканне прыкладна ў 450 «квадратаў» (яно належыць Вілейскаму каледжу) для СТА ўзялі ў арэнду, зрабілі неабходны рамонт. У месяц плацяць каля 147 рублёў.

Па словах прадпрымальнікаў, у іх ідэю са знаёмых амаль ніхто не верыў: «А мы хочам паказаць людзям, што можна самастойна нешта значнае зрабіць. Калі ляжаць на канапе, нічога не атрымаецца. Трэба працаваць».

Пра будучыя прыбыткі аўтамайстры кажуць таксама стрымана.

«Трэба карову спачатку накарміць, а потым даіць. Мы зараз яе «кормім», — жартуе Яўген Лакуціеўскі.

«А калі будзеце «даіць»?» — удакладняюць журналісты.

«Думаю, гадоў праз пяць», — адказвае заснавальнік.

«Жэня, безумоўна, гэта будзе раней», — падбадзёрвае яго больш аптымістычны партнёр па бізнесе.

### Усе на кірмаш!

Кірмаш «Кола дзён», куды мы таксама завіталі, — своеасаблівы брэнд не толькі Камарова, але і ўсяго раёна. У парку каля былой сядзібы графа Старжынскага размясцілася больш за 200 рамеснікаў з усёй краіны. Свята задумвалася як забава для турыстаў, якія прыязджаюць адпачываць у Нарачанскі край.

«У сельскай мясцовасці цяжка стварыць прадукцыю на экспарт, таму мы робім па-іншаму. Мы прыцягваем сюды грошы, каб турысты прыехалі і купілі на месцы, — расказвае **дырэктар бізнес-інкубатара «БІКамарова» Эдуард ВАЙЦЯХОВІЧ**. — Арганізуючы свята Мядзельскі райвыканкам, наш бізнес-інкубатар, Цэнтр развіцця прадпрымальніцтва».

У Камарове займаюцца стварэннем свайго крафтавага прадукта. Ужо славіцца на ўвесь раён хлеб з мясцовай пякарні, існуе і свая півеварня. На рэгістрацыі праект па стварэнні сыраварні.

На кірмашы пазнаёміліся яшчэ з адным грантаатрымальнікам — Юрыем Абрамовічам. Выдаткаваныя па праекце грошы пайшлі на перасоўчы кіёск, абсталяванне для гатавання і продажу бліноў. Асноўнае месца размяшчэння кіёска — курортны пасёлак Нарач.

«Калі на Нарач людзі прыязджаюць, ёсць праблема хутка і якасна паесці. І дзякуючы гранту мая ідэя вырашыць гэту праблему ажыццявілася», — сцвярджае прадпрымальнік.

Жыццё ў сталіцы ён памяняў на аграсядзібны і «блінны» бізнес на Нарачы, і, па словах мужчыны, назад у Мінск яго не цягне.

**Марыя ДАДАЛКА,**
*Мядзельскі раён.*
**Фота аўтара.**

**КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ**

«Нам удалося дапамагчы са стварэннем 24 мясцовых ініцыятыў на тэрыторыі чатырох раёнаў — Мядзельскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага. Гэта абсалютна розныя ініцыятывы, якія працуюць у сельскай гаспадарцы (як правіла, экалагічна чыстая сельскагаспадарчая вытворчасць), вытворчасць экалагічна чыстых драўляных вокнаў, станцыя па тэхнічным абслугоўванні і рамонце аўтамабіляў, будаўнічая арганізацыя, маленькія фірмы, якія займаюцца рукадзеллем, вышыўкай, харчэўні і бізнесы ў сферы аграэкатурызму, — расказвае дырэктар бізнес-інкубатара «БІКамарова» Эдуард Вайцяховіч. — Мы з мясцовымі ініцыятывамі працуем, наведваем іх, таму што людзям заўсёды трэба падказваць. І не толькі вучыць, колькі самім вучыцца ў людзей. Прадпрымальнікі павінны адчуваць плячо. Гэта падтрымка вельмі важная, асабліва калі ты пачынаеш нешта новае».


**РУП «Институт недвижимости и оценки»
(организатор аукциона) извещает о проведении
повторного открытого аукциона по продаже имущества,
принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (продавец),
расположенного по адресу: г. Орша, ул. Сергея Грицевца, 16**

**Лот № 1, состав:** 1. Здание проходной хлебозавода, инв. № 240/С-30357, площадь – 102 кв. м. 2. Здание хлебопекарни, инв. № 240/С-31313, площадь – 1321,9 кв. м. 3. Здание склада хлебозавода, инв. № 240/С-30355, площадь – 241,8 кв. м. 4. Здание мазутонасосной, инв. № 240/С-45934, площадь – 30,8 кв. м. 5. Сооружения в составе инженерных сетей (водопроводная, канализационная, тепловая, электрические сети и ограждения). **Обременение**: аренда части здания хлебопекарни с инв. № 240/С-31313 до 31.03.2019 (площадь – 93,6 кв. м); аренда части здания проходной хлебозавода с инв. № 240/С-30357 до 31.03.2019 (площадь – 102,0 кв. м). **Земельный участок:** кадастровый номер 242400000001005543, площадь – 0,7979 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена – 129 518,40 бел. руб. с НДС. Задаток – 12 951,84 бел. руб.**

**Лот № 2, состав:** 1. Здание административно-бытового корпуса хлебозавода, инв. № 240/С-30346, площадь – 657,1 кв. м. 2. Тепловая сеть и ограждение. **Земельный участок:** кадастровый номер 223650100001015496, площадь 0,1182 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена – 78 504,80 бел. руб. с НДС. Задаток – 7 850,48 бел. руб.**

**Аукцион состоится 22.07.2019 в 11.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.
Шаг аукциона – 5 %**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 22.07.2019 (ОАО «ДОРОРС», Лот №__). Участник, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких лотов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из лотов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 18.07.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.03.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03,
8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»
(организатор аукциона) извещает о проведении
повторного открытого аукциона по продаже имущества,
принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (продавец)**

**Лот № 1:** Здание приемного пункта, инв. № 240/С-45935. Площадь – 49,8 кв. м. Г. п. – 1980. Адрес: г. Орша, ул. Станционная, 1В. **Земельный участок:** кадастровый номер 242400000001010945, площадь – 0,0138 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена – 9 776,80 бел. руб. с НДС. Задаток – 977,68 бел. руб. Шаг аукциона – 500,00 бел. руб.**

**Аукцион состоится 18.07.2019 в 11.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 18.07.2019 (ОАО «ДОРОРС», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 16.07.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03,
8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»
(организатор аукциона) извещает о проведении
повторного открытого аукциона по продаже имущества,
принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (продавец)**

**Лот № 1:** Здание магазина № 5, инв. № 240/С-32270. Площадь – 306,4 кв. м. Г. п. – 1948. Адрес: г. Орша, ул. Деповская, 2. Обременение: аренда части здания (136,6 кв. м) до 30.12.2020. **Земельный участок:** кадастровый номер 242400000003000879, площадь – 0,0496 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена – 33 063,36 бел. руб. с НДС. Задаток – 330,63 бел. руб. Шаг аукциона – 5 000,00 бел. руб.**

**Аукцион состоится 19.07.2019 в 10.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 19.07.2019 (ОАО «ДОРОРС», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 17.07.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03,
8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки»
(организатор аукциона) извещает о проведении
повторного открытого аукциона по продаже имущества,
принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (продавец),
расположенного по адресу: г. Орша, ул. Мира, 71**

**Лот № 1, состав:** 1. Здание магазина № 43, инв. № 240/С-28899. Площадь – 2162,8 кв. м. Г. п. – 1989. 2. Электрические сети, инв. № 240/С-29803.Протяженность 165 м. **Земельный участок:** кадастровый номер 242400000001004376, площадь – 0,1949 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена – 582 228,80 бел. руб. с НДС. Задаток – 5 822,29 бел. руб. Шаг аукциона – 5 000,00 бел. руб.**

**Аукцион состоится 18.07.2019 в 10.00 по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 18.07.2019 (ОАО «ДОРОРС», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 16.07.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.02.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03,
8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 450/С-2307 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административно-бытовое здание), общей площадью 906,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37; капитальное строение, инв. № 450/С-2308 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – Мастерская № 1), общей площадью 1262,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37; капитальное строение, инв. № 450/С-2309 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – Мастерская № 2), общей площадью 1523,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37; капитальное строение, инв. № 450/С-2431 (назначение – здание нежилое, наименование – уборная), общей площадью 3,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37; капитальное строение, инв. № 450/С-29377 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – тепловая сеть), общей площадью 32 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37, тепловая сеть к зданию мастерской № 2; капитальное строение, инв. № 450/С-29375 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), общей площадью 99,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37, канализационная сеть к административному зданию; капитальное строение, инв. № 450/С-29376 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализация ливневая), общей площадью 51,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37, канализация ливневая; капитальное строение, инв. № 450/С-29374 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть), общей площадью 74,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37, водопроводная сеть к административному зданию; капитальное строение, инв. № 450/С-29417 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), общей площадью 14362,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37; капитальное строение, инв. № 450/С-29418 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – доска почета), общей площадью 1 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37; беседка для отдыха; кран-балка ТКТ-1,5; кран-балка ТКТ-1,5; многолетние насаждения (29 шт.)

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 425450100001001097, площадью 2,3826 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений), расположенном по адресу: г. Слоним, ул. Чкалова, 37. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 2,3826

Начальная цена продажи – 2 057 780,40 руб. (два миллиона пятьдесят семь тысяч семьсот восемьдесят рублей сорок копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 205 778 руб. (двести пять тысяч семьсот семьдесят восемь рублей)

Условия проведения аукциона: переход права собственности после полной оплаты цены объекта продажи; передача объектов производится по истечении 120 календарных дней с момента подписания настоящего договора; возмещение победителем аукциона суммы фактических затрат по оценке объектов в размере 2 433,60 р.; возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1,5 % от конечной цены продажи объекта.
Условия расчетов: первоначальный платеж в размере 40 % цены продажи – в течение 10 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи; 30 % цены продажи – в течение 60 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи, 30 % цены продажи – в течение 120 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Продавец – ОАО «Слонимский ремонтный завод», 231800, г. Слоним, ул. Брестская, 48, 8-01562-479-40

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 45-05-38, 41-98-32

Номер р/с для перечисления задатка – Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 29 июля 2019 г. в 12.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 23 июля 2019 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС» (продавец)**

**Лот № 1.** Помещение магазина № 22, инв. № 240/D-37906. Площадь – 231,5 кв. м. Г. п. – 1958. Адрес: г. Орша, ул. Станционная, 1-18. **Земельный участок:** кадастровый номер 242400000001001195, площадь – 0,0793 га. Право постоянного пользования. **Начальная цена – 128 472,00 бел. руб. с НДС. Задаток – 1 284,72 бел. руб. Шаг аукциона – 5 000,00 бел. руб.**

**Аукцион состоится 19.07.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе, условия участия в аукционе, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 19.07.2019 (ОАО «ДОРОРС», Лот № 1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 17.07.2019 в 11.00. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 28.02.2019

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**


# Самабытная спадчына прыцягвае турыстаў

**Бадай кожны населены пункт у Веткаўскім раёне дае падставу для вывучэння культурнай спадчыны. Больш за 30 гадоў акумулюе народную спадчыну Веткаўскі музей стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава. Штогод з яго ўнікальнымі калекцыямі знаёмяцца да васьмі тысяч чалавек, якія прыязджаюць не толькі з Беларусі — з усяго свету.**

Нездарма сюды завіталі і ўдзельнікі Гомельскага абласнога семінара-нарады, прысвечанага ўзаемадзеянню мясцовых органаў улады ў пытаннях захавання культурнай спадчыны і народных традыцый, добраўпарадкавання тэрыторый і навядзення парадку на зямлі.

Пасля чарнобыльскай катастрофы Веткаўскі раён страціў амаль 60 вёсак і разам з імі пэўную частку гістарычнай спадчыны. Але тут захавалі традыцыі, якія на працягу стагоддзяў уласцівыя менавіта згаданаму рэгіёну. Дарэчы, гэта яшчэ адна падстава для развіцця турызму.

Прыцягвае паломнікаў на Веткаўшчыну і ўключаны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі храм Свяціцеля Мікалая Цудатворца ў вёсцы Жалезнікі. Ён быў пабудаваны 155 гадоў таму. У 1930-м царкву закрылі — працяглы час тут знаходзіліся сельскагаспадарчыя склады. У 2006-м, пасля завяршэння капітальнага рамонту, храм зноў адчыніў дзверы.

Бытавыя танцы, народныя абрады, старажытныя іконы і ручнікі... У Ветцы, Свяцілавічах, Стаўбуне і Неглюбцы дэпутаты Гомельскага абласнога, раённых, сельскіх Саветаў пазнаёміліся з цэлым пластом самабытнай культуры і вырашылі, што вопыт па захаванні народных традыцый варты для распаўсюджвання.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ЗАПРАШАЛЬНІК

# ДУДАРСКІ БАТЛ І ТАЯМНІЧЫ КВЭСТ

## «Кушлянскі фэст» запрашае ў музей-сядзібу Францішка Багушэвіча

**Фестываль пройдзе ў суботу, 29 чэрвеня. Як паведамілі арганізатары, у такім фармаце мерапрыемства пройдзе другі раз, яно будзе прысвечана жыццю і творчасці паэта.**




«У кожнага чалавека ёсць мясціна, якая яго ачышчае, выгойвае і мацуе. У першую чаргу гэта месца, дзе чалавек нарадзіўся. Але для ўсіх беларусаў роднымі з'яўляюцца і Кушляны — «нулявы кіламетр» беларускага народа, які знаходзіцца на сумежжы Ашмянскага і Смаргонскага раёнаў. Гэтыя землі далі адпраўную кропку імя, сапраўднага голасу і годнасці беларусаў ды абудзілі родную мову. Нездарма і лозунг «Кушлянскага фэсту — 2019» гучыць менавіта так: «Усім будзе чутна: ад краю да краю!» — паведамілі ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры.

Для гасцей падрыхтавалі вельмі разнастайную праграму: займальна-таямнічы квэст «Як праўду шукаюць», забаўляльныя заняткі для дарослых і дзяцей «Фэсцік: гулянне ў народным стылі», а яшчэ майстар-класы па літаграфіі, беларускіх народных танцах, па вырабе выцінанак і лялек. Гледачоў зацікавяць паказальныя спаборніцтвы дудароў Беларусі «Дударскі батл», выступленні фальклорных калектываў Смаргонскага раёна і музычных гуртоў са сталіцы, а таксама экскурсія па музеі-сядзібе Францішка Багушэвіча ад захавальніка сядзібы спадара Алеся Жамойціна. Будуць працаваць рамесніцкія рады, пляцоўка Паветранага Змея і палявая кухня.

Пачатак фэста а 12-й гадзіне.

# ШЭСЦЕ І БАЙКЕРЫ

## Самы маленькі горад Беларусі запрашае на сваё свята

**У суботу, 29 чэрвеня, пройдуць святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дзісне.**

Гарадок з насельніцтвам каля 1,5 тысячы жыхароў у Мёрскім раёне, што на Віцебшчыне. У дзень горада тут запланаваны шэсце працоўных калектываў у напрамку гарадскога парка, канцэртная праграма, у тым ліку з удзелам ВІА «Начная птушка» і ансамбля «Мужыкі» з Полацка, у гонар свята таксама заспяваюць салісты Маладзёжнага тэатра эстрады са сталіцы.

Акрамя гэтага, гасцей чакаюць паказальна-гульнявая праграма ад мясцовых ратавальнікаў «101 спяшаецца на дапамогу», спартыўнае свята, паказальныя выступы войскаў спецыяльнага прызначэння, байкерскага клуба і фестываль фарбаў холі.

У канцы свята ўсіх чакае салют і дыскатэка.

# МОТАШОУ І СІЛАВЫ ЭКСТРЫМ

**29 чэрвеня Клецк стане цэнтрам прыцягнення ўсіх актыўных і яркіх маладых людзей цэнтральнага рэгіёна. Тут а 16-й гадзіне пачнецца вялікае абласное свята, прымеркаванае да Дня моладзі.**

На адкрытых пляцоўках збяруцца прадстаўнікі маладога пакалення: аматары стрытбола згуляюць у турніры STREETBASKET KLETSK-2019, жыхары і госці горада атрымаюць асалоду ад выступлення кавер-бэнда SUN ROAL-21, самыя маленькія ўдзельнікі свята знойдуць заняткі па інтарэсах у дзіцячым гарадку, а дзеці старэйшага ўзросту пракацяцца з ветрыкам на атракцыёнах.

На спартыўнай пляцоўцы гарадскога парка а 18-й гадзіне распачнуцца спаборніцтвы па сілавым экстрыме STRONGMAN 2019. Непасрэднымі ўдзельнікамі турніру стануць і самі гледачы: эфектная шоу-праграма разлічана на інтэрактыў.

Яркіх фарбаў святу дададуць дыджэй-фэст Night hits, а пасля апоўначы пад гукі сучаснай музыкі можна будзе адпачыць на дыскатэцы «Энергія маладосці».

Зрабіць класныя фотаздымкі можна будзе на тэматычных фотазонах і адразу ж падзяліцца імі з сябрамі ў сацсетках пад хэштэгам #minskregion.


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 27 чэрвеня 2019 года.**